# Грамадзянская супольнасць у Беларусі ў сітуацыі палітычнага крызісу: стан і выклікі

## Справаздача па выніках даследавання

2021

ЗМЕСТ

КАНТЭКСТ, МЭТА І ЭТАПЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ..... 4

1. ЗМЕНА ЎМОЎ ДЗЕЙНАСЦІ, СТАН І АКТУАЛЬНЫЯ ПАТРЭБЫ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ (АГС) ..... 8

3. НЕДЗЯРЖАЎНЫЯ МЕДЫЯ Ў БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ ..... 51

4. РОЛЯ І МЕСЦА БІЗНЕСУ Ў ГРАМАДСКІХ ТРАНСФАРМАЦЫЯХ 2020—2021 ГГ. ..... 61

5. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА: ЯЕ РОЛЯ І ПАТРЭБЫ Ў ПАДТРЫМЦЫ БЕЛАРУСІ ..... 68

АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ ..... 75

## Рэзюмэ

*У працы прааналізаваны стан арганізаванай грамадзянскай супольнасці і новых ініцыятыў, якія ўзніклі ў Беларусі ў перыяд палітычнага крызісу, што пачаўся ў сувязі з прэзідэнцкімі выбарамі 2020 года. Палявое даследаванне для гэтай працы праводзілася з пачатку да чэрвеня 2021 года і, такім чынам, не ахоплівае перыяду, звязанага з інстытуцыянальнымі рэпрэсіямі супраць арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Беларусі (аднак гэтай тэме будзе прысвечаны дадатковы пастфактумны агляд). У дадзеным тэксце прадстаўлена тое, у якім стане знаходзіліся розныя суб'екты грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, з якімі праблемамі ў сваёй дзейнасці яны сутыкаліся, а таксама якая дапамога ім патрэбна. Дадаткова прааналізавана сітуацыя ў беларускіх незалежных медыя, дыяспары і бізнесе. Адзначаны іх патрэбы, актуальныя на момант правядзення даследавання. Тры гэтыя суб'екты разгледжаны асобна, бо іх дзейнасць уяўляецца важнай для разумення працэсаў, што адбываюцца ў беларускім грамадстве. Разам з тым, самім гэтым суб'ектам патрэбна дадатковая падтрымка, з прычыны акалічнасцей, якія склаліся ў Беларусі. У канцы працы прадстаўлены агульныя высновы.*

## КАНТЭКСТ, МЭТА І ЭТАПЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Гэтае даследаванне задумвалася ўзімку 2021 года, калі стала відавочным, што палітычны крызіс які пачаўся ў Беларусі пасля выбараў 2020 года, пераходзіць у зацяжную фазу. **Мэтай даследавання** было прааналізаваць ролю як існых (і сталых) арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС), так і новых грамадскіх ініцыятыў, якія ўзніклі на хвалі пратэсту, ацаніць іх патэнцыял, прааналізаваць асноўныя праблемы, з якімі яны сутыкаюцца, вызначыць іх актуальныя патрэбы і перспектывы развіцця.

За час, што мінуў ад пачатку даследавання, сітуацыя ў грамадзянскай супольнасці сур’ёзна змянілася, а палітычны крызіс у краіне не толькі не вырашыўся, але ўсё больш паглыбляецца. У сувязі з гэтым даследчай групе давялося карэктаваць некаторыя высновы з улікам новай інфармацыі і падзей, якія адбываліся ўжо пасля збору эмпірычных дадзеных.

**Кантэкст.** Асноўны доўгатэрміновы фактар палітычнага крызісу ў Беларусі — гэта рассінхранізацыя і рознаскіраванасць працэсаў развіцця беларускага грамадства і ўсталяванага палітычнага рэжыму. Можна казаць аб развіцці ў грамадстве запыту на сацыяльна-палітычныя трансфармацыі, які быў характэрны як мінімум для апошніх 10 гадоў (пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года) і стаў відавочным у 2020 годзе.

У кароткатэрміновай перспектыве актывізацыя беларускага грамадства і пачатак палітычнага крызісу, відавочнай праявай якога стала грамадска-палітычная мабілізацыя падчас перадвыбарчай кампаніі і масавыя пратэсты жніўня—лістапада 2020 года, можна назіраць з 2019 года. Першым, не такім яркім, этапам стаў працэс «паглыблення інтэграцыі» з Расіяй: новы віток нарастання пагрозы суверэнітэту Беларусі. Другім, больш відавочным, этапам актывізацыі сталі выклікі, звязаныя з распаўсюдам пандэміі COVID-19, і рэакцыя на іх дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў. Не паглыбляючыся ў аналіз гэтых працэсаў, можна адзначыць, што шмат якія з іх, а таксама тыпы дзеянняў, роля і месца розных суб’ектаў былі працягнуты і на трэцім этапе: палітычнай мабілізацыі падчас перадвыбарчай кампаніі і масавых пратэстаў, што пачаліся ўслед за ёй у жніўні 2020 г.

Два гэтыя этапы характарызуюцца шэрагам змен у дзейнасці структур грамадзянскай супольнасці і ў характары іх узаемадзеянняў з іншымі актарамі. Сярод гэтых змен можна вылучыць наступныя:

- Агульнае паглыбленне крызісу даверу да дзяржаўных інстытуцый, разбурэнне «сацыяльнага кантракту»[1], дэлегітымізацыя палітычнага рэжыму;
- Змены ў арганізацыі дзейнасці і функцыянавання АГС і бізнес-кампаній, якія маюць падобны характар і выкліканы рэакцыяй на каронакрызіс (пераход на дыстанцыйныя

[1] Douglas, Nadja. 2020. Belarus: From the Old Social Contract to a New Social Identity. Centre for East European and International Studies (ZOIS). Report published on 9/11/2020 // https://www.zois-berlin.de/publikationen/belarus-from-the-old-social-contract-to-a-new-social-identity.

формы арганізацыі дзейнасці, дыджыталізацыя працэсаў, новыя рынкі і паслугі ў выпадку бізнесу, новыя мэтавыя групы або фарматы дзейнасці АГС)[2];

- Страты ў інстытуцыянальнай і доўгатэрміновай супрацы і ўзаемадзеянні бізнесу і АГС, канвертацыя рэсурсаў (чалавечых і фінансавых) у кароткатэрміновыя кампаніі, звязаныя з вырашэннем актуальных праблем, пашырэнне формаў і колькасці калабарацый;
- Рывок у выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій у вырашэнні сацыяльных праблем;
- Пераразмеркаванне сфер уплыву розных тыпаў медыя ў бок павелічэння ролі незалежных медыя і «новых медыя», падзенне ўзроўню даверу да дзяржаўных медыя[3];
- Вірусны распаўсюд і маштабаванне ініцыятыў, скіраваных на вырашэнне актуальных сацыяльных праблем;
- Паступовая актывізацыя беларускай дыяспары, пераход ад сімвалічнай падтрымкі да дзеянняў living рознага кшталту, актыўнага ўдзелу ў краўдфандынгу і краўдсорсінгу, звязаных з праблемамі каронакрызісу.

Узровень і характар грамадска-палітычнай мабілізацыі падчас перадвыбарчай кампаніі 2020 года шмат у чым вызначаўся гэтымі працэсамі і зменамі.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 года, падчас якіх былі зафіксаваны шматлікія фальсіфікацыі і парушэнні, у Беларусі пачаліся масавыя акцыі пратэсту. У першыя дні пратэстаў па ўсёй Беларусі былі затрыманыя больш за 7000 чалавек, да дэманстрантаў ужываўся непрапарцыйны гвалт і спецыяльныя сродкі, а затрыманых збівалі і катавалі.

Аднак спроба пагасіць грамадскі пратэст праз дэманстрацыю жорсткасці і ўжыванне гвалту мела адваротныя вынікі. Масавыя акцыі пратэсту доўжыліся да сярэдзіны лістапада 2020 года нягледзячы на ўзмацненне палітычных рэпрэсій. Да зімы 2020 года вулічны пратэст быў збольшага задушаны, шмат удзельнікаў пратэснага руху зазналі адміністрацыйны і крымінальны пераслед, а таксама былі змушаны з'ехаць з краіны. За мяжой ці ў зняволенні апынулася большасць значных публічных фігур, заўважных падчас перадвыбарчай кампаніі і ў першыя тыдні вулічных пратэстаў.

Хаця вулічная пратэсная актыўнасць задушаная, стабілізацыі сітуацыі і вырашэння палітычнага крызісу не адбываецца. Улада адмаўляецца ад любых формаў дыялогу з грамадзянскай супольнасцю, працягваючы раскручваць махавік рэпрэсій (на 6 кастрычніка 2021 года ў Беларусі 801 асоб прызнаны палітвязнямі). Узмацняюцца крызісныя тэндэнцыі ў эканоміцы, расце міжнародны і санкцыйны ціск. Даступныя звесткі сацыялагічных

---

[2] Marples, David R. Stalin's Ghosts, Parasites, and Pandemic: The Roots of the 2020 Uprising in Belarus: 2021 Annual London Lecture on Belarusian Studies. *Journal of Belarusian Studies. 2021, Vol. 11, Issue 1, p. 5-26. 22 p.*

[3] Bosse G. et al. (2020). Freedom of Speech and Media Plurality in the Context of the COVID-19 Pandemic // https://eap-csf.eu/wp-content/uploads/Freedom-of-Speech-and-Media-Plurality-Paper-2021.pdf.

апытанняў паказваюць крытычна нізкі ўзровень даверу да ўсіх дзяржаўных інстытутаў і захаванне высокага ўзроўню сацыяльнай напружанасці ў беларускім грамадстве[4].

*Мэтавыя групы і этапы даследавання, метады збору інфармацыі*

Падзеі 2020 года сталі штуршком да колькаснага і якаснага зруху ў стане грамадзянскай супольнасці, што абумоўлівае неабходнасць аналізаваць і браць да ўвагі як стан і праблемы «трэцяга сектара» (арганізаванай грамадзянскай супольнасці, існых «традыцыйных» арганізацый розных тыпаў і сфер дзейнасці), так і масавы ўздым грамадзянскай і грамадскай актыўнасці па-за існымі структурамі. Таму ў фокусе даследавання знаходзяцца пераважна арганізацыі грамадзянскай супольнасці і «новыя суполкі», якія сфармаваліся на хвалі палітычнай мабілізацыі.

Дадатковая задача даследавання — гэта аналіз змены ролі і стану незалежных медыя і бізнесу як важных актараў, якія ўплываюць і на працэс сацыяльна-палітычных трансфармацый увогуле, і на развіццё грамадзянскай супольнасці. Акрамя таго, асобная ўвага нададзена аналізу працэсаў, якія адбываюцца ў беларускай дыяспары, актывізацыя якой у 2020—2021 гадах таксама мае значэнне для разумення сітуацыі і перспектыў развіцця грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. З павелічэннем плыні ўцекачоў з Беларусі роля дыяспары, новых арганізацый і ініцыятыў, створаных у гэты перыяд у розных краінах, асабліва геаграфічна блізкіх (Польшча, Літва і Украіна), якія прымаюць асноўны паток мігрантаў, узрастае.

*Этапы і эмпірычная база даследавання*

1. Распрацоўка праграмы і інструментарыю даследавання: люты 2021 г.
2. Палявы этап (збор эмпірычнай інфармацыі): сакавік—жнівень 2021 г.

- Арганізацыі грамадзянскай супольнасці: 5 паўструктураваных інтэрв'ю ў актывістаў АГС, дзейнасць якіх засяроджана на развіцці трэцяга сектара; анлайн-апытанне АГС (сабрана 62 анкеты); фокус-групавыя інтэрв'ю ў прадстаўнікоў розных тэматычных сектараў АГС (праведзена 8 фокус-груп, агульная колькасць удзельнікаў — 67);
- Актывісты «новых суполак»: 5 паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі АГС і экспертамі, якія маюць досвед працы з «новымі суполкамі»; 30 паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі «новых суполак» («дваровыя» і гарадскія суполкі, страйкамы, незалежныя прафзвязы); анлайн-апытанне актывістаў «новых суполак» (сабрана 663 анкеты);
- Незалежныя медыя: 10 паўструктураваных інтэрв'ю з прадстаўнікамі недзяржаўных медыя: інтэрнэт-медыя, тэлеграм-каналаў, ютуб-каналаў і блогаў;

[4] Коршунаў, Г. Што беларусы думаюць пра пратэсты (па дадзеных пятай хвалі *Chatham House*) // https://newbelarus.vision/shto-belarusy-dumayut-pra-pratesty/.

- Бізнес-сектар: 7 паўструктураваных інтэрв'ю з прадстаўнікамі бізнес-хаўрусаў на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, бізнес-асацыяцый, стартап-хаба, даследчага цэнтра;
- Беларуская дыяспара: 10 паўструктураваных інтэрв'ю з прадстаўнікамі беларускіх арганізацый у трох краінах: Літве, Польшчы і Украіне.

3. Аналіз звестак, падрыхтоўка высноваў і рэкамендацый даследавання: жнівень—лістапад 2021 г.

## 1. ЗМЕНА ЎМОЎ ДЗЕЙНАСЦІ, СТАН І АКТУАЛЬНЫЯ ПАТРЭБЫ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ (АГС)

*У гэтым раздзеле аналізуецца змена ўмоў, характару і інтэнсіўнасці дзейнасці АГС у сітуацыі развіцця палітычнага крызісу ў краіне. На падставе адкрытых крыніц і апытанняў актывістаў АГС разглядаюцца асноўныя праблемы, з якімі сутыкаецца беларускі «трэці сектар», прыярытэтныя накірункі далейшага руху і актуальныя задачы. Аналіз дадзеных даследавання паказвае, што пастаяннае пагаршэнне ўмоў дзейнасці АГС і шматлікія выклікі, з якімі яны сутыкаюцца, прыводзяць шмат якія арганізацыі на мяжу выжывання, і вымагае ад саміх АГС новых формаў арганізацыі дзейнасці, у тым ліку адмовы ад традыцыйных схем узаемадзеяння са стэйкхолдэрамі, змен у спосабах планавання і кіравання, пераасэнсавання свайго месца і ролі ў працэсе сацыяльна-палітычных трансфармацый.*

Пад умовамі развіцця грамадзянскай супольнасці маецца на ўвазе комплекс умоў, які спрыяе яе развіццю (*enabling environment*)[5]. Традыцыйна ў комплекс такіх умоў уключаюцца:

- Палітычныя ўмовы: наяўнасць фактычнай магчымасці рэалізоўваць асноўныя грамадзянскія правы і свабоды, уключанасць грамадзянскай супольнасці ў працэс прыняцця палітычных рашэнняў і кіраўніцкія працэсы;
- Эканамічныя і фінансавыя ўмовы: магчымасці атрымліваць і апераваць фінансавымі сродкамі, фінансавая ўстойлівасць арганізацый, у тым ліку пытанні магчымасці атрымліваць і выкарыстоўваць спонсарскую, дабрачынную, замежную фінансавую дапамогу, сродкі, атрыманыя праз краўдфандынг і краўдсорсінг;
- Прававыя ўмовы: рамачныя прававыя ўмовы і прававыя гарантыі грамадзянскіх правоў і свабод, умовы рэгістрацыі і ліквідацыі арганізацый, умовы аперавання фінансамі, умовы рэалізацыі ключавых напрамкаў дзейнасці;
- Інстытуцыянальныя ўмовы: палітычная культура, давер, стэрэатыпы, матывацыя грамадскай дзейнасці, працэдуры прыняцця рашэнняў, арганізацыя дзейнасці;
- Інфармацыйнае і медыйнае асяроддзе: ўзровень інфарматызацыі і дыджыталізацыі, асноўныя каналы інфармацыйнага спажывання, развіццё розных тыпаў медыя, іх уплывовасць, доступ да іх, развіццё сацыяльных сетак, асаблівасці спажывання медыя.

Умовы дзейнасці грамадзянскай супольнасці ў апошнія месяцы пагаршаюцца настолькі хутка, што даследчыя і ацэнкавыя дадзеныя старэюць хутчэй, чым мы паспяваем іх прааналізаваць.

[5] Абгрунтаванне неабходнасці разгляду менавіта такога комплексу ўмоў развіцця АГС у Беларусі можна знайсці тут: Гражданское общество Беларуси: актуальное состояние и условия развития (2015-2017), с. 5 // https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/DOC/1/2018_Civil-Society-Belarus_RU.pdf.

Відавочна, што адзін з найсур'ёзнейшых выклікаў — гэта змена **палітычных** і прававых умоў. У сітуацыі палітычнага крызісу мы, з аднаго боку, назіралі высокі ўзровень палітычнай мабілізацыі грамадства падчас перадвыбарчай кампаніі і паслявыбарчых пратэстаў. З іншага боку, неабходна адзначыць, што існыя да 2020 года структуры і арганізацыі грамадзянскай супольнасці (гэтаксама як і палітычныя партыі) не адыгралі праактыўнай ролі ў гэтых працэсах, то-бок яны не былі іх ініцыятарамі. Драйверамі палітычнай мабілізацыі сталі зусім іншыя сілы і суб'екты, тым часам як арганізацыі трэцяга сектара хутчэй падтрымлівалі існыя працэсы і ўключаліся ў іх звычайна на ўзроўні індывідуальнага ўдзелу актывістаў, а не інстытуцыйна. Паколькі спроба змяніць існы палітычны рэжым грамадскімі высілкамі не прывяла да хуткіх пазітыўных змен, сёння мы знаходзімся ў сітуацыі рэакцыі. Пратэсныя настроі душацца ўладамі праз рэпрэсіі, у беларускага рэжыму няма ані пазітыўнай праграмы вырашэння палітычнага крызісу, ані метадаў кантролю сітуацыі, акрамя сілавых. Адпаведна, пра рэалізацыю грамадзянскіх правоў і свабод у краіне сёння не можа ісці і гаворкі.

Гаварыць **аб прававых умовах** і прававым асяроддзі сёння складана з дзвюх прычын. Па-першае, шмат асобных негатыўных змен рознага кшталту і маштабу, якія адбыліся за гэты перыяд, вымагаюць асобнага аналізу і не могуць быць сцісла апісаны ў дадзеным тэксце[6]. Па-другое, у сітуацыі прававога дэфолту панятак закону страчвае сваё функцыянальнае значэнне, бо практыка правапрымянення пагоршылася настолькі, што аналіз заканадаўчых змен робіцца практычна бессэнсоўным.

На момант правядзення апытання экспертаў і актывістаў АГС (красавік—травень 2021 года) сур'ёзную занепакоенасць выклікала «анансаваная» ўсеагульная перарэгістрацыя грамадскіх арганізацый. Дагэтуль незразумела, у якой часавай перспектыве гэтая ініцыятыва магла б быць рэалізаваная, бо яна вымагае вялікай падрыхтоўчай працы з боку дзяржаўных органаў. Сёння рэалізуецца «прасцейшая» рэпрэсіўная тактыка: пазапланавыя праверкі грамадскіх арганізацый і ліквідацыя юрыдычных асоб. Апошняя спачатку была кропкавай і датычыла некамерцыйных устаноў, але паступова набыла масавы характар і стала ўжывацца і ў дачыненні да грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый, юрыдычная ліквідацыя якіх складанейшы працэс (у параўнанні з установамі).

Дынаміка інстытуцыянальных рэпрэсій супраць АГС ідзе па нарастальнай. 30 ліпеня 2021 года Лукашэнка заявіў на сустрэчы з актывам мясцовай вертыкалі, што «ў выніку праведзеных мерапрыемстваў выдзелена 185 дэструктыўных структур, якія ўяўляюць сабой патэнцыйную пагрозу нацыянальнай бяспецы, у тым ліку 1 прадстаўніцтва замежнай некамерцыйнай арганізацыі, 71 рэспубліканскае і мясцовае грамадскае аб'яднанне, 113 устаноў»[7]. Узнікала ўражанне, што гэтыя лічбы — «арыенцір» для правядзення інстытуцыянальных рэпрэсій супраць трэцяга сектара, аднак у рэальнасці працэс аказаўся значна маштабнейшым. На 18 верасня 2021 года, паводле інфармацыі *Lawtrend*, 154

[6] Падрабязней з гэтым аспектам можна азнаёміцца ў рэгулярных аглядах цэнтра прававой трансфармацыі *Lawtrend* // http://www.lawtrend.org.
[7] https://www.belta.by/president/view/lukashenko-nko-pod-vidom-blagotvoritelnosti-otrabatyvajut-chuzhoj-politicheskij-zakaz-452930-2021/.

некамерцыйныя ўстановы і 89 грамадскіх арганізацый, асацыяцый і фондаў былі ліквідаваны або знаходзіліся ў працэсе ліквідацыі. Праваабаронччы цэнтр «Вясна» вядзе спіс ліквідаваных АГС, у які на пачатак кастрычніка 2021 года ўваходзіла 275 арганізацый розных тыпаў[8].

Рыторыка і дзеянні беларускіх уладаў сёння скіраваныя на знішчэнне любой незалежнай актыўнасці ў прынцыпе. Таму рэпрэсіі і абмежаванні на новым этапе будуць усё больш закранаць ужо не толькі тых, хто выказвае нязгоду з існай сітуацыяй, але і любую ініцыятыву, якая не сыходзіць і/або цалкам не кантралюецца дзяржаўнымі органамі.

Пагаршэнне **эканамічных умоў** дзейнасці АГС звязана як з істотным абмежаваннем доступу да вонкавых праграм фінансавання (адмова рэгістраваць гранты, узрастанне рызыкі пераследу праз атрыманне фінансавых рэсурсаў звонку ў любой форме), так і са зніжэннем аб'ёмаў фінансавання грамадскай дзейнасці ўнутры краіны (закрыццё краўдфандынгавых платформ; адток узносаў і ахвяраванняў грамадзян спачатку на кампаніі, звязаныя з супрацьдзеяннем COVID-19, затым на дапамогу ахвярам рэпрэсій і іх сем'ям; рост рызык для грамадзян і бізнесу (або звязаных з гэтымі рызыкамі страхаў), якія фінансуюць грамадскія арганізацыі і ініцыятывы).

**Інфармацыйнае і медыйнае асяроддзе** таксама перажываюць істотныя трансфармацыі. Пералічым найважнейшыя аспекты гэтай трансфармацыі: радыкальная палярызацыя дзяржаўных і недзяржаўных медыя і пераход да адкрытай інфармацыйнай вайны; палітызацыя парадку дня медыя; фактычная ліквідацыя ці пераезд за мяжу шэрагу незалежных выданняў; рост рэпрэсій супраць недзяржаўных медыя і журналістаў; павелічэнне ролі сацыяльных сетак і месенджараў (найперш Тэлеграма) у якасці інструмента як распаўсюду інфармацыі, так і ўзаемнай каардынацыі і арганізацыі дзеянняў унутры грамадзянскай супольнасці.

Нарэшце, змена **інстытуцыянальных умоў** мае дваякі характар. З аднаго боку, мабілізацыйны ўздым лета—восені 2020 года прычыніўся да шэрагу пазітыўных змен ва ўзроўні даверу, салідарнасці і актыўнасці грамадзян: адмова ад стэрэатыпнага ўспрымання «палітыкі» і «грамадскай дзейнасці» як «нявартых», «небяспечных» ці маргінальных сфер і заняткаў; выбуховы працэс фармавання пазітыўнага вобразу «сябе» як грамадзянскай нацыі, фармаванне вялікай колькасці новых грамадзянскіх ініцыятыў і лакальных супольнасцяў. Аднак хуткі надыход жорсткай рэакцыі ставіць пад пытанне захаванне і доўгатэрміновасць дадзеных эфектаў.

***Асноўнай эмпірычнай базай для аналізу ў дадзеным блоку даследавання з'яўляюцца***:

1. 5 паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі АГС, дзейнасць якіх накіраваная на развіццё трэцяга сектара (сакавік 2021 г.);

---

[8] Ліквідацыя грамадзянскай супольнасці. Поўны спіс НДА, якія сутыкнуліся з ціскам беларускіх уладаў (spring96.org).

2. анлайн-апытанне АГС (23 красавіка—24 траўня 2021 г., сабрана 62 анкеты);
3. 8 фокус-груп з прадстаўнікамі розных тэматычных сектараў АГС (19 красавіка—12 мая 2021 г., агульная колькасць удзельнікаў — 67).

### 1.1. Дынаміка змен і найактуальнейшыя праблемы АГС

Дадзеныя апытання паказваюць, што з перыяду пачатку пандэміі ў 2020 годзе інтэнсіўнасць дзейнасці АГС паступова зніжалася, а ў найвастрэйшы перыяд палітычнага крызісу (жнівень—лістапад 2020 года) абсалютная большасць арганізацый працавалі або ў аслабленым рэжыме, або ўвогуле практычна прыпынілі сваю актыўнасць. Са снежня 2020 года АГС спрабавалі вярнуцца да свайго асноўнага парадку дня або мадыфікаваць яго пад новыя задачы.

*Дыяграма 1.1. Змена інтэнсіўнасці дзейнасці арганізацый*




Аднак новы віток рэпрэсій, якія пачаўся ў ліпені 2021 года — гэтым разам рэпрэсій інстытуцыянальных, скіраваных ужо не проста супраць актывістаў ці арганізацый, якія нейкім чынам уключыліся ў пратэсныя дзеянні ці актыўна ўзаемадзейнічалі з «новымі суполкамі», а супраць арганізацый трэцяга сектара як такіх — зноў змушае АГС пераладжваць сваю дзейнасць і змяняць прыярытэты.

Адным з асноўных выклікаў для АГС на момант правядзення апытання заставалася немагчымасць доўгатэрміновага планавання ў зменлівых і неспрыяльных умовах. Гэта паказваюць і вынікі апытання, і рэйтынгаванне праблем падчас фокус-груп, дзе праблемы, выкліканыя немагчымасцю доўгатэрміновага планавання, нязменна былі ў тройцы самых актуальных (за выняткам праваабарончага сектара, што тлумачыцца яго ўзрослай

запатрабаванасцю і вялікай колькасцю кароткатэрміновых задач, якія вымагаюць неадкладнага вырашэння).

50 з 62 рэспандэнтаў адзначылі праблему немагчымасці доўгатэрміновага планавання, а яшчэ 38 (больш за палову) — немагчымасць рэалізоўваць планы і праекты праз пастаянную змену сітуацыі. Акрамя таго, 51 рэспандэнт адзначыў, што сцверджанне «Нам давялося адмовіцца ад нашых доўгатэрміновых планаў на няпэўны тэрмін» характэрнае або часткова характэрнае для ягонай/ейнай арганізацыі.

*Табліца 1.1. Праблемы, з якімі сутыкаюцца АГС*

| **З якімі з пералічаных праблем ваша арганізацыя сутыкнулася на працягу восені—зімы 2020—2021 гг.?** | **%** | **Кол-ць (з 62)** |
|---|---|---|
| Доўгатэрміновае планаванне дзейнасці стала немагчымым | 81% | 50 |
| Апатыя, псіхалагічная стома, «выгаранне» супрацоўнікаў і актывістаў | 76% | 47 |
| Немагчымасць рэалізоўваць планы і праекты праз пастаянную змену сітуацыі | 61% | 38 |
| Атрыманне вонкавых рэсурсаў на дзейнасць арганізацыі стала рызыкоўным | 55% | 34 |
| Пераслед удзельнікаў арганізацыі праз іх палітычную ці грамадзянскую пазіцыю | 53% | 33 |
| Зменшылася магчымасць фінансаваць дзейнасць арганізацыі за кошт крыніц унутры краіны | 45% | 28 |
| Кадравыя страты праз пераезд супрацоўнікаў і актывістаў за межы Беларусі | 35% | 22 |
| Падзенне грамадскай цікавасці да тых тэм і праблемам, якімі мы займаемся | 35% | 22 |
| Адмова ці зацягванне рэгістрацыі праектаў | 18% | 11 |
| Людзі сыходзяць з арганізацыі праз страх ці стому | 15% | 9 |
| Неабгрунтаваныя праверкі і прэтэнзіі з боку розных дзяржорганаў (ДФР, падатковых службаў, МНС, санстанцый і т. п.) | 13% | 8 |
| Іншае (напішыце) | 10% | 6 |
| Канфлікты ў арганізацыі, звязаныя з рознымі поглядамі на палітычны крызіс і спосабы яго вырашэння | 8% | 5 |
| Канфлікты, звязаныя з падыходамі да адаптацыі дзейнасці арганізацыі ў новых умовах | 5% | 3 |
| Нічога з пералічанага вышэй | 2% | 1 |

Прычынай немагчымасці доўгатэрміновага планавання на момант правядзення апытання пераважна выступала палітычная сітуацыя ў краіне. Часта рэспандэнты адзначалі, што сітуацыя з каранавірусам, якая папярэднічала палітычнаму крызісу, у пэўным сэнсе падрыхтавала арганізацыі да рэагавання на нечаканыя змены, хутчэйшую

перабудову планаў і дзейнасці ў зменлівых умовах. Аднак самым тыповым адказам на праблемы, звязаныя з эпідэміялагічнай сітуацыяй, быў «сыход у анлайн». У сваю чаргу, палітычны крызіс і ўзмацненне рэпрэсій, для рэакцыі на якія не дастаткова такіх адносна простых спосабаў і інструментаў, ставяць перад арганізацыямі новыя выклікі.

Сёння да гэтых выклікаў дадаецца пытанне аб тым, якім чынам працягваць дзейнасць арганізацыям і ўстановам, якія пазбаўлены або ў найбліжэйшы час будуць пазбаўлены рэгістрацыі, то-бок цалкам страцяць легальны статус і звязаныя з гэтым (і без таго вельмі абмежаваныя) магчымасці.

У якасці фактараў, якія ўскладняюць планаванне, называліся не толькі ўмовы дзейнасці для самой арганізацыі, але і агульная сітуацыя ў краіне, якая ўплывае ў тым ліку на партнёраў і на розныя групы, з якімі трэба ўзаемадзейнічаць. Ніхто не ведае, што будзе заўтра з арганізацыямі, з якімі плануюцца супольныя дзеянні; як зменіцца пазіцыя мясцовых уладаў адносна таго ці іншага праекта або падзеі; як будуць рэагаваць людзі на той парадак дня і тыя кірункі дзейнасці, якімі арганізацыі займаліся раней.

Па выніках абмеркаванняў падчас фокус-груп можна казаць пра розніцу ў магчымасцях АГС аператыўна рэагаваць на зменлівыя ўмовы ў залежнасці ад тыпу іх фінансавання. У арганізацый, якія фінансуюцца пераважна ў рамках праектнай дзейнасці (строгія ўмовы выдаткавання фінансавых сродкаў), магчымасці хутка і аператыўна перанакіроўваць сродкі былі істотна абмежаваныя. І наадварот, калі ў арганізацый была большая свабода ў карыстанні ўласным бюджэтам за кошт наяўнасці сяброўскіх узносаў, моцнага камерцыйнага кампанента і інш., яны маглі хутчэй пераладжваць сваю працу і мяняць кірунак актыўнасці ў адпаведнасці з актуальнымі запытамі. У сітуацыі, калі раней запланаваная дзейнасць немагчымая і адначасова з’яўляюцца новыя праблемы, якія вымагаюць рэакцыі, арганізацыям можа спатрэбіцца аператыўна рэагаваць на змены абставін. Праектнае фінансаванне, якое грунтуецца на дэталёва прапісаных планах дзейнасці, індыкатарах і дакладна прывязаным да іх бюджэту, робіць такое рэагаванне немагчымым.

У якасці рэалістычных тэрмінаў планавання дзейнасці арганізацый каля паловы ўдзельнікаў апытання называлі перыяд да паўгода, а каля трацiны апытаных лічылі магчымым тэрмін ад паўгода да года.

*Дыяграма 1.2. Гарызонт планавання АГС*




Абмеркаванне ў фокус-групах паказвае, што нават тыя арганізацыі, якія не адмаўляюцца ад працэсаў доўгатэрміновага ці стратэгічнага планавання, ясна разумеюць, што такое планаванне сёння максімальна рамачнае, і не ўкладаюць у гэтыя працэсы сур'ёзных рэсурсаў.

Разам з тым, частка актывістаў АГС ужо на момант апытання псіхалагічна змірылася з неабходнасцю дзейнічаць ва ўмовах высокай няпэўнасці. Шмат каго, аднак, гэтая няпэўнасць па-ранейшаму фруструе і змушае наогул адмаўляцца ад любога планавання.

Такім чынам, **фармаванне сістэмы планавання дзейнасці ва ўмовах няпэўнасці, гнуткасць кіраўніцкіх і арганізацыйных інструментаў, а таксама магчымасць пераразмяркоўваць фінансавыя рэсурсы для вырашэння новых, нечаканых задач з'аўляецца адной з найбольш актуальных патрэб трэцяга сектара.**

Другі важны накірунак для захавання функцыянальнасці і выжывання трэцяга сектара — гэта **забеспячэнне бяспекі арганізацый і яе ўдзельнікаў, а таксама захаванне кадравага складу і чалавечага патэнцыялу.** На момант правядзення апытання палова арганізацый-удзельнікаў даследавання сутыкнуліся з пераследам сваіх сяброў праз іх палітычную ці грамадзянскую пазіцыю; 8 з 62 — з неабгрунтаванымі праверкамі і прэтэнзіямі з боку розных дзяржорганаў (Дэпартамента фінансавых расследаванняў (ДФР), падатковых службаў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, санітарных службаў і г.д.). Як паказвае далейшае развіццё падзей, інтэнсіўнасць ціску на арганізацыі, ажно да іх ліквідацыі, нарастае і, найхутчэй, працягне ўзрастаць. Праблема павышэння ўзроўню рэпрэсій і ўзмацнення жорсткасці заканадаўства аб дзейнасці АГС таксама трапіла ў топ-5

рэйтынгу праблем, агучаных падчас правядзення фокус-груп. Але, што важней, забеспячэнне бяспекі арганізацый і абарона актывістаў стала найважнейшай задачай для ўсіх тэматычных сектараў АГС — ад праваабарончага да сацыяльнага.

Рэпрэсіўны ціск на АГС сёння ідзе па трох асноўных накірунках.

Першы — вымыванне чалавечага рэсурсу. Арышты, штрафы, тэрміны па адміністрацыйных і крымінальных артыкулах, а таксама вымушаны ад'езд кіраўнікоў і/або сяброў арганізацый за мяжу моцна аслабляе трэці сектар. Прычым такі ціск зазнаюць арганізацыі ў самых розных тэматычных сектарах. Найбольшы ціск ідзе на праваабарончыя арганізацыі, аднак сёння пад пагрозай апынулася любая дзейнасць у любой галіне — ад сацыяльнай да даследча-аналітычнай. Развіццё навыкаў дыстанцыйнай арганізацыі працоўных працэсаў, якое пачалося яшчэ ўвесну 2020 года, крыху змяншае шкоду ад змушанага ад'езду ўдзельнікаў арганізацый за мяжу, аднак нават у гэтым выпадку наладжванне кіраўнічых працэсаў вымагае дадатковых рэсурсаў, а структура зносін і арганізацыя дзейнасці змяняюцца.

Другі — пазбаўленне тэхнічных і інстытуцыянальных магчымасцей дзейнасці: адыманне тэхнікі і дакументаў, арышты рахункаў, адмовы ў выдзяленні пляцовак для правядзення падзей, праверкі, ліквідацыя юрыдычных асоб і інш.

Трэці — гэта істотнае скарачэнне/абмежаванне магчымасцей фінансавання дзейнасці. Рэгістрацыя грантаў у Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта практычна замарожаная або ажыццяўляецца спарадычна, без прыметнай логікі; не рэгіструюцца нават невялікія гранты для не звязаных з палітыкай (апалітычных) сацыяльных арганізацый, якія працуюць з уразлівымі групамі. Парадаксальным чынам самыя легалізаваныя раней кірункі дзейнасці (напрыклад, рэгістрацыя сродкаў, якія паступаюць з-за мяжы, удзел у міжнародных праектах) зараз небяспечныя для арганізацый, якія працавалі ў легальным полі да палітычнага крызісу. На сённяшні дзень застаецца (тэарэтычна) магчымасць атрымліваць вонкавае фінансаванне праз заключэнне сэрвісных кантрактаў (заключэнне дамоў з фізічнымі асобамі на выкананне пэўных работ або паслуг), аднак яна робіцца ўсё больш рызыкоўнай. У сітуацыі нагнятання рыторыкі «халоднай вайны» з Захадам і змагання з «замежнымі агентамі» любое празрыстае фінансаванне з-за мяжы можа стаць падставай для пераследу. Гэтаксама звужаюцца магчымасці легальнага фінансавання АГС унутры краіны: паколькі незразумела, хто, калі і з якой прычыны пазначаецца як вораг дзяржавы, ахвяраваць грошы на грамадскую дзейнасць усё рызыкоўней як для бізнесу, так і для простых грамадзян.

У гэтай сітуацыі востра стаіць пытанне **аб выжыванні існых структур і захаванні арганізацыйнага і чалавечага патэнцыялу, назапашанага ў трэцім сектары.**

Яшчэ адна важная характарыстыка стану і развіцця трэцяга сектара сёння — гэта змены ў працы з мэтавымі групамі і ў стратэгіі ўцягвання грамадства ў цэлым. Гэтыя змены пачаліся яшчэ ў пачатку пандэміі, калі вымушаны сыход у анлайн, з аднаго боку,

справакаваў шэраг праблем і абмежаванняў, а з іншага, адкрыў новыя магчымасці для АГС, якія здолелі адаптавацца да новых умоў і знайшлі новыя фарматы для сваёй дзейнасці.

Каля паловы апытаных арганізацый на момант апытання (красавік—травень 2021 года) фіксавалі праблемы з доступам да сваіх мэтавых груп (МГ), аднак у большасці выпадкаў гэта была не поўная страта сувязі з МГ, а толькі часовыя праблемы і цяжкасці. Значна больш тых, хто адзначае, што за мінулы год іх арганізацыі выйшлі на прынцыпова новыя аўдыторыі і МГ.

*Дыяграма 1.3. Доступ АГС да сваіх мэтавых груп*




Праблема сувязі з мэтавымі групамі і, шырэй, уцягнення ў грамадскую дзейнасць новых людзей у сітуацыі разгортвання палітычнага крызісу характарызуецца двума рознанакіраванымі працэсамі. З аднаго боку, у шэрагу выпадкаў грамадскі ўдзел ці доступ АГС да сваіх мэтавых груп звужаюцца. Гэта характэрна перадусім для арганізацый, якія працуюць з уразлівымі групамі: людзьмі з інваліднасцю, пажылымі людзьмі, шматдзетнымі

сем'ямі, супольнасцю ЛТБТК і інш. Гэтым мэтавым групам пераход у анлайн-фарматы даецца значна цяжэй. Акрамя таго, яны значна больш за іншыя сацыяльныя пласты і групы баяцца быць «замяшанымі» ў палітыку ці нешта незаконнае, таму нярэдка прадстаўнікі гэтых груп адмаўляюцца не толькі ўдзельнічаць у актыўнасцях АГС, але нават ад атрымання гуманітарнай дапамогі.

Значна ўскладнілася дзейнасць арганізацый, якія працавалі з мясцовымі суполкамі і лакальнымі ўрбаністычнымі праектамі, экалагічнымі праблемамі альбо гарадскім і сельскім развіццём, паколькі іх праца звязаная з уцягваннем мясцовых жыхароў у грамадскія абмеркаванні, гарадскія акцыі, добраўпарадкаванне і г.д. У гэтых галінах і раней сустракаліся праблемы, аднак у большасці выпадкаў такія падзеі ладзіліся або ў партнёрстве, або, прынамсі, па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі, а сама гэтая дзейнасць лічылася дзяржаўнымі органамі адносна карыснай і бяспечнай. Аднак з развіццём палітычнага крызісу любая незалежная грамадская актыўнасць стыгматызуецца, а пасля выбуху «дваровай актыўнасці» ўвосень 2020 года лакальныя суполкі выклікаюць асаблівыя падазрэнні.

Некаторыя грамадскія арганізацыі, якія спрабуюць утрымацца ў межах свайго парадку дня і ўбаку ад палітычных пытанняў, успрымаюць як пагрозу для сябе тое, што ў іх падзеях пачынаюць удзельнічаць людзі з «новых суполак». З іншага боку, самі мясцовыя жыхары пачынаюць успрымаць як небяспечныя нават тыя формы актыўнасці, удзел у якіх яны раней лічылі магчымым.

Разам з тым, грамадская мабілізацыя лета—восені 2020 года мела вялікі патэнцыял пашырэння грамадскай базы дзейнасці АГС. Шмат актывістаў трэцяга сектара разумелі гэта. Так, 50 з 62 актывістаў АГС падчас апытання пагадзіліся з тым, што «ўздым грамадскай актыўнасці пасля выбараў 2020 года дае грамадскім арганізацыям і ініцыятывам новыя магчымасці». Аднак наладжванне сувязей і сінергія актыўнасці АГС, якія раней існавалі ў Беларусі, і новых ініцыятыў вельмі абмежаваныя. Праблемы такога роду ўзаемадзеяння ляжаць у розных галінах: гэта і пытанні бяспекі, і розніца ва ўяўленнях (палітычнай і грамадзянскай культуры), і ўзаемнае «няведанне» адно пра аднаго, і розніца тэматычных парадкаў дня. **Уцягненне актывістаў «новай хвалі» ў актыўнасці АГС або ўзмацненне ўзаемадзеяння і кааперацыі сталых арганізацый і новых ініцыятыў магло б спрыяць развіццю і ўмацаванню грамадзянскай супольнасці ў цяперашніх складаных умовах.**

Нарэшце, яшчэ адна важная характарыстыка актуальнага стану АГС — гэта характар зносін з органамі ўлады рознага ўзроўню. З развіццём палітычнага крызісу гэтае ўзаемадзеянне (якое і без таго мае абмежаваны характар) няўхільна руйнуецца. З 62 апытаных падчас даследавання актывістаў АГС 49 адказалі, што ўзровень узаемадзеяння іхняй арганізацыі з органамі ўлады рознага ўзроўню ў гэты перыяд змяніўся; з іх 29 адзначылі зніжэнне ўзроўню ўзаемадзеяння, а 19 — яго поўнае спыненне. У большасці выпадкаў спыненне ўзаемадзеяння адбывалася з ініцыятывы саміх арганізацый, а не дзяржаўных органаў (23 супраць 14); яшчэ 12 апытаных адказалі, што гэта быў «узаемны

працэс»). Відавочна, што пасля «зачысткі» АГС і ліквідацыі цэлага шэрагу арганізацый, якія адбываліся ўжо пасля апытання, узровень узаемадзеяння з уладамі рознага ўзроўню працягвае зніжацца: ліквідаваныя арганізацыі проста страчваюць для гэтага інстытуцыянальную магчымасць.

Прычыны, з якіх АГС адмаўляліся ўзаемадзейнічаць з органамі ўлады ў гэты перыяд, ляжаць у розных плоскасцях.

Першая — гэта палітычныя і этычныя пытанні супрацы з рэжымам, які страціў легітымнасць і здзяйсняе масавыя рэпрэсіі супраць уласных грамадзян. Абмеркаванне на фокус-групах паказала, што актывісты АГС па-рознаму ставяцца да калектыўнай адказнасці структур дзяржаўнага кіравання і асобных чыноўнікаў у цяперашняй сітуацыі. Прысутнічае як пазіцыя прынцыповай немагчымасці супрацы з прадстаўнікамі ўлады любога ўзроўню, так і «мякчэйшая» пазіцыя, якая дапускае выбарны падыход у гэтым пытанні. Увогуле, праблема ўзаемадзеяння з органамі ўлады і чыноўнікамі досыць балючая. Тыя арганізацыі і актывісты, якія абгрунтоўваюць захаванне зносін з дзяржавай, тлумачаць гэта інтарэсамі сваіх мэтавых груп, асабістай непрычыннасцю асобных чыноўнікаў і структур да злачынстваў рэжыму, неабходнасцю пазбегнуць расколу і палярызацыі грамадства, але агучваюць сваю пазіцыю вельмі няўпэўнена, нібы апраўдваючыся.

Другой важнай прычынай спынення ўзаемадзеяння з уладамі любога ўзроўню выступаюць пытанні бяспекі. Кантактаваць з дзяржаўнымі органамі — асабліва ў фармаце падачы альтэрнатыўнай інфармацыі, крытыкі або прапаноў — стала небяспечным для грамадскіх арганізацый у любой сферы дзейнасці. Нават калі падзеі ці кампаніі маюць «пазітыўны» характар, актывісты адчуваюць пагрозу ад кантактаў з прадстаўнікамі ўлады, бо любая грамадская актыўнасць у любы момант можа быць прызнаная дэструктыўнай.

Апошняй прычынай можна назваць тое, што яшчэ з восені 2020 года органы ўлады і чыноўнікі як на нацыянальным, так і на мясцовым узроўнях самі пачалі адмаўляцца ад узаемадзеяння з грамадскімі арганізацыямі. Спачатку гэты працэс не меў усёахопнага характару і шмат у чым залежаў ад розных фактараў: сітуацыі ў канкрэтным рэгіёне ці горадзе, асабістых характарыстык і пазіцый чыноўнікаў, пазіцыі і характару актыўнасці арганізацый і інш. Аднак з пачаткам інстытуцыянальных рэпрэсій супраць трэцяга сектару, можна з вялікай ступенню верагоднасці выказаць дапушчэнне, што роля сітуатыўных фактараў будзе зніжацца і ў найбліжэйшай будучыні ўлада будзе мэтанакіравана адбіраць «грамадскія арганізацыі» для ўзаемадзеяння. Стратэгія пазбаўлення ад самаарганізаваных суб’ектаў грамадзянскай супольнасці і «падстаноўкі» на іх месца GONGO (недзяржаўных паводле формы арганізацый, створаных дзяржавай) ужо рэалізоўвалася беларускім рэжымам у перыяды палітычнай рэакцыі (напрыклад, пасля выбараў 2006 года; у 2009 годзе, калі ўлады спрабавалі праз сістэму грамадска-кансультатыўных радаў выбудаваць «вертыкаль грамадзянскай супольнасці»; пасля выбараў 2010 года).

Можна прагназаваць падобныя змены ў будучыні (хоць цяжка назваць канкрэтныя часавыя рамкі), калі пасля жорсткай рыторыкі і дзеянняў у дачыненні да грамадскіх

арганізацый як такіх, рэжым пачне сцвярджаць, што існуюць і «карысныя» грамадскія арганізацыі. У гэтым выпадку беларускія АГС — тыя, хто не трапіць пад прамое знішчэнне — чакае чарговы «кастынг» на лаяльнасць і гнуткасць, падчас якога будуць адбірацца арганізацыі, узаемадзеянне з якімі будзе імітаваць працэс дыялогу дзяржавы з грамадзянскай супольнасцю.

Адзначым, што праблема аднаўлення зносін АГС з органамі ўлады ўжо падчас правядзення палявога этапу даследавання (красавік—травень 2021 года) не ўспрымалася большасцю ўдзельнікаў фокус-груп як актуальная. Нягледзячы на тое, што шмат для якіх арганізацый гэта стварае істотныя перашкоды для іх дзейнасці, прымушаючы пераглядаць планы, фарматы і кірункі працы, прысутнічала разуменне таго, што да вырашэння палітычнага крызісу і змены сітуацыі не мае сэнсу фармаваць стратэгіі аднаўлення ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі.

## 1.2. Прыярытэты дзейнасці і актуальныя задачы АГС

У анкетным апытанні АГС у красавіку—траўні мы спыталі, як актывісты бачаць сваю арганізацыю праз год. Большасць адказаў можна звесці да фармулёўкі аднаго з рэспандэнтаў: «Два варыянты: 1. пашырэнне мэтавай аўдыторыі і тэматыкі дзейнасці; 2. поўнае закрыццё». Для кагосьці больш рэалістычным варыянтам на той момант было «поўнае закрыццё», для кагосьці «пашырэнне», аднак у абсалютнай большасці выпадкаў будучыня арганізацыі звязвалася з вырашэннем (або невырашэннем) палітычнага крызісу ў краіне і агульнымі ўмовамі дзейнасці АГС.

Найбольш актуальнай задачай для сваёй арганізацыі ўдзельнікі апытання назвалі забеспячэнне яе бяспекі. Гэты ж прыярытэт нязменна з'яўляўся на першых месцах і падчас правядзення фокус-груп.

На другім месцы апынулася задача знайсці новыя фарматы працы са сваімі мэтавымі групамі. Наладжванне або пашырэнне ўзаемадзеяння з новымі ініцыятывамі, якія з'явіліся ўвосень 2020 года, было актуальнай задачай для значна меншай колькасці арганізацый. Захаванне арыентацыі на свае мэтавыя групы пацвярджае і аналіз вынікаў фокус-груп, паводле якога «дапамога сваім МГ» нязменна аказвалася важнейшым за развіццё зносін з «новымі суполкамі» і ініцыятывамі.

Больш за палову апытаных адзначылі ў якасці адной з найактуальнейшых задач знаходжанне рэсурсаў для падтрымання дзейнасці арганізацыі хаця б у мінімальным рэжыме, што характарызуе сітуацыю АГС як сітуацыю выжывання.

Трэба адзначыць, што ў рэйтынгу актуальных задач арганізацый павышэнне інтэнсіўнасці працы з мясцовай уладай займае ніжнюю пазіцыю. Падчас фокус-груп гэты прыярытэт таксама практычна заўсёды апынаўся ўнізе рэйтынгу.

*Табліца 1.2. Актуальныя задачы для АГС*

| **Якія з пералічаных задач сёння актуальныя для вашай арганізацыі? (красавік—травень 2021 г.)** | **%** | **Кол-ць (з 62)** |
|---|---|---|
| Забяспечыць бяспеку супрацоўнікаў і актывістаў, арганізацыі агулам | 79% | 48 |
| Знайсці новыя фарматы працы са сваімі мэтавымі групамі | 69% | 42 |
| Знайсці рэсурсы для падтрымання дзейнасці арганізацыі хаця б у мінімальным рэжыме | 61% | 37 |
| Стварыць ці пашырыць узаемадзеянне з новымі ініцыятывамі, лакальнымі суполкамі, якія сталі фармавацца ўвосень 2020 г. | 43% | 26 |
| Вызначыць стратэгію працы з новымі мэтавымі групамі, якія з’явіліся ў арганізацыі ў сувязі з падзямі апошняга года | 43% | 26 |
| Пераключыцца на працу з новымі тэмамі, праблемамі, якія сталі актуальнымі праз грамадска-палітычныя трансфармацыі ў краіне | 41% | 25 |
| Пашырыць узаемадзеянне з бізнесам | 34% | 21 |
| Атрымаць магчымасць шырэй прасоўваць свой парадак дня ў медыя | 33% | 20 |
| Інтэнсіўней супрацоўнічаць з мясцовымі органамі ўлады | 8% | 5 |
| Іншае | 3% | 2 |

У адказах на пытанне, якія задачы для беларускіх грамадскіх арганізацый і ініцыятыў (гэта значыць для сектара ўвогуле) будуць актуальныя ў найбліжэйшай перспектыве (да канца года), матыў выжывання і бяспекі таксама гучыць вельмі часта.

Агулам, уяўленні аб актуальных задачах сектара можна сабраць у некалькі блокаў:

- Вырашэнне ўнутраных задач (захаванне арганізацый і супрацоўнікаў/валанцёраў), наладжванне працэсаў працы ў новых умовах (забеспячэнне ўстойлівага фінансавання, правядзенне падзей анлайн, дыстанцыйная праца офіса, вырашэнне пытанняў бяспекі, праблем эмацыйнага выгарання);
- Адаптацыя да пастаяннага пагаршэння ўмоў, пошук новых падыходаў, формаў працы, тэмаў і кірункаў дзейнасці. Пошук уласнага месца і вызначэнне сваёй ролі ў зmененай сітуацыі;
- Кансалідацыя ўнутры сектара і развіццё сувязяў з новымі ініцыятывамі, бізнесам, развіццё кааперацыі і салідарнасці;
- Падтрымка грамадзянскіх ініцыятыў, мясцовых актывістаў. Зрушэнне акцэнтаў дзейнасці на развіццё мясцовых суполак, грамадзянскую адукацыю;
- «Актарызацыя» АГС (усведамленне трэцім сектарам сябе як актара, дзейнага суб’екта ў грамадска-палітычнай сітуацыі, выпрацоўванне агульнага парадку дня і стратэгіі дзеянняў для вырашэння палітычнага крызісу, распачынанне камунікацыі і ўзаемадзеяння з палітычнымі сіламі).

Тройчы былі згаданыя задачы «знаходжання балансу» ў зносінах з уладай і наладжвання адносін з ёю.

25 з 68 апытаных актывістаў трэцяга сектара адзначылі ў якасці актуальнай задачы для сваёй арганізацыі варыянт «пераключыцца на працу з новымі тэмамі, праблемамі, якія сталі актуальнымі праз грамадска-палітычныя трансфармацыі ў краіне». Неабходнасць працаваць з новымі тэмамі, актуальнымі сёння для беларускага грамадства, адзначаліся і ў адказах на пытанні аб актуальных задачах сектара. Найважнейшыя праблемы, у вырашэнні якіх гатовы былі браць удзел апытаныя актывісты АГС, — гэта грамадзянская адукацыя, развіццё мясцовых суполак і прасоўванне беларускай культуры.

*Табліца 1.3. Актуальныя тэмы і праблемы для працы АГС*

| **У вырашэнні якіх актуальных праблем вы і ваша арганізацыя хацелі б і маглі б удзельнічаць? (красавік—травень 2021 г.)** | **%** | **Кол-ць (з 62)** |
|---|---|---|
| Грамадзянская адукацыя, павышэнне ўзроўню грамадзянскіх кампетэнцый | 77% | 47 |
| Развіццё мясцовых суполак | 69% | 42 |
| Прасоўванне беларускай культуры і мовы | 51% | 31 |
| Развіццё мясцовага самакіравання | 39% | 24 |
| Дапамога ўразлівым сацыяльным групам ва ўмовах крызісу | 31% | 19 |
| Пераадоленне расколу ў беларускім грамадстве, медыяцыя канфліктаў | 31% | 19 |
| Развіццё прадпрымальніцтва | 23% | 14 |
| Прававая дапамога, кансультаванне | 20% | 12 |
| Праваабарончая дзейнасць | 8% | 5 |
| Дапамога медыкам і сістэме аховы здароўя | 7% | 4 |
| Іншае | 15% | 9 |

Адзначым, што найчасцей выбар гэтых задач вызначаецца ўжо наяўным досведам і кампетэнцыямі арганізацыі. Сярод «новых» тэм, з якімі арганізацыі раней не працавалі, але гатовыя былі б паспрабаваць, найчасцей называюцца праца з мясцовымі суполкамі, самакіраваннем і медыяцыя канфліктаў.

На пытанне аб тым, якім мэтавым групам зараз найбольш патрэбная дапамога, большую частку адказаў можна звесці да 6-ці мэтавых груп. Найчасцей называліся фінансавая, прававая і псіхалагічная формы дапамогі і падтрымання для розных МГ. Што да зместу дапамогі розным МГ, прапануецца наступнае:

| **Мэтавая група** | **Формы дапамогі** |
|---|---|
| Пацярпелыя ад рэпрэсій, іх сем'і (гаворка тут ідзе не толькі аб палітвязнях і затрыманых, але і аб тых, хто страціў працу, атрымаў «забарону на прафесію» або зазнаў іншыя формы ціску праз сваю грамадзянскую пазіцыю) | Фінансавая дапамога, юрыдычныя кансультацыі, псіхалагічная дапамога, дапамога ў працаўладкаванні, рэсацыялізацыі і, калі неабходна, у рэлакацыі |

| | |
|---|---|
| Ініцыятывы, якія ўзніклі падчас палітычнага крызісу: прафзвязы, дваровыя, лакальныя суполкі і КОТэГС, страйкамы і інш. | Дапамога ў арганізацыйным развіцці, дапамога ў палітычнай і грамадзянскай адукацыі і асвеце, наладжванне камунікацыі і сетак узаемадзеяння паміж сабой і з палітычнымі лідарамі; трэнінгі і навучанне па пытаннях бяспекі (у тым ліку лічбавай), юрыдычнае кансультаванне, псіхалагічная дапамога |
| Сам трэці сектар, г. зн. актывісты АГС | Базавая і аперацыйная дапамога, адміністрацыйная і кансалтынгавая дапамога ў выпадку змен у спосабах арганізацыі працы, тэхніка і абсталяванне для працы, навучанне і кансультацыі па новых кірунках працы, псіхалагічная дапамога, змаганне з «выгараннем» |
| Незалежныя медыя, журналісты | Фінансавая дапамога, прававая дапамога, стажыроўкі або магчымасць «творчых адпачынкаў» за межамі Беларусі (апытанне праводзілася яшчэ да масавага выезду рэдакцый і журналістаў за мяжу) |
| Моладзь, моладзевыя арганізацыі і ініцыятывы | Псіхалагічная і прававая дапамога, магчымасці дадатковай адукацыі (напрыклад, дыстанцыйнай), стажыроўкі або магчымасць працягнуць адукацыю за межамі краіны |
| Уразлівыя групы (пажылыя, людзі з асаблівымі патрэбамі) | Праекты базавай дапамогі |

## 1.3. Актуальныя патрэбы ў развіцці патэнцыялу, новых кампетэнцыях, падыходах і ведах

Падчас правядзення фокус-груп прыярытэт «арганізацыйнае развіццё, асваенне новых навыкаў, кампетэнцый, звязаных са змененымі ўмовамі» аказаўся самым значным для АГС, якія працуюць з культурай, моладдзю, гарадскім і мясцовым развіццём і адукацыяй. Значна ніжэйшыя рэйтынгі гэты варыянт атрымаў у прадстаўнікоў арганізацый, якія працуюць з экалагічным парадкам дня, сацыяльнымі праблемамі, развіццём АГС. Практычна нязначным яго адзначылі праваабаронцы.

Тое, якіх менавіта навыкаў і кампетэнцый не стае арганізацыям сёння, можна канкрэтызаваць у двух блоках. У першы ўваходзіць усё звязанае з забеспячэннем бяспекі — лічбавай, фізічнай, бяспекі арганізацый і іх сяброў. Другі блок — гэта кіраўнічыя і арганізацыйныя кампетэнцыі, якія дазволілі б арганізацыям працягваць дзейнічаць ва ўмовах, што пастаянна змяняюцца.

Анкетнае апытанне АГС пацвярджае актуальнасць гэтых дзвюх тэм: самымі актуальнымі названы патрэбы ў забеспячэнні лічбавай бяспекі і кампетэнцыі ў планаванні дзейнасці ва ўмовах няпэўнасці. Адаптацыю донарамі сваіх правіл для працы ў новых умовах адзначылі як патрэбу 30 з 68 апытаных актывістаў, неабходнасць дадатковых фінансавых рэсурсаў для адаптацыі да новых умоў — 28.

*Табліца 1.4. Новыя патрэбы АГС*

| Якія новыя патрэбы з’явіліся ў вашай арганізацыі ў сувязі са зменай умоў дзейнасці за апошні год? (красавік—травень 2021 г.) | % | Кол-ць (з 62) |
|---|---|---|
| Лічбавая бяспека | 71% | 44 |
| Кампетэнцыі ў планаванні дзейнасці ва ўмовах няпэўнасці | 65% | 40 |
| Арганізацыя кіраўнічых працэсаў у дыстанцыйным рэжыме | 60% | 37 |
| Забеспячэнне фізічнай бяспекі | 53% | 33 |
| Кампетэнцыі ў выкарыстанні IT і анлайн-тэхналогій | 48% | 30 |
| Адаптацыя донарамі сваіх правіл працы з арганізацыямі | 48% | 30 |
| Прававая і юрыдычная дапамога | 47% | 29 |
| Дадатковыя фінансавыя рэсурсы для адаптацыі да новых умоў | 45% | 28 |
| Наладжванне сувязей з прынцыпова новымі аўдыторыямі | 39% | 24 |
| Нешта яшчэ | 3% | 2 |
| Ніякіх новых патрэб не з’явілася | 2% | 1 |

Трэба адзначыць, што разуменне «лічбавай бяспекі» пашыраецца сярод актывістаў АГС. Некаторыя кажуць ужо не аб забеспячэнні бяспекі як нейкім комплексе дзеянняў, а аб «кібергігіене» як засвоеных і пастаянна ўжываных навыках — напрыклад, чысціць увечары «адчувальныя» перапіскі ў месенджарах, усталёўваць на сваіх электронных прыладах рэжымы абароны дадзеных, правяраць іх на прадмет абароненасці ад лічбавых нападаў, выходзіць з акаўнтаў і інш. Нягледзячы на вялікую колькасць трэнінгаў, інструкцый і матэрыялаў па лічбавай бяспецы і абмеркаванне на фокус-групах, і практыка затрыманняў і арыштаў актывістаў паказвае, што забеспячэнне лічбавай бяспекі ў АГС часта ўяўляе сабой сур’ёзную праблему. Сёння патрэбныя іншыя падыходы да гэтай праблемы — не толькі навучанне агульнаму комплексу ведаў, але і адрасная дыягностыка і наладжванне сістэмы лічбавай бяспекі і «гігіены» для арганізацый і/або асобных актывістаў. Такія практыкі ёсць і цяпер, аднак відавочна, што яны вымагаюць пашырэння.

Яшчэ адна параўнальна новая для АГС галіна, якая робіцца запатрабаванай, — гэта падрыхтаванасць да магчымых ператрусаў і затрыманняў як асобных актывістаў, так і арганізацыі ўвогуле. На практыцы актывістам АГС, як і іншым грамадзянам, часта не стае разумення, як паводзіць сябе падчас ператрусу ці на допыце, як забяспечыць хуткую сувязь і інфармаванне аб форс-мажорах, як знайсці адваката, як рэагаваць іншым удзельнікам арганізацыі ў выпадку затрымання кіраўніка і/або некага з актывістаў і г.д.

Складанейшая вобласць арганізацыйнага развіцця, у якой цяпер фіксуецца выражаная патрэба — гэта забеспячэнне функцыянавання і кіравання арганізацыяй ва ўмовах высокай няпэўнасці і пастаянных змен. Вырашэнне гэтай задачы вымагае:

1) павышэння ступені свабоды ў планаванні актуальных дзеянняў (то-бок адсутнасці жорсткай звязанасці знешнімі абавязкамі ў выкананні праектаў);
2) пабудовы сістэмы кіравання, заснаванай на пастаянным аналізе ўмоў дзейнасці і грамадскіх запытаў;
3) якаснага адміністравання працэсаў перагляду задач, пераразмеркавання абавязкаў і г.д.

Большасць арганізацый не маюць дастатковых рэсурсаў для таго, каб забяспечыць усе гэтыя складнікі. Ёсць запыт на аналітыку і маніторынг грамадска-палітычных працэсаў і змен у трэцім сектары, якія давалі б кожнай арганізацыі магчымасць арыентавацца ў сітуацыі і вызначаць уласную тактыку дзеянняў.

Сярод накірункаў падтрымкі, якія былі найбольш актуальнымі ў красавіку—траўні 2021 года, на першых месцах як для асобных арганізацый, так і для сектара былі: «падтрымка пастаянных выдаткаў арганізацыі», «арганізацыйнае развіццё» і «стварэнне і падтрымка кааліцый АГС». Можна меркаваць, што з пагаршэннем умоў дзейнасці АГС такая падтрымка робіцца яшчэ больш запатрабаванай. Разам з тым, неабходна разумець, што для арганізацый, якія зараз трапляюць пад рэпрэсіі, ператрусы і ліквідацыю юрыдычных асоб, але маюць намер працягваць працу, аперацыйная і інстытуцыйная дапамога робіцца яшчэ больш запатрабаванай, аднак зусім у іншых формах. Узнікае патрэба ў выдатках на новую тэхніку ўзамен канфіскаванай, могуць стаць актуальнымі выдаткі на арэнду прыватнага жытла, новыя віды юрыдычных паслуг і кансультацый, выдаткі на рэлакацыю і на першапачатковае ўладкаванне ў іншай краіне і інш.

*Табліца 1.5. Актуальныя накірункі падтрымкі*

| **Якія накірункі падтрымкі цяпер найбольш актуальныя (красавік—травень 2021 г.)** | **Для вашай арганізацыі** | **Для вашага тэматычнага сектара** |
|---|---|---|
| Падтрымка пастаянных выдаткаў арганізацыі (бухгалтэрыя, арэнда, камунальныя плацяжы, падаткі і г.д.) | 59% | 67% |
| Арганізацыйнае развіццё — новыя навыкі, кампетэнцыі і г.д. | 56% | 61% |
| Стварэнне і падтрымка кааліцый, асацыяцый, сетак і іншых формаў аб’яднанняў для супольных дзеянняў грамадскіх арганізацый | 56% | 61% |
| Адвакатыўныя кампаніі ўнутры краіны | 30% | 39% |
| Адвакатыўныя кампаніі за межамі Беларусі | 15% | 13% |

| | | |
|---|---|---|
| Цяжка адказаць | 13% | 8% |
| Іншае | 11% | 7% |

У якасці яшчэ аднаго актуальнага накірунку падтрымкі называецца стварэнне і падтрымка кааліцый, асацыяцый і сетак для супольных дзеянняў грамадскіх арганізацый. Гэтая тэма падымалася і ў абмеркаваннях на фокус-групах, аднак мы так і не змаглі атрымаць пэўных змястоўных адказаў аб тым, якога роду задачы ў актуальнай сітуацыі павінны былі б вырашаць такога кшталту аб'яднанні. Запыт на кааліцыйнасць і павышэнне ўзроўню кансалідацыі дзеянняў выглядае шмат у чым як выражэнне псіхалагічнай патрэбы ў яднанні ў сітуацыі пагаршэння ўмоў.

Нарэшце, правядзенне адвакатыўных кампаній як унутры, так і за межамі краіны аказваецца найменш актуальным накірункам падтрымкі; на фокус-групах гэтая сфера дзейнасці АГС таксама не трапляла ў прыярытэты. Шмат актывістаў АГС не бачаць магчымасцей адвакатавання ў сваіх тэматычных галінах як з прычыны існых прававых і інстытуцыйных умоў, так і праз нястачу рэсурсаў на такую дзейнасць.

Акрамя прапанаваных у анкеце варыянтаў, актывісты АГС, якія ўдзельнічалі ў апытанні, адзначалі ў якасці актуальных кірункаў дапамогі развіццё лічбавых навыкаў і кампетэнцый у ІТ. Таксама ў якасці асобнага накірунку называлася павышэнне лічбавай пісьменнасці іх мэтавых груп і грамадства агулам. У сітуацыі, калі значная частка дзейнасці АГС сыходзіць у анлайн, гэтая задача выглядае вельмі актуальнай.

У якасці асобнага накірунку называліся таксама праграмы «антывыгарання» і рэабілітацыі, прычым скіраваныя як на актывістаў АГС, так і на іншыя катэгорыі: культурных дзеячаў, студэнтаў, журналістаў, актывістаў мясцовых суполак і г.д. У такім рэжыме могуць працаваць творчыя рэзідэнцыі, стажыроўкі, кароткатэрміновыя «творчыя адпачынкі» або гасцявыя візіты ў блізкія па профілю арганізацыі, то-бок разнастайныя фарматы, якія сумяшчаюць задачы прафесійнага развіцця з эфектамі псіхалагічнай разгрузкі.

## ВЫСНОВЫ

Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці зараз дзейнічаюць у вельмі неспрыяльных умовах. Ад шырокіх палітычных рэпрэсій супраць актывістаў у ліпені 2021 года беларускі рэжым перайшоў да мэтанакіраваных інстытуцыянальных рэпрэсій, скіраваных супраць АГС розных формаў (установы, грамадскія арганізацыі, фонды, асацыяцыі і г. д.), якія працуюць у розных сферах. Працэс масавай ліквідацыі АГС працягваецца. Да пачатку кастрычніка 2021 года, паводле звестак праваабарончага цэнтру «Вясна», ліквідавана каля 275 АГС, аднак гэтыя звесткі не поўныя і не канчатковыя. Ускладняюцца не толькі палітычныя, прававыя і інстытуцыйныя, але і эканамічныя ўмовы

дзейнасці АГС. Да таго ж, шмат арганізацый і актывістаў праз імклівае разгортванне рэпрэсій былі вымушаны пакінуць краіну і весці сваю дзейнасць з-за мяжы.

Нягледзячы на ўзмацненне рэпрэсій і пагаршэнне ўмоў, беларускія АГС працягваюць сваю дзейнасць, хаця шмат для каго з іх на першы план выходзяць задачы забеспячэння бяспекі арганізацыі і яе сяброў, захаванне арганізацыйнага і чалавечага патэнцыялу. Трэці сектар застаецца патэнцыйным праваднікам сацыяльна-палітычных трансфармацый у краіне, аднак сёння яго роля абмежаваная пераважна захаваннем лакальных прастораў свабоднай актыўнасці і чалавечага рэсурсу як унутры, так і за межамі краіны.

Змененыя ўмовы існавання (environment) грамадзянскай супольнасці вымагаюць адмовы ад традыцыйных схем узаемадзеяння АГС з рознымі стэйкхолдэрамі, у тым ліку з дзяржавай (рэспубліканскімі і мясцовымі органамі ўлады), паколькі ўся свабодная і незалежная актыўнасць практычна абвешчана «па-за законам».

Уцягненне актывістаў «новай хвалі» ў актыўнасці АГС або ўзмацненне ўзаемадзеяння і кааперацыі сталых арганізацый і новых ініцыятыў магло б спрыяць развіццю і ўмацаванню грамадзянскай супольнасці ў сучасных складаных умовах. Аднак на сённяшні дзень такое развіццё моцна ўскладняецца ўзроўнем рэпрэсій і звязанай з імі праблемай наладжвання новых зносін.

Уяўленні аб актуальных задачах трэцяга сектара ўнутры самога сектара зводзяцца ў некалькі асноўных блокаў:

- Захаванне арганізацый і супрацоўнікаў/валанцёраў, наладжванне працэсаў працы ў новых умовах, адаптацыя да ўмоў, якія пастаянна пагаршаюцца;
- Падтрымка грамадзянскіх ініцыятыў, мясцовых актывістаў, зрушэнне акцэнтаў дзейнасці на развіццё мясцовых суполак, грамадзянскую адукацыю;
- Кансалідацыя ўнутры сектара і «актарызацыя» АГС.

З аднаго боку, захаванне патэнцыялу, назапашанага беларускім трэцім сектарам за апошнія дзесяцігоддзі, вымагае новых формаў арганізацыі дзейнасці саміх арганізацый грамадзянскай супольнасці. Выбудова сістэмы планавання дзейнасці ва ўмовах няпэўнасці, гнуткасць кіраўніцкіх і арганізацыйных інструментаў, а таксама магчымасць пераразмяркоўваць фінансавыя рэсурсы на вырашэнне новых, нечаканых задач — адны з самых актуальных патрэб трэцяга сектара. З іншага боку, неабходна пашырыць дапамогу АГС, у тым ліку падтрымку новых накірункаў дзейнасці, і выпрацаваць гнуткія механізмы такой падтрымкі.

## 2. «НОВЫЯ СУПОЛКІ»: АКТУАЛЬНЫ СТАН І ПАТРЭБЫ

*У гэтай частцы даследавання мы разглядаем феномен фармавання протасуполак розных тыпаў, які стаў адным з сацыяльных эфектаў палітычнай мабілізацыі 2020 года. На падставе інтэрв'ю і анлайн-апытання актывістаў «новых суполак» — мясцовых (гарадскіх, «дваровых», суседскіх), прафесійных і студэнцкіх, страйкамаў і незалежных прафзвязаў — у раздзеле аналізуюцца дынаміка станаўлення і развіцця, асноўныя праблемы і патрэбы «новых суполак», а таксама характар і інтэнсіўнасць іх сувязей з іншымі суб'ектамі. Аналіз вынікаў даследавання паказвае, што сёння «новыя суполкі» змушаны засяродзіцца на пытаннях забеспячэння бяспекі, узаемадапамогі і ўласнага ўзнаўлення, не маючы ні магчымасці, ні дакладных уяўленняў аб тым, якія формы актыўнасці могуць весці да дасягнення агульных палітычных мэтаў.*

Важнымі характарыстыкамі грамадска-палітычнай мабілізацыі 2020 года выступаюць высокі ўзровень самаарганізацыі пратэснай часткі беларускага грамадства, імклівае развіццё гарызантальных сувязей і ўключэнне ў агульны рух вялікай колькасці людзей, раней індыферэнтных да палітыкі. У перыяд перадвыбарчай кампаніі вірусна распаўсюджваліся спосабы дзеянняў, якія меліся падтрымаць рух да перамен: зборы подпісаў за кандыдатаў, кампаніі вылучэння ў чальцы выбарчых камісій і незалежныя назіральнікі. З'яўляліся самастойныя (не звязаныя наўпрост са штабамі кандыдатаў) ініцыятывы, якія мусілі спрыяць сумленнасці і празрыстасці выбараў (рассылка лістоў сябрам выбарчых камісій, кампанія «Свежы вецер», платформы «Голас», «Зубр»); праз інтэрнэт распаўсюджваліся прапановы канкрэтных дзеянняў (напрыклад, прапанова чакаць вынікаў выбараў каля выбарчых участкаў, якая адыграла важную ролю ў масавых пратэстах 9 жніўня) і інш.

Акрамя ўласна палітычнай мабілізацыі вялікай колькасці людзей, якія не праяўлялі раней цікавасці да палітыкі, масавыя пратэсты ў жніўні—верасні 2020 года спрычыніліся да фармавання новых суполак (ці, прынамсі, протасуполак) розных тыпаў. На хвалі пратэснай актыўнасці фармаваліся групы і суполкі, якія аб'ядноўваюць людзей па розных сацыяльных характарыстыках: прафесійныя, студэнцкія, жаночыя, моладзевыя, суполкі пажылых людзей і інш. Прыкметнай з'явай стала фармаванне страйкавых камітэтаў на прадпрыемствах і развіццё прафзвязнага руху. Аднак самым масавым працэсам стала фармаванне мясцовых (гарадскіх, суседскіх, «дваровых») протасуполак.

У рамках дадзенага даследавання была пастаўлена мэта ацаніць стан, патрэбы і патэнцыял развіцця «новых суполак», якія захоўваюць актыўнасць на дадзены момант.

Эмпірычнай базай аналізу ў гэтай частцы даследавання сталі:

1. 5 паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі АГС і экспертамі, якія мелі досвед працы з «новымі суполкамі» з верасня 2020 г. (сакавік 2021 г.);

2. 30 паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі «новых суполак» («дваровых» і гарадскіх суполак, страйкамаў, незалежных прафзвязаў). Перыяд правядзення інтэрв'ю: 26 красавіка—20 траўня 2021 г.);
3. Анлайн-апытанне актывістаў «новых суполак» (сабрана 663 анкеты, якія адпавядаюць характарыстыкам мэтавай аўдыторыі — удзел у дзейнасці ўстойлівых суполак — і прайшлі папярэднюю праверку на паўнату і якасць запаўнення. Перыяд правядзення апытання: 9—18 ліпеня 2021 г. Асноўны спосаб распаўсюду анкет — тэлеграм-каналы[9]).

У сітуацыі адсутнасці звестак аб генеральнай сукупнасці, яе колькасці і структуры сфармаваць выбарку немагчыма. Таму дадзеныя праведзенага апытання не прэтэндуюць на рэпрэзентатыўнасць і нельга казаць аб тым, што яны адлюстроўваюць сітуацыю ў краіне ў цэлым. Тым не менш, з улікам досыць вялікай колькасці актывістаў, якія паўдзельнічалі ў апытанні, і магчымасці дапоўніць аналіз дадзенымі паўструктураваных інтэрв'ю мы можам меркаваць, што дадзеныя апытання блізкія да адлюстравання агульнай сітуацыі.

## 2.1. Анлайн-апытанне актывістаў «новых суполак»: характарыстыкі аўдыторыі апытання

Для таго, каб лепш разумець асаблівасці аўдыторыі, якая ўдзельнічала ў апытанні, апішам яе асноўныя характарыстыкі.

Пераважная большасць (79,8%) тых, хто ўзяў удзел у апытанні, жывуць у Беларусі. Рэспандэнтаў, якія пастаянна жывуць у іншай краіне ўсяго 2,3%, яшчэ 5,9% выехалі з краіны падчас рэпрэсій у 2020—2021 годзе.

*Табліца 2.1. Краіна пражывання рэспандэнтаў даследавання*

| **Цяпер вы жывяце ў Беларусі ці ў іншай краіне?** | **%** |
|---|---|
| Жыву ў Беларусі | 79,8 |
| Выехаў з краіны ў перыяд рэпрэсій у 2020—2021 гадах | 5,9 |
| Пастаянна жыву ў іншай краіне | 2,3 |
| Няма адказу | 12,1 |

Сярод тых, хто ўвесь час жыве ў іншай краіне ці з'ехаў у перыяд рэпрэсій, найбольш рэспандэнтаў, якія жывуць у Польшчы, Нямеччыне і Украіне.

[9] Апытанне праводзілася з выкарыстаннем сэрвісу *SurveyMonkey*; прапанова аб удзеле ў апытанні распаўсюджвалася праз тэлеграм-каналы і сацыяльныя сеткі. Асноўная частка рэспандэнтаў, якія запоўнілі анкету, найхутчэй з'яўляюцца падпісантамі канала ініцыятывы «Сумленныя людзі», якая падтрымлівала правядзенне апытання, і тэлеграм-канала «МотолькоПомоги».

Большасць рэспандэнтаў, якія адказалі, што жывуць у Беларусі, — жыхары Мінска (68,6%); найменш прадстаўлены малыя гарады (1,9%); астатнія тыпы населеных пунктаў прадстаўлены прыкладна аднолькава (па 8–10% ад агульнага масіву).

*Табліца 2.2. Размеркаванне рэспандэнтаў, якія жывуць у Беларусі, паводле тыпу населенага пункта*

| **Дзе вы жывяце (пастаянна ці большую частку часу)? (n=529)** | **%** |
|---|---|
| У Мінску | 68,6 |
| У вёсцы, аграгарадку, пасёлку | 10,4 |
| У горадзе-раённым цэнтры | 9,8 |
| У горадзе-абласным цэнтры | 8,1 |
| У малым горадзе | 1,9 |
| Не хачу адказваць на гэтае пытанне | 0,8 |
| Няма адказу | 0,4 |

Акрамя Мінска, найлепш у агульным масіве прадстаўленая Мінская вобласць (15,5%); рэспандэнтаў з іншых абласцей значна менш.

*Табліца 2.3. Размеркаванне рэспандэнтаў, якія жывуць у Беларусі, паводле рэгіёнаў*

| **У якім рэгіёне Беларусі вы жывяце? (n=529)** | % |
|---|---|
| Брэсцкая вобласць | 3,8 |
| Віцебская вобласць | 4,2 |
| Гомельская вобласць | 2,1 |
| Гродзенская вобласць | 4,7 |
| Мінская вобласць | 15,5 |
| Магілёўская вобласць | 1,5 |
| Мінск | 66,7 |
| Не хачу адказваць на гэтае пытанне | 0,8 |
| Няма адказу | 0,8 |

Значная большасць апытаных — людзі ва ўзросце ад 25 да 54 гадоў (72,7%), то-бок эканамічна актыўная частка грамадства.

*Табліца 2.4. Размеркаванне рэспандэнтаў паводле ўзросту*

| **Узрост** | % |
|---|---|
| 16—24 | 3,5 |
| 25—39 | 44,3 |

| | |
|---|---|
| 40—54 | 28,4 |
| 55—75 | 6,8 |
| Няма адказу | 17,0 |

Большасць рэспандэнтаў — хоць гэтая перавага і невялікая — мужчыны (прынамсі сярод тых, хто адказаў на гэтае пытанне).

*Табліца 2.5. Размеркаванне рэспандэнтаў паводле полу*

| **Пол рэспандэнтаў** | % |
|---|---|
| Мужчынскі | 49,3 |
| Жаночы | 36,2 |
| Не хачу адказваць на гэтае пытанне | 2,0 |
| Няма адказу | 12,5 |

Сярод апытаных значная большасць — людзі з вышэйшай адукацыяй: вышэйшую адукацыю ці паглыбленую вышэйшую адукацыю адзначылі 73,9% рэспандэнтаў.

*Табліца 2.6. Размеркаванне рэспандэнтаў паводле ўзроўню адукацыі*

| **Якая ў вас адукацыя?** | % |
|---|---|
| Пачатковая, няпоўная сярэдняя | 0,2 |
| Сярэдняя (10—11 класаў) | 2,9 |
| Прафесійна-тэхнічная (ПТВ) | 3,2 |
| Сярэдняя спецыяльная (тэхнікум) | 6,5 |
| Вышэйшая | 64,4 |
| Паглыбленая вышэйшая | 9,5 |
| Не хачу адказваць на гэтае пытанне | 0,9 |
| Няма адказу | 12,5 |

Прыватны сектар у аўдыторыі апытання прадстаўлены значна больш за дзяржаўны: крыху больш за 60% апытаных або працуюць на прыватных прадпрыемствах/арганізацыях, або кіруюць сваім бізнесам, з'яўляюцца ІП і г.д.; 8,9% займаюцца фрылансам.

*Табліца 2.7. Размеркаванне рэспандэнтаў паводле роду дзейнасці*

| **Што з пералічанага ніжэй вас характарызуе (можна было выбраць больш за адзін варыянт адказу):** | % |
|---|---|
| Працую на прыватным прадпрыемстве/арганізацыі | 41,6 |
| Вяду свой бізнес, ІП і г.д. | 19,5 |

| | |
|---|---|
| Працую на дзяржаўным прадпрыемстве/арганізацыі | 15,4 |
| Фрылансер | 8,9 |
| На сёння беспрацоўны/беспрацоўная | 6,2 |
| На пенсіі | 4,4 |
| Вучуся ў школе, тэхнікуме, ВНУ | 1,4 |
| Працую ў грамадскай арганізацыі | 1,1 |
| Не хачу адказваць на гэтае пытанне | 2,4 |

Большая частка апытаных (54%) лічаць, што найлепшы варыянт для Беларусі — гэта не ўступаць ні ў якія геапалітычныя звязы; 29% — прыхільнікі Еўразвязу; прыхільнікаў саюзу з Расіяй сярод апытаных практычна няма (0,2%).

*Дыяграма 2.1. Геапалітычныя арыентацыі рэспандэнтаў*




Аўдыторыя апытання таксама дэманструе вельмі нізкі ўзровень прытрымлівання ўстановак, характэрных для беларускай дзяржаўнай палітыкі ў розных сферах у мінулы перыяд. Самай «папулярнай» аказалася ўстаноўка на бясплатнае медычнае абслугоўванне, нават са стратай якасці — аднак і яе падзяляюць толькі 6,9% апытаных актывістаў «новых суполак». Значная ж большасць (77,2%) не падтрымлівае ніводнай з традыцыйных для дзяржаўнай палітыкі мінулага перыяду ўстановак.

*Табліца 2.8. Успрыманне розных установак*

| Ці згодны вы з наступнымі сцверджаннямі? | % |
|---|---|
| Лепш мець медычнае абслугоўванне сярэдняга ўзроўню, але бясплатна | 6,9 |
| Лепш, каб беларускія прадпрыемствы зараблялі не вельмі вялікія прыбыткі, але не былі скуплены замежнікамі | 4,5 |
| Лепш мець меншы заробак, але гарантаваную працу | 1,8 |
| Лепш размяркоўваць выпускнікоў прымусова, але не пакідаць іх непрацаўладкаванымі | 0,6 |
| Лепш працаваць на дзяржаўным прадпрыемстве, чым на прыватным | 0,5 |
| Не згодны/не згодная ні з адным са сцверджанняў | 77,2 |

Нарэшце, ацэнка актуальнасці рэформ у розных сферах пасля вырашэння палітычнага крызісу паказвае, наколькі сур'ёзна для апытаных актывістаў «новых суполак» стаяць пытанні палітычнага ладу ўвогуле: у першай тройцы рэформ практычна з аднолькавымі паказальнікамі знаходзяцца рэформа палітычнай, праваахоўнай і судовай сістэм. Ад іх крыху адстае змена Канстытуцыі (як найбольш актуальную яе ацэньваюць 73% апытаных).

*Дыяграма 2.2. Ацэнка актуальнасці рэформ у розных сферах, %*




Сферы рэфармавання, якія традыцыйна ў апытаннях насельніцтва Беларусі займалі першыя пазіцыі (ЖКГ, сацыяльная абарона, адукацыя і ахова здароўя) аказаліся ў канцы спісу прыярытэтаў апытаных у дадзеным даследаванні, хаця іх неабходнасць таксама прызнае досыць высокая доля актывістаў «новых суполак».

## 2.2. Дынаміка з’яўлення і актуальны стан «новых суполак»

У Беларусі з шэрагу прычын мясцовыя суполкі развітыя вельмі слаба[10] і не з’яўляюцца актарам ні ў рэалізацыі мясцовага самакіравання, ні на вышэйшых узроўнях кіравання або публічнай палітыкі. Аднак у працэсе арганізацыі пратэстаў досыць хутка сталі фармавацца аб'яднанні суседзяў, жыхароў двара, квартала, горада ці вёскі. Першапачатковымі штуршкамі да такой самаарганізацыі выступала менавіта арганізацыя пратэсных дзеянняў: выхаду на акцыі пратэсту, збору подпісаў, каб апратэставаць вынікі выбараў, запуску працэдур адклікання дэпутатаў і інш. Аднак ужо да верасня 2020 года парадак дня і набор актыўнасцей «новых суполак» сталі пашырацца. Шырока распаўсюдзіліся — асабліва ў Мінску — так званыя «дваровыя сустрэчы», калі суседзі ладзілі ў сваіх дварах падзеі рознага фармату — ад супольных чаяванняў да лекцый, канцэртаў, тэатральных пастановак. З’явіўся такі кірунак, як змаганне за семіятычную прастору: ўпрыгожванне двароў і вуліц сцягамі і бчб-стужкамі, графіці, муралы і інш. Палітычны парадак дня стаў дапаўняцца пытаннямі добраўпарадкавання, вырашэння супольных для раёна ці горада праблем, пытаннямі экалогіі, то-бок «традыцыйным» для мясцовых суполак парадкам дня.

Ацаніць маштабы гэтага працэсу досыць складана, асабліва з улікам таго, што ўлады адрэагавалі хутка і агрэсіўна, пачаўшы падаўляць усе гэтыя віды актыўнасці. Мы можам аперываць толькі некаторымі ўскоснымі дадзенымі. Напрыклад, актыўнасцю карыстальнікаў лакальных тэлеграм-чатаў, якія адыгралі важную ролю ў фармаванні «новых суполак». На пачатку верасня 2020 года быў створаны сайт-каталог і інтэрактыўная карта лакальных тэлеграм-груп (чатаў) «dze.chat — размовы з суседзямі»[11], на якім можна было лёгка знайсці чаты двароў і раёнаў па ўсёй Беларусі і суполкі ў іншых краінах для беларусаў замежжа. Ужо ў канцы верасня на ім было адзначана больш за 1000 чатаў, колькасць неўнікальных карыстальнікаў якіх складала каля 550 000[12]. Гэты паказальнік не можа быць перанесены наўпрост на афлайнавую «дваровую» актыўнасць, аднак можна меркаваць, што ён прыблізна адлюстроўвае маштаб працэсу мабілізацыі беларускага грамадства.

Ужо ў самым пачатку пратэснага руху з’явіліся паведамленні аб страйках на некаторых прадпрыемствах, сталі фармавацца страйкамы. Страйкавы рух быў досыць хутка задушаны, спроба ў канцы кастрычніка 2020 года арганізаваць агульнанацыянальны страйк фактычна правалілася, а большасць актыўных удзельнікаў страйкамаў трапілі пад рэпрэсіі і былі звольнены з прадпрыемстваў. Паралельна з фармаваннем страйкамаў і спробамі арганізацыі страйкаў на прадпрыемствах у арганізацыях таксама пачаўся працэс выхаду з «афіцыйнага» прафзвязу і фармавання новых ячэек незалежных прафзвязаў. Гэты працэс

---

[10] Водолажская Т., Мацкевич В. Становление и развитие сообществ // https://eurobelarus.info/files/22/86/Book_Community.pdf.
[11] 18 кастрычніка 2021 г. стала вядома, што МУС прызнала сайт «экстрэмісцкім фармаваннем» // https://dev.by/news/2ef.
[12] Локальные телеграм-группы (чаты) летом-осенью 2020 года: динамика активности и содержание коммуникации // https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2020_TG_Belarus-II.pdf.

таксама не набыў масавага характару: першасныя створаныя арганізацыі апынуліся ў становішчы «напаўлегальнасці»[13] і таксама адразу трапілі пад рэпрэсіі. Тым не менш, частка створаных на хвалі пратэснай мабілізацыі першасных арганізацый працягваюць сваю дзейнасць нават у тых выпадках, калі актывістаў звальняюць з прадпрыемстваў. Паводле звестак праведзеных інтэрв'ю, сфармаваныя (як мінімум яшчэ ўлетку 2021 года) першасныя арганізацыі актыўна ўзаемадзейнічалі, спрабавалі развіваць свае ячэйкі і назапашваць патэнцыял. Частка гэтай актыўнасці пазней увайшла ў ініцыятыву «Рабочы рух»[14].

Падчас разгортвання пратэснай актыўнасці ўтвараліся таксама розныя групы, якія вылучаліся па сацыяльна-дэмаграфічных прыкметах: гендарнай ці ўзроставай прыналежнасці, прафесіі ці роду занятказў. Некаторыя з іх працягнулі існаваць і па сканчэнні актыўнай фазы пратэстаў; яны працягваюць камунікаваць і шукаюць новыя формы актыўных дзеянняў. Шмат чатаў існуюць у закрытым рэжыме, але ёсць і адкрытыя, напрыклад, чат «Белые халаты» (прызнаны экстрэмісцкім 04.10.2021), «Live. Сообщество железнодорожников Беларуси» (прызнаны экстрэмісцкім 05.10.2021), «Пенсионеры 97% Беларусь» і інш.

Досыць часта людзі, якія актыўна ўключыліся ў працэс пераўтварэнняў, бяруць удзел не ў адной, а ў некалькіх суполках, падтрымліваючы разнастайныя ініцыятывы — як агульныя для краіны, так і лакальнага ўзроўню. Напрыклад, сярод апытаных актывістаў «новых суполак» толькі крыху больш за трацiну (37%) удзельнічаюць у дзейнасці толькі адной суполкі; 39,4% рэспандэнтаў адзначылі два розныя тыпы суполак, у дзейнасці якіх яны або бяруць актыўны ўдзел, або падтрымліваюць яе час ад часу; 23,6% у той ці іншай ступені ўключаны ў актыўнасць трох і больш суполак розных тыпаў.

Агульная карціна ўдзелу аўдыторыі апытання ў актыўнасці суполак розных тыпаў выглядае наступным чынам (гл. Дыяграму 2.3):

[13] Хаця існаванне незалежных прафзвязаў давала магчымасць ствараць на прадпрыемствах першасныя арганізацыі, яны не маглі зарэгістравацца — найчасцей таму, што немагчыма было знайсці юрыдычны адрас.
[14] У верасні 2021 г. шэраг актывістаў «Рабочага руху» былі арыштаваны, а 18 кастрычніка стала вядома, што КДБ абвясціла «Рабочы рух» «экстрэмісцкім фармаваннем» // https://dev.by/news/2ef.

*Дыяграма 2.3. Удзел рэспандэнтаў у дзейнасці суполак розных тыпаў*




Самая распаўсюджаная актыўнасць сярод апытаных — гэта ўдзел у дзейнасці мясцовых суполак. Гэта пацвярджае і адказ на наступнае пытанне, у якім мы прасілі адзначыць найважнейшую для рэспандэнта суполку, якой ён аддае найбольш часу і сіл. Тры чвэрці апытаных назвалі ў якасці такой менавіта мясцовую суполку.

*Табліца 2.9. Ідэнтыфікацыя з суполкамі розных тыпаў*

| **Калі вы ўдзельнік больш за адной суполкі, калі ласка, напішыце, якая з іх для вас найважнейшая (чаму вы надаеце больш часу і сіл)?** | **%** |
|---|---|
| Мясцовая суполка (суседская, «дваровая», гарадская ці сельская) | 75,4 |
| Іншая | 11,6 |
| Прафесійная суполка, згуртаванне людзей адной прафесіі, роду заняткаў | 7,5 |
| Страйкам на прадпрыемстве, у арганізацыі, у вну | 2,3 |
| Незалежны прафзвяз на прадпрыемстве, у арганізацыі, у ВНУ | 1,7 |
| Студэнцкая суполка | 0,9 |
| Няма адказу | 0,6 |

Сярод варыянтаў «іншая», г. зн. іншых тыпаў суполак, не пазначаных у анкеце, згадваюцца суполкі і чаты пенсіянераў, «партызанскі рух», «рух супраціву», самвыдат, ініцыятыва «Сход», розныя грамадзянскія ініцыятывы, «суполкі аднадумцаў».

Большасць апытаных уключылася ў дзейнасць новых суполак у жніўні—верасні 2020 года. Грунтуючыся на звестках апытання, можна казаць, што пазітыўная дынаміка, хоць і пакрысе слабеючы, захоўвалася да канца 2020 года, а потым практычна сышла на нішто. Гэта пацвярджаюць і звесткі паўструктураваных інтэрв'ю, у якіх актывісты гавораць аб тым, што ў канцы лета—пачатку восені быў бурны ўсплёск, затым да канца 2020 года, нягледзячы на рэпрэсіі, працягваўся павольны рост або прынамсі папаўненне новымі людзьмі, а пасля Новага года пачаўся працэс стагнацыі.

*Табліца 2.10. Дынаміка з'яўлення «новых суполак» і ўключэння рэспандэнтаў у іх дзейнасць*

| | **Як даўно з'явілася ваша суполка, ініцыятыва? (%)** | **Як даўно вы самі сталі браць удзел у дзейнасці гэтай суполкі, ініцыятывы? (%)** |
|---|---|---|
| Да траўня 2020 г. | 6,3 | 5,9 |
| У траўні—ліпені 2020 г. | 8,4 | 9,0 |
| У жніўні 2020 г. | 43,3 | 38,8 |
| У верасні 2020 г. | 22,2 | 23,4 |
| У кастрычніку—снежні 2020 г. | 12,1 | 16,4 |
| У студзені—сакавіку 2021 г. | 0,8 | 3,0 |
| У красавіку—траўні 2021 г. | 0,9 | 1,8 |
| Не ведаю, не магу сказаць пэўна | 5,6 | 1,5 |
| Няма адказу | 0,5 | 0,2 |

Аналіз паўструктураваных інтэрв'ю з актывістамі паказвае, што ёсць агульная логіка развіцця «новых суполак», характэрная для іх розных тыпаў.

1. Жнівень—верасень 2020 года: бурны рост. На хвалі мабілізацыі падхопліваліся любыя ідэі, якія маглі падтрымаць пратэсны рух, прыходзіла шмат новых людзей, рэалізоўваліся розныя формы актыўнасці. На гэтым этапе хутка наладжваліся сувязі, скокападобна вырас узровень даверу паміж тымі, хто ўключаўся ў пратэсны рух увогуле і ў актыўнасць «новых суполак» у прыватнасці.

2. Кастрычнік—снежань 2020 года: інерцыйнае развіццё. Удзел у вулічных акцыях пратэсту паступова рутынізуецца, парадак дня пашыраецца ад пратэснага і скіраванага на хуткае вырашэнне палітычнага крызісу да пытанняў арганізацыі мясцовага самакіравання,

добраўпарадкавання, абароны правоў пэўных груп і інш. Развіваюцца сувязі з іншымі суполкамі, абмен досведам і ідэямі, планаванне і рэалізацыя супольных дзеянняў.

3. Студзень—сакавік 2021 года: крышталізацыя і структураванне. Узровень рэпрэсій захоўваецца, але колькасць людзей у «новых суполках» меншае, у тым ліку праз выгаранне і страту веры ў перамены. Клопат аб бяспецы ўдзельнікаў суполкі і дзейнасці вымагае ўсё больш высілкаў. Ідзе пошук формаў актыўнасці, якую можна рэалізоўваць «застаючыся ў рамках закону». Дзеянні робяцца «эканомнейшымі», бо чалавечыя рэсурсы ўсё больш абмежаваныя. Адначасова сярод тых, хто працягвае актыўнасць, пачынаюць размяркоўвацца ролі, з'яўляецца патрэба планаваць дзейнасць, прадумваць планы развіцця самой суполкі.

4. Красавік—ліпень 2021 года (мяркуем, што тэндэнцыя застаецца): выжыванне і «партызанінг». Працяг рэпрэсій і адсутнасць пазітыўных змен у агульнай сітуацыі прыводзіць да таго, што большая частка дзейнасці суполак сыходзіць «у падполле». Паколькі пачынае пераследавацца практычна любая самастойная актыўнасць, незалежна ад яе характару, пошук бяспечных формаў дзейнасці страчвае значэнне. Шмат высілкаў ідзе на забеспячэнне бяспекі, канспірацыю, дапамогу тым, хто трапіў пад рэпрэсіі. Мацнеюць сувязі з тымі, хто з'ехаў з Беларусі; частка вымушаных з'ехаць з краіны па-ранейшаму захоўваць актыўныя пазіцыі ў суполках, забяспечваючы функцыі, якія можна выконваць дыстанцыйна і якія ўяўляюць сабой патэнцыйную небяспеку для тых, хто застаецца ў краіне (напрыклад, адміністраванне тэлеграм-чатаў, вядзенне сайтаў і г.д.). Ідзе пошук формаў дзеянняў, якія могуць рэалізоўвацца суполкамі хаця б для таго, каб не распасціся, працягваць супольную дзейнасць. Праз адсутнасць зразумелых перспектыў агульнай змены сітуацыі асноўнай каштоўнасцю робіцца захаванне сувязей і патэнцыялу самой суполкі, магчымасць яе пашырэння.

Звесткі апытання актывістаў паказваюць, што самымі распаўсюджанымі формамі актыўнасці ўлетку 2021 года былі дзеянні, скіраваныя на матэрыяльную (64,9%) і сімвалічную (62,9%) дапамогу палітвязням і іх сем'ям.

За імі ідуць актыўнасці, скіраваныя на ўмацаванне сувязей паміж суседзямі (52,5%), дзеянні па мясцоваму добраўпарадкаванню (42,8%), асветніцкая праца, уцягненне людзей у суполку, ініцыятыву (41,6%). Усе гэтыя тры тыпы дзеянняў можна лічыць прама ці ўскосна скіраванымі на ўмацаванне сувязей у лакальным маштабе дома, двара, раёна.

Яшчэ адзін досыць актыўны кірунак — гэта інфармацыйная праца: распаўсюд улётак, газет, разнастайны самвыд (49,8%), вядзенне паблікаў, каналаў у Тэлеграм ці іншых сацыяльных сетках (32,3%).

*Табліца 2.11. Формы актыўнасці, якія рэалізуюць «новыя суполкі» за апошнія тры месяцы (ў сакавіку—траўні 2021 г.)*

| **Якія кірункі ці формы актыўнасці рэалізоўваліся за апошнія тры месяцы вашай суполкай, ініцыятывай?** | **%** |
|---|---|
| Матэрыяльная дапамога (грашыма, прадуктамі, арганізацыя перадач і інш.) асобам, якія зазналі ціск ці рэпрэсіі ў сувязі са сваёй грамадзянскай пазіцыяй, або іх сем'ям | 64,9 |
| Акцыі салідарнасці, падтрымання палітычных вязняў ці тых, хто зазнае ціск | 62,9 |
| Падзеі і актыўнасць, скіраваныя на ўмацаванне сувязей паміж суседзямі, арганізацыю супольнага баўлення часу і да т. п. | 52,5 |
| Распаўсюд улётак, газет і інш. | 49,8 |
| Дзеянні, скіраваныя на добраўпарадкаванне дома, двара, раёна | 42,8 |
| Асветніцкая праца, уцягненне людзей у суполку, ініцыятыву | 41,6 |
| Звароты ў дзяржаўныя органы з лістамі, петыцыямі, заявамі адносна агульнапалітычнай сітуацыі | 33,9 |
| Вядзенне паблікаў, каналаў у Тэлеграм ці іншых сацыяльных сетках | 32,3 |
| Дзеянні, скіраваныя на вырашэнне праблем вашага горада, пасёлка, вёскі | 17,5 |
| Звароты, ліставанне, сустрэчы з дзяржаўнымі органамі і чыноўнікамі наконт значных грамадскіх праблем (змена заканадаўства, праваприымяняльнай практыкі і інш.) | 15,1 |
| Арганізацыя адукацыйных падзей для сяброў сваёй суполкі, ініцыятывы | 14,0 |
| Звароты, ліставанне, сустрэчы з дэпутатамі любога ўзроўню | 13,4 |
| Арганізацыя КОТэГС ці іншых формаў мясцовага самакіравання | 7,2 |
| Абарона правоў працаўнікоў прадпрыемстваў ці арганізацый, навучэнцаў і да т. п. | 5,1 |
| Камунікацыя з мясцовымі ўладамі па пытаннях выдаткоўвання мясцовых бюджэтаў, рашэнняў, якія яны прымаюць, і да т. п. | 3,5 |
| Цяжка адказаць | 1,8 |

Самыя распаўсюджаныя формы ўзаемадзеяння з уладамі любога ўзроўню — гэта звароты ў дзяржаўныя органы з лістамі, петыцыямі, заявамі наконт агульнапалітычнай сітуацыі. Прамыя формы камунікацыі (ліставанне, сустрэчы з чыноўнікамі і дэпутатамі) па пытаннях лакальнага маштабу сустракаюцца значна радзей, камунікацыя з мясцовымі ўладамі наконт рашэнняў, якія яны прымаюць, наогул практычна адсутная.

Неактуальнасць пытанняў наладжвання ўзаемадзеяння з мясцовымі ўладамі шматкроць падкрэслівалася актывістамі падчас паўструктураваных інтэрв'ю. Калі яшчэ ўвосень—узімку 2020 года яшчэ можна была спадзявацца на легалізацыю дзейнасці суполак (арганізацыю КОТэГС, рэгістрацыю грамадскіх аб'яднанняў, першасных ячэек прафзвязаў і да т.п), то падчас правядзення даследавання (травень—ліпень 2021 года) практычна ўсе

нашы суразмоўцы адзначалі, што ніякіх спадзеваў на гэта больш няма. Пагатоў наяўнасць юрыдычнага статусу перастала разглядацца як фактар, які пашырае магчымасці і робіць дзейнасць бяспечнай.

Адзначалася падчас інтэрв'ю і «расчараванасць» камунікацыяй з мясцовай уладай: калі на першых этапах такая камунікацыя вялася актывістамі, каб дамагчыся вырашэння нейкіх праблем, то зараз гэта хутчэй спосаб захаваць ціск і ўтрымаць уласныя пазіцыі нягледзячы на тое, што гэта ўсё небяспечней.

Падчас анлайн-апытання больш за 40% рэспандэнтаў адказалі, што ў кароткатэрміновай перспектыве яны не плануюць узаемадзейнічаць з мясцовай уладай ні ў якіх формах; 21% мелі намер працягваць ціснуць на мясцовыя ўлады, каб змяніць сітуацыю ў краіне ці сваім горадзе; 8,9% прэтэндавалі на грамадскі кантроль над іх дзейнасцю. Атрымаць падтрымку ад мясцовых уладаў разлічвалі толькі 1,4% апытаных.

*Табліца 2.12. Ацэнка перспектыў узаемадзеяння «новых суполак» з мясцовай уладай*

| **Якія кірункі працы з мясцовымі ўладамі рэалізуе ці збіраецца рэалізоўваць у блізкай перспектыве ваша суполка, ініцыятыва?** | % |
|---|---|
| Мы не плануем у блізкай перспектыве ўзаемадзейнічаць з мясцовымі ўладамі | 41,8 |
| Ціск на мясцовыя ўлады з мэтай змены сітуацыі ў краіне, горадзе | 21,0 |
| Грамадскі кантроль дзейнасці мясцовых органаў улады | 8,9 |
| Атрыманне дазволаў, легалізацыя тых дзеянняў і пераўтварэнняў, якія мы ініцыюем | 8,3 |
| Наладжванне супрацы, удзел у мерапрыемствах і ініцыятывах мясцовай улады | 4,1 |
| Атрыманне рэгістрацыі нашай ініцыятывы, арганізацыі | 4,1 |
| Атрыманне адміністрацыйнай ці фінансавай дапамогі ад мясцовых органаў улады | 1,4 |
| Цяжка адказаць | 22,9 |

Сярод новых кірункаў ці формаў актыўнасці, якія актывісты «новых суполак» плануюць пачаць у найбліжэйшай будучыні (пытанне задавалася ў адкрытай форме, атрымана 111 адказаў), трэба адзначыць адносна высокую долю адказаў, звязаных з радыкалізацыяй, «партызанкай» і ўдзелам у палітычных падзеях (рэферэндум) або кампаніях (план «Перамога»). Што да астатняга, гэта ўсё тыя ж тыпы дзеянняў: самы частотны адказ — «працягваць рабіць тое, што робім» (24 адказы), трэці паводле папулярнасці — «хацелася б новых фарматаў, але незразумела, што рабіць» (13 адказаў).

| |
|---|
| Працягваць тое, што робім (24 адказы з 111) |
| Арганізацыя акцый пратэсту і «партызаншчына»: бчб-стужкі, адзенне, графіці (15) |
| Хацелі б новых фарматаў і ініцыятыў, але незразумела, што рабіць (13) |
| Інфармацыя, прапаганда, асвета: друк улётак, развіццё сайтаў, падкасты, сістэматызацыя і распаўсюд інфармацыі (9) |

| |
|---|
| Развіццё самой суполкі, сувязей з іншымі суполкамі (8) |
| Дапамога палітвязням (8) |
| Распаўсюд інфармацыі і ўдзел у рэалізацыі плана «Перамога» (7) |
| Добраўпарадкаванне, дабрачыннасць, арганізацыя святаў, спаборніцтваў (6) |
| Дзеянні, звязаныя з камунікацыяй або ціскам на чыноўнікаў, спробамі змяніць заканадаўства (6) |
| Радыкальныя дзеянні (6) |
| Развіццё мясцовага самакіравання, КОТэГС, права на горад (3) |
| Эканамічны ціск, адмова ад куплі тавараў (3) |
| Актыўны ўдзел у палітычных падзеях (канстытуцыйны рэферэндум, мясцовыя выбары) і структурах (3) |

Ацэньваючы перспектывы развіцця сваёй суполкі (пытанне задавалася ў адкрытай форме, атрымана 234 больш-менш разгорнутых адказаў), актывісты часта звязваюць гэтыя перспектывы з развіццём палітычнай сітуацыі ў краіне ўвогуле. Часам гэтая сувязь фармулюецца гранічна радыкальна: «калі зменіцца ўлада, суполка будзе развівацца, калі не — знікне» (17 адказаў). Для часткі актывістаў змена палітычнай сітуацыі з’яўляецца не пытаннем выжывання суполкі, а той кропкай, што прывядзе да змены характару яе дзейнасці, з’яўлення новых задач (21 адказ) або самароспуску («Будзем працягваць да перамогі, пасля гэтага ў суполцы не будзе сэнсу» — 21 адказ).

Аптымістычных прагнозаў досыць шмат («суполка будзе развівацца, стане актыўнейшай, павялічыцца колькасць удзельнікаў» — 45 адказаў, «суполка стане падмуркам для развіцця той ці іншай формы самакіравання, грамадскага аб’яднання і інш.» — 42 адказы). Адкрыта песімістычных прагнозаў менш, і іх можна падзяліць на два асноўныя тыпы: «актыўнасць і колькасць удзельнікаў будуць меншаць з прычыны рэпрэсій» (10 адказаў); «усіх, хто не з’ехаў, хутка пасадзяць, і суполка знікне» (20 адказаў). Частка актывістаў бачаць у перспектыве пераход да радыкальнейшых формаў дзеянняў (10 адказаў). Аднак самы частотны тып адказаў фіксуе поўную няпэўнасць сітуацыі, калі «ніхто не ведае, што будзе заўтра, а праз год і пагатоў» (48 адказаў).

## 2.3 Узаемадзеянне з іншымі суб’ектамі

Важная ўмова развіцця суполак, сфармаваных на хвалі палітычнай мабілізацыі, — гэта развіццё сувязей з іншымі суб’ектамі, ініцыятывамі і арганізацыямі. Неабходнасць наладжвання такіх сувязей разумеюць і самі актывісты; асабліва востра яе сталі ўсведамляць, калі першы мабілізацыйны імпэт пайшоў на спад, панізілася энергетыка агульнага руху, з’явілася патрэба дакладней прадумваць і шукаць магчымыя фарматы сваіх дзеянняў, ідэі і спосабы іх рэалізацыі.

Наладжванне сувязей паміж «новымі суполкамі» пачалося досыць хутка: ужо ў верасні лакальныя суполкі пачалі ладзіць асобныя супольныя акцыі і падзеі. Па меры

крышталізацыі лакальных суполак і ўскладнення ўмоў іх дзейнасці развіваць гэтыя сувязі стала складаней: узраслі патрабаванні да забеспячэння бяспекі, канспірацыі і г.д. Арганізоўваць супольныя акцыі стала надта небяспечна, таму гэты від актыўнасці пайшоў на спад, аднак актывісты лакальных суполак абменьваюцца ідэямі, кансультуюць адно аднаго або дапамагаюць знайсці патрэбных спецыялістаў. Акрамя таго, сувязь з іншымі суполкамі выконвае функцыю псіхалагічнай падтрымкі.

Досыць хутка сталі наладжвацца сувязі і паміж страйкамамі і ячэйкамі незалежных прафзвязаў, якія паступова выбудавалі сістэму пастаяннай камунікацыі, абмену навінамі, планамі, паспяховымі кейсамі, узаемнага кансультавання і г.д.

Падчас інтэрв'ю з актывістамі «новых суполак» часта падкрэслівалася важнасць захавання сувязі з людзьмі, якія вымушана з'ехалі з краіны, але працягваюць выконваць важныя функцыі ў суполцы.

Анлайн-апытанне актывістаў пацвярджае гэтыя тэзісы, хаця і паказвае, што апісаныя сувязі, найхутчэй, не вельмі ўстойлівыя. У прыватнасці, наяўнасць рэгулярнага ўзаемадзеяння з суполкамі свайго тыпу і з беларускімі дыяспарамі ці актывістамі, якія з'ехалі з краіны, адзначылі менш за адну пятую апытаных. Аднак тых, хто ўвогуле не мае такога ўзаемадзеяння, не так шмат (адпаведна 12,2% і 20,5%); часцей гэта разавыя, асобныя выпадкі ўзаемадзеяння.

*Дыяграма 2.4. Узровень узаемадзеяння з іншымі суполкамі і АГС*



Сувязі «новых суполак» з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці значна слабейшыя. Аналіз інтэрв’ю з актывістамі паказвае, што яны не заўсёды дакладна разумеюць, што такое «грамадскія арганізацыі», то-бок ні ў іхнім тэзаўрусе, ні ва ўяўленнях не існуе «трэцяга сектара» як такога. Пра грамадскія арганізацыі даведваюцца найчасцей тады, калі нехта з актывістаў суполкі сам з'яўляецца сябрам ГА ці калі суполка ўключылася ў нейкія праграмы, адукацыйныя падзеі ці іншыя ініцыятывы, прапанаваныя ГА па актуальных тэмам. Сярод рэспандэнтаў анлайн-апытання толькі 5,9% адзначылі рэгулярнае ўзаемадзеянне з ГА; яшчэ чвэрць (26,8%) гавораць аб асобных выпадках узаемадзеяння.

Інтэнсіўнасць узаемадзеяння з іншымі суполкамі і грамадскімі арганізацыямі найніжэйшая ў мясцовых суполак. Рэгулярнае ўзаемадзеянне з суполкамі свайго тыпу адзначылі 15,9% рэспандэнтаў, якія прадстаўляюць мясцовыя суполкі, а вось сярод актывістаў прафесійных, студэнцкіх суполак і прафзвязаў гэты паказальнік амаль удвая вышэйшы (29,6%). Аналагічна выглядае і ўзаемадзеянне з дыяспарамі і актывістамі, якія з’ехалі з краіны (з імі рэгулярна ўзаемадзейнічаюць 18% прадстаўнікоў мясцовых суполак і 26,3% прадстаўнікоў прафесійных, студэнцкіх суполак або прафзвязаў), а таксама з грамадскімі арганізацыямі (адпаведна, 3,6% і 12,7%).

Узровень узаемадзеяння «новых суполак» з палітычнымі суб’ектамі таксама невысокі. Найчасцей і найрэгулярней узаемадзейнічаюць са штабам Святланы Ціханоўскай: 3,5% апытаных азначылі рэгулярнае ўзаемадзеянне, яшчэ 26,4% — у асобных выпадках. Тым не менш амаль палова (47,1%) апытаных адзначылі, што іхняя суполка ніколі не ўступала ў зносіны са штабам Ціханоўскай; узровень узаемадзеяння з іншымі палітычнымі структурамі (Каардынацыйнай Рада, НАУ, палітычнымі партыямі) яшчэ ніжэйшы.

Цікава, што адносна узаемадзеяння з палітычнымі суб’ектамі, адрозненняў паміж рознымі тыпамі суполак практычна няма: для ўсіх яно аднолькава нізкае.

*Дыяграма 2.5. Узровень узаемадзеяння «новых суполак» з палітычнымі ініцыятывамі і арганізацыямі*




Важную ролю ў пратэсным руху працягваюць граць грамадзянскія ініцыятывы, якія запусціліся да выбараў ці ў поствыбарчы перыяд і досыць стабільна выконваюць шэраг інфраструктурных функцый, ініцыююць розныя кампаніі, вядуць адукацыйную і асветніцкую працу. Найшырэй падтрымліваюцца апытанымі актывістамі «новых суполак» платформа «Голас» і ініцыятыва «Сумленныя людзі»: кампаніі ці дзеянні, якія яны ініцыююць, рэгулярна ці часам падтрымліваюць, адпаведна, 81% і 74,2% рэспандэнтаў. На другім месцы — ініцыятывы збору дапамогі пацярпелым ад рэпрэсій, кампанія *BY_Help* і Фонд салідарнасці *BYSOL*, якія маюць практычна аднолькавы ўзровень падтрымкі.

*Дыяграма 2.6. Узровень падтрымкі актывістамі «новых суполак» розных грамадзянскіх кампаній і ініцыятыў*




Разам з тым, актывісты суполак розных тыпаў (мясцовых, прафесійных, студэнцкіх, прафзвязаў і страйкамаў) практычна не адрозніваюцца ўзроўнем уключанасці ў розныя кампаніі і дзеянні. Выняткам з'яўляюцца такія «прадметныя» ініцыятывы, як КОТэГС (калектыўныя органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання), якія найбольш падтрымліваюць актывісты мясцовых суполак, і «Прафсаюз Online», у кампаніі і дзейнасці якой у большай ступені ўключаны актывісты незалежных прафзвязаў і страйкамаў.

## 2.4 Асноўныя праблемы і патрэбы «новых суполак»

Асноўныя праблемы ў развіцці «новых суполак» палягаюць у высокім узроўні рэпрэсій супраць актыўных грамадзян і звязаным з гэтым адмаўленнем людзей ад актыўнасцей праз страх, стому і страту веры ў змену сітуацыі. Не менш важная праблема для актывістаў «новых суполак» — гэта адсутнасць разумення, што рабіць у актуальны момант каб рухацца да дасягнення агульных мэтаў. Адзначым важнасць гэтай праблемы, якая падчас правядзення і інтэрв'ю, і анлайн-апытання паводле значнасці была практычна на адным узроўні з праблемай рэпрэсій і ціску на ўдзельнікаў суполак.

Разам з тым, адсутнасць палітычных лідараў, якія маглі б задаць кірунак агульнага руху, успрымаецца як праблема ў значна меншай ступені: толькі 25,5% апытаных адзначылі гэта ў якасці праблемы, а падчас інтэрв'ю яна ўвогуле не фармулявалася. Гэтую сітуацыю можна інтэрпрэтаваць як мінімум двума спосабамі.

Першая інтэрпрэтацыя — гэта першапачатковая дэцэнтралізаванасць і «гарызантальнасць» пратэснага руху, якая захоўваецца дагэтуль. Палітычныя лідары, іхнія штабы і іншыя інстытуцыялізаваныя структуры па-ранейшаму ўспрымаюцца як частка агульнага руху, у якім кожны выконвае нейкія дзеянні, аднак іерархія, узгадненне, кіраванне практычна адсутнічаюць.

Другая інтэрпрэтацыя хутчэй звязаная з галіной сацыяльнай псіхалогіі. Падчас інтэрв'ю ў актывістаў «новых суполак» досыць часта і выразна праяўляліся негатыўныя ўстаноўкі да лідарства як такога. У гэтым стаўленні бачыцца своеасаблівая «траўма» персаналісцкага тыпу кіравання ў Беларусі. Нават на ўзроўні сваіх суполак людзі не хочуць казаць аб лідарстве, імкнуцца падкрэсліць роўнасць усіх удзельнікаў, добраахвотнасць падтрымання любой ініцыятывы, адсутнасць кіраўніцтва і сілы аўтарытэту.

*Табліца 2.13. Ацэнка актуальнасці праблем, з якімі сутыкаюцца актывісты «новых суполак»*

| **З якімі асноўнымі праблемамі сёння сутыкаецца ваша суполка, ініцыятыва?** | % |
|---|---|
| Ціск і рэпрэсіі супраць удзельнікаў | 63,3 |
| Цяжка зразумець, што менавіта зараз трэба рабіць, каб дасягаць агульных мэт | 62,9 |
| Актыўных людзей у суполцы ўсё менш, людзі сыходзяць (праз страх, расчараванне і г.д.) | 59,6 |
| Немагчыма знайсці бяспечныя фарматы працы | 49,6 |
| Перашкоды ў дзейнасці з боку дзяржаўных чыноўнікаў, мясцовых улад, адміністрацыі прадпрыемства і да т. п. | 40,3 |
| Адсутнасць прытоку новых людзей | 37,3 |
| Няма ці не стае каардынацыі з іншымі падобнымі суполкамі | 30,0 |
| Няма палітычных лідараў, якія могуць ясна сказаць, што трэба рабіць | 25,5 |
| Недахоп патрэбных ведаў, кампетэнцый ва ўдзельнікаў суполкі, ініцыятывы | 16,7 |
| Недахоп фінансавых рэсурсаў | 13,7 |
| Цяжкасці з рэгістрацыяй арганізацыі (КОТэГС, прафзвязная ячэйка, ГА ці іншая форма), атрыманнем легальнага статусу | 9,4 |
| Складанасці ў камунікацыі, канфлікты паміж удзельнікамі | 6,3 |
| Цяжка адказаць | 2,1 |
| Не сутыкаемся ні з якімі праблемамі | 0,6 |

Менш значнымі актывісты «новых суполак» лічаць праблемы каардынацыі з іншымі суполкамі, недахоп кампетэнцый, ведаў і недахоп фінансавых рэсурсаў. Практычна неактуальнае пытанне атрымання легальнага статусу, рэгістрацыі і інш. Рэйтынг праблем, якія непакояць актывістаў «новых суполак», паказвае, што большасць з іх сапраўды знаходзяцца ў сітуацыі выжывання, маючы вельмі абмежаваныя магчымасці для дзеяння, а галоўнае — не маючы ідэй для развіцця «тут і цяпер».

Сярод ведаў, якіх, на думку рэспандэнтаў, не стае ім самім і сябрам іхняй суполкі, на першым паводле запатрабаванасці месцы стаяць прававыя веды, юрыдычная пісьменнасць (адзначым, што падчас свабодных інтэрв'ю, у якіх адсутнічалі шкалы з «падказкай», гэта была ўвогуле практычна адзіная галіна ведаў, якую называлі актывісты ў якасці запатрабаванай). Каля трацiны рэспандэнтаў анлайн-апытання адчуваюць недахоп разумення работы механізмаў міжнароднай палітыкі, ведаў у галіне менеджменту, беларускай гісторыі і культуры, функцыянавання палітычных і эканамічных інстытутаў.

*Дыяграма 2.7. Ацэнка запатрабаванасці ведаў з розных сфер актывістамі «новых суполак», %*




У галіне практычных навыкаў і ўменняў найбольш запатрабаваныя кампетэнцыі, звязаныя з лічбавай бяспекай. На другім месцы знаходзіцца ўстойлівасць у стрэсавых сітуацыях, што ў чарговы раз вяртае нас да разумення высокай ступені ціску, які зазнаюць

актывісты «новых суполак». Наступныя пазіцыі займаюць кампетэнцыі, звязаныя з магчымасцю пашырэння суполак і руху да змены палітычнай сітуацыі ўвогуле: інфармацыйная і асветніцкая праца, выяўленне інтарэсаў і патрэб патэнцыйных сяброў суполкі.

Даволі нізка запатрабаванае атрыманне кампетэнцый, звязаных з праектнай дзейнасцю і фандрэйзінгам. Трэба прызнаць, што мы не можам быць упэўненымі ў тым, што ўсе рэспандэнты разумелі, пра што ідзе гаворка ў гэтым пытанні, бо падчас інтэрв'ю тэмы праектнай дзейнасці і фандрэйзінгу падымаліся вельмі рэдка.

Таксама трэба адзначыць, з аднаго боку, нізкую значнасць праблемы, звязанай са складанасцямі ў камунікацыі або канфліктамі паміж удзельнікамі суполак, а з іншага, нізкі попыт на навыкі вырашэння канфліктаў і ўменне арганізоўваць абмеркаванне вострых пытанняў. Па выніках інтэрв'ю можна назваць два фактары, якія абумоўліваюць гэтую «неканфліктнасць».

Першы — гэта распаўсюджанасць характару зносін паміж удзельнікамі суполак, які практычна не прадугледжвае ўзаемных абавязкаў, кіраўніцтва і структураванасці і заснаваны на прынцыпе асабістай ініцыятывы. Кожны можа прапанаваць свой парадак дзеянняў, і частка сяброў суполкі можа яго падтрымаць і далучыцца. У гэтым сэнсе глебы для канфліктаў практычна не ўзнікае, бо агульныя рашэнні прымаюцца вельмі рэдка, як правіла, у сувязі з дзейнасцю, якая можа пагражаць іншым сябрам суполкі.

Другі фактар — гэта нешматлікасць актыўнага складу «новых суполак», змяншэнне колькасці людзей і адначасова ўмацаванне сувязі паміж імі, своеасаблівая «прызвычаенасць» адно да аднаго. Найхутчэй, пакуль у актывістаў «новых суполак» не з'явяцца выхады на шырэйшыя аўдыторыі, магчымасці рэальна арганізоўваць больш-менш маштабныя працэсы, якія вымагаюць узгадненняў з шырокім колам (суседзяў, калег, працоўных калектываў), пытанні медыяцыі канфліктаў і арганізацыі дыскусій не будуць мець для іх вялікага значэння, паколькі не выкарыстоўваюцца ў іх штодзённай дзейнасці.

*Дыяграма 2.8. Ацэнка запатрабаванасці новых практычных навыкаў і ўменняў актывістамі «новых суполак», %*




Сярод відаў дапамогі, у якой маюць патрэбу «новыя суполкі», самы запатрабаваны кірунак — забеспячэнне лічбавай бяспекі. Досыць высокі запыт на дапамогу ва ўстанаўленні сувязей з іншымі суполкамі і наладжванні кантактаў з грамадскімі арганізацыямі. Каля трэці рэспандэнтаў указваюць на запатрабаванасць псіхалагічнай дапамогі, а таксама дапамогі і кансультацыі праваабаронцаў па тэмах, звязаных з паводзінамі ў экстранных сітуацыях і дапамозе тым, хто падвяргаецца рэпрэсіям. Такога ж кшталту запыты гучалі і ў свабодных інтэрв’ю з актывістамі «новых суполак».

*Табліца 2.14. Ацэнка актывістамі «новых суполак» запатрабаванасці розных формаў дапамогі і падтрымкі*

| **Якая дапамога патрэбная вашай суполцы, ініцыятыве?** | % |
|---|---|
| Забеспячэнне інфармацыйнай (лічбавай) бяспекі | 50,4 |
| Наладжванне сувязей з іншымі суполкамі, ініцыятывамі такога ж тыпу | 45,7 |

| | |
|---|---|
| Псіхалагічная дапамога, кансультацыі (праца з траўмамі, стрэсам, выгараннем) | 34,7 |
| Дапамога і кансультацыі праваабаронцаў (як паводзіцца ў сітуацыі ператрусу і допыту, як дапамагчы затрыманым ці асуджаным і г.д.) | 33,9 |
| Наладжванне кантактаў з грамадскімі арганізацыямі, згуртаваннямі, асацыяцыямі, прафзвязамі, фондамі, якія займаюцца рознымі тэматычнымі кірункамі | 27,1 |
| Арганізацыйнае развіццё (пабудова эфектыўнай сістэмы кіравання і арганізацыі працэсаў, вызначэнне мэт і стратэгій дзейнасці і г.д.) | 24,1 |
| Юрыдычная дапамога, кансультацыі | 22,6 |
| Тэхнічная дапамога (друк матэрыялаў, абсталяванне, пошук памяшканняў для сустрэч і г.д.) | 21,6 |
| Арганізацыя камунікацыі паміж актывістамі, медыяцыя канфліктаў | 17,8 |
| Фінансавая дапамога | 17,2 |
| Наладжванне сувязей і зносін з мясцовымі ўладамі | 11,2 |
| Цяжка адказаць | 11,0 |
| Нам не патрэбная дапамога | 5,0 |

## ВЫСНОВЫ

Палітычная мабілізацыя 2020 года спарадзіла шэраг сацыяльных эфектаў, адным з якіх стала фармаванне новых тыпаў сувязей і зносін паміж людзьмі — протасуполак розных тыпаў (прафесійных, пакаленчых, мясцовых і г. д.). Гэты працэс масава разгарнуўся ў жніўні—верасні 2020 года і быў досыць хутка купіраваны шляхам жорсткіх рэпрэсій супраць актывістаў і ўдзельнікаў. «Новыя суполкі», якія здолелі выжыць і працягваюць дзейнічаць, адрозніваюцца адно ад аднаго паводле характару і самавызначэння: частка з іх уяўляе сабой чыста «пратэсныя» згуртаванні, якія бачаць сваёй адзінай мэтай змену сітуацыі ў краіне; іншыя самавызначаюцца як падмурак будучай сістэмы самакіравання.

За няпоўны год (з жніўня 2020 да ліпеня 2021 года) «новыя суполкі» прайшлі шлях ад сходу людзей, якія ядналіся падчас пратэснага руху, праз наладжванне больш трывалых сувязей і пошук легальных формаў дзеянняў і «пазітыўнага» плана пераўтварэнняў у сваім полі (мясцовага самакіравання, абароны правоў працаўнікоў ці студэнтаў), да практычна падпольных груп, якія сёння знаходзяцца ў сітуацыі выжывання і зазнаюць жорсткі прэсінг з боку рэжыму.

Асноўныя формы актыўнасці «новых суполак» увесну—ўлетку 2021 года былі звязаны з дапамогай палітвязням і іхнім сем'ям, пашырэннем уласнага кола і інфармацыйнай працай. Паколькі з лета 2021 года да цяперашняга моманту палітычныя ўмовы робяцца ўсё больш жорсткімі, відавочна, што задачы выжывання і ўзнаўлення «новых суполак» захоўваюць актуальнасць.

Запыты актывістаў «новых суполак» на новыя веды і навыкі звязаны пераважна з галінай права, юрыдычнай пісьменнасцю і забеспячэннем бяспекі. Акрамя таго, жыццё пад пастаянным прэсінгам вымагае арганізацыі сістэмы псіхалагічнай дапамогі і кансультацый/трэнінгаў па тэмах, звязаных з паводзінамі ў экстрэмальных сітуацыях (ператрус, допыт, арышт і інш.).

Асноўныя праблемы ў развіцці «новых суполак», акрамя высокага ўзроўню рэпрэсій, гэта адсутнасць разумення, што рабіць у актуальны момант, каб рухацца да дасягнення агульных мэт, і адсутнасць наладжаных сувязей з іншымі суб’ектамі. Наймацней выяўлены сувязі з суполкамі свайго тыпу, а таксама з дыяспарамі і актывістамі, змушанымі з’ехаць з краіны. Узровень узаемадзеяння з АГС і палітычнымі цэнтрамі аднолькава невысокі. Разам з тым, найбольш «атамізаваныя» менавіта лакальныя (тэрытарыяльныя) «новыя суполкі» — прафзвязныя, студэнцкія і прафесійныя суполкі маюць шырэйшае і рэгулярнейшае сеціва ўзаемадзеянняў.

Важную ролю для актывістаў «новых суполак» працягваюць граць грамадзянскія ініцыятывы, якія выконваюць шэраг інфраструктурных функцый, ініцыююць розныя кампаніі, праводзяць адукацыйную і асветніцкую працу: платформа «Голас», ініцыятыва «Сумленныя людзі», кампанія *BY_Help*, Фонд салідарнасці *BYSOL* і інш. Захоўваецца першапачатковая дэцэнтралізаванасць і «гарызантальнасць» пратэснай часткі грамадства, калі палітычныя цэнтры і іншыя інстытуцыялізаваныя структуры ўспрымаюцца як частка агульнага руху, у якім кожны сам вызначае свае дзеянні, а іерархія, узгадненне і кіраванне практычна адсутныя.

## 3. НЕДЗЯРЖАЎНЫЯ МЕДЫЯ Ў БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ПАЛІТЫЧНАГА КРЫЗІСУ

*У гэтай частцы даследавання коратка разглядаецца змена становішча недзяржаўных медыя ва ўмовах палітычнага крызісу ў Беларусі, характар і ўзровень рэпрэсій, разгорнутых супраць незалежных журналістаў і медыя, асноўныя выклікі і праблемы, з якімі яны сёння сутыкаюцца. У сітуацыі інфармацыйнай вайны недзяржаўныя медыя вымушаны вельмі хутка змяняцца, і гэтыя змены закранаюць практычна ўсе аспекты іх функцыянавання — ад змены бізнес-мадэляў, каналаў і спосабаў узаемадзеяння з аўдыторыяй да рэдакцыйнай палітыкі і вызначэння сваёй ролі ў грамадска-палітычнай сітуацыі.*

Беларуская медыясфера зазнала істотныя змены ў сувязі з палітычным крызісам у Беларусі. Інфармацыйная прастора сёння адно з найважнейшых палёў бітвы за грамадскую думку і свядомасць. Найбольшы ўплыў на сённяшні дзень у Беларусі маюць інтэрнэт-медыя, сацыяльныя сеткі і месенджары. Роля тэлебачання і радыё, гэтаксама як і друкаваных медыя, значна паменшала за апошнія гады, і гэта відавочна нават беларускаму рэжыму, які, хоць і з вялікім спазненнем, пачаў спрабаваць актыўна выкарыстоўваць інтэрнэт-каналы і інтэрнэт-платформы для фармавання інфармацыйнага парадку дня і прапаганды.

У рамках дадзенага даследавання мы не прэтэндуем на цэласнае апісанне сітуацыі ў беларускіх медыя. Наша задача — прааналізаваць найважнейшыя змены ў дзейнасці недзяржаўных медыя і выклікі, з якімі яны сутыкаюцца.

Эмпірычную базу для аналізу, акрамя адкрытых крыніц і дадзеных папярэдніх даследаванняў, утвараюць 10 паўструктураваных інтэрв’ю, узятыя ў прадстаўнікоў недзяржаўных медыя: інтэрнэт-медыя, тэлеграм-каналаў, ютуб-каналаў і блогаў. Нягледзячы на досыць невялікую колькасць інтэрв’ю, сярод рэспандэнтаў былі як дасведчаныя рэдактары і журналісты, так і адносна новыя ў сферы людзі, якія працуюць унутры краіны і па-за яе межамі; прадстаўнікі як медыя з шырокім грамадска-палітычным парадкам дня, так і «нішавых», агульнанацыянальных і рэгіянальных, медыя. Інтэрв’ю праводзіліся ў чэрвені 2021 года. Хаця ў наступныя месяцы адбылося шмат новых падзей, звязаных са становішчам недзяржаўных медыя ў краіне, агульныя трэнды развіцця сітуацыі праяўляліся ўжо на момант даследавання.

### 3.1. Змена ролі і стану беларускіх недзяржаўных медыя ў 2020—2021 гадах

Змена ролі недзяржаўных медыя пачала праяўляцца яшчэ ў перыяд крызісу, звязанага з пандэміяй каранавіруса, падчас якога беларускі рэжым абраў стратэгію замоўчвання праблем і ўтойвання інфармацыі. Індыкатарам гэтай змены стала істотнае

пераразмеркаванне ўзроўню грамадскага даверу на карысць недзяржаўных медыя[15], якія актыўна ўдзельнічалі ў пошуку і распаўсюдзе ў грамадстве рознабаковай інфармацыі аб эпідэміялагічнай сітуацыі, асвятлялі ініцыятывы і дзеянні, скіраваныя на збор і аказанне дапамогі, распаўсюджвалі інфармацыю аб мерах самаабароны.

Падчас грамадска-палітычнай мабілізацыі, якая разгарнулася ўвесну—ўлетку 2020 года, нароўні з недзяржаўнымі медыя важную ролю гралі асобныя тэлеграм-каналы і ютуб-блогі[16], якія сталі набываць папулярнасць яшчэ ў 2018—2019 гадах[17]. Месенджар Тэлеграм стаў настолькі важнай пляцоўкай распаўсюду інфармацыі і арганізацыі пратэснай актыўнасці, што падзеі жніўня 2020 года сталі называць «тэлеграм-рэвалюцыяй»[18].

Перыяд перадвыбарчай кампаніі і масавых пратэстаў пасля выбараў карэнным чынам змяніў стан і ролю недзяржаўных медыя ў Беларусі. На хвалі палітычнай мабілізацыі (асабліва пачынаючы з жніўня 2020 года) большая частка інфармацыйнага парадку дня была засяроджаная на палітычных падзеях. Дзяржаўныя медыя канчаткова ператварыліся ў сродак прапаганды, якая стала весціся з парушэннем не толькі журналісцкіх стандартаў і маральных нормаў, але і дзейнага заканадаўства Беларусі. Недзяржаўныя медыя, якія ўключыліся ў асвятленне паслявыбарчых пратэстаў, адразу трапілі пад жорсткі прэсінг, які ў розных формах працягваецца дагэтуль.

Асноўнымі формамі ціску на медыя ўлетку—ўвосень 2020 года былі блакаванне сайтаў і пераслед журналістаў, якія асвятлялі вулічныя пратэсты. Вельмі хутка статус журналіста перастаў бараніць. Да журналістаў, якія працавалі на месцах падзей, сталі ставіцца як да звычайных удзельнікаў акцый пратэсту (а значыць «незаконных масавых мерапрыемстваў»): затрымлівалі, прысуджалі адміністрацыйныя пакаранні, штрафы ці «содні». Падзеяй, якая канчаткова замацавала «адмену» журналісцкага статусу, стала крымінальная справа, распачатая супраць журналістак «Белсату» Дар'і Чульцовай і Кацярыны Андрэевай, якія вялі стрым з акцыі пратэсту 15 лістапада. Выкананне імі прафесійных абавязкаў было прыраўнавана да арганізацыі акцый пратэсту, у выніку чаго ім прысудзілі два гады зняволення. Іншай знакавай падзеяй, якая дэманструе стаўленне ўлады да незалежнай журналістыкі, стала справа аб «0 праміле», па якой журналістка

---

15 Беларусское общество в ситуации эпидемии COVID-19: реакция на кризис (с. 16) // https://cet.eurobelarus.info/files/userfiles/5/CET/2020_COVID-19_Opinion_poll_Belarus.pdf; «Что мотивирует участников уличных акций — исследование» // https://reform.by/184090-chto-motiviruet-uchastnikov-ulichnyh-akcij-issledovanie.

16 Herasimenka, Aliaksandr, Lokot, Tetyana, Onuch, Olga, and Wijermars, Mariëlle. There's more to Belarus's 'Telegram Revolution' than a cellphone app. *Washington Post*, Sep. 11 (2020).

17 Marples, David R. «Stalin's Ghosts, Parasites, and Pandemic: The Roots of the 2020 Uprising in Belarus: 2021 Annual London Lecture on Belarusian Studies.» *Journal of Belarusian Studies. 2021, Vol. 11, Issue 1, p. 5-26. 22 p.*

18 Гл. «Мессенджер *Telegram* как средство коммуникации и самоорганизации в ситуации политического кризиса в Беларуси» // https://cet.eurobelarus.info/ru/library/publication/2020/11/27/messendzher-telegram-kak-sredstvo-kommunikatsii-i.html.

*Tut.by* Кацярына Барысевіч была асуджаная на 6 месяцаў зняволення за публікацыю праўдзівай інфармацыі па справе Рамана Бандарэнкі.

2 кастрычніка 2020 года Міністэрства замежных спраў Беларусі абвясціла аб увядзенні новага палажэння аб акрэдытацыі журналістаў замежных выданняў, якое нібыта мелася палегчыць атрыманне акрэдытацый. Аднак у выніку ўсе дзейныя на той момант акрэдытацыі анулюваліся, і большасць запытаў незалежных медыя на атрыманне новых[19] не былі задаволены[20].

Ціск і рэпрэсіі былі скіраваны не толькі супраць прадстаўнікоў медыя, але і супраць блогераў, адміністратараў тэлеграм-каналаў і чатаў. Праз арышты, блакаванні і ўзломы каналаў большая частка папулярных блогераў і вядоўцаў тэлеграм-каналаў вымушана з’ехалі з краіны і сёння працягваюць сваю дзейнасць з-за мяжы. На 5 кастрычніка 2021 года «экстрэмісцкімі» былі прызнаны 86 тэлеграм-каналаў, 135 тэлеграм-чатаў і 5 ботаў (і гэты спіс расце ледзь не штодня)[21] — за адміністраванне гэтых каналаў і чатаў і распаўсюд іх інфармацыі пагражае крымінальная адказнасць.

Увесну—улетку 2021 года рэпрэсіі супраць недзяржаўных медыя набылі інстытуцыянальны характар. У траўні быў заблакаваны сайт найбуйнейшага недзяржаўнага беларускага інтэрнэт-медыя *Tut.by* (статуса медыя гэты партал быў пазбаўлены яшчэ ў снежні 2020 года, аднак працягваў працаваць). 18 траўня адбылася серыяператрусаў у супрацоўнікаў партала, былі затрыманы 15 асоб, 11 з іх дагэтуль застаюцца ў зняволенні. 8—9 ліпеня 2021 года па ўсёй краіне прайшоў шэраг ператрусаў у прадстаўнікоў недзяржаўных медыя, які суправаджалася арыштамі. У гэтую хвалю трапілі адзін з найстарэйшых незалежных медыя Беларусі «Наша Ніва» і цэлы шэраг рэгіянальных медыя.

18 жніўня ператрусы і арышты прайшлі ў супрацоўнікаў найбуйнейшага недзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва «БелаПАН»; галоўны рэдактар і дырэктар агенцтва былі арыштаваны. 23 жніўня была ліквідаваная Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ).

Нягледзячы на рэпрэсіі, недзяржаўныя медыя, гэтаксама як і іншыя медыйныя каналы, працягваюць сваю дзейнасць і іх роля не меншае. Наадварот, са знікненнем пратэснай актыўнасці «з вуліц» інфармацыйнае поле робіцца бадай адзіным полем палітычнага супрацьстаяння.

Павелічэнне ролі медыя выразна ўсведамляюць і самі прадстаўнікі медыя, якія за гэты год адчулі сябе значнымі ўдзельнікамі грамадска-палітычных працэсаў. Шмат якія

[19] https://www.dw.com/ru/беларусь-аннулировала-аккредитацию-журналистов-иностранных-сми/a-55139050.
[20] Гл., напрыклад, https://baj.by/ru/content/mid-ne-akkreditoval-ni-odnogo-zhurnalista-evroradio.
[21] Улік вядзецца на сайтах Мінюсту (Экстремистские материалы // http://mininform.gov.by/documents/respublikanskiy-spisok-ekstremistskikh-materialov/) і МУС (Экстремистские формирования // https://www.mvd.gov.by/m/ru/news/8642).

медыя былі змушаны цалкам перабудаваць сваю працу — ад парадку дня, каналаў распаўсюду інфармацыі, спосабаў узаемадзеяння з аўдыторыяй да крыніц фінансавання і фізічнай рэлакацыі рэдакцый.

Выбухны рост увагі да грамадска-палітычнага парадку дня ў жніўні 2020 года прывёў да таго, што большая частка кантэнту недзяржаўных медыя была прысвечана менавіта яму. Шмат для якіх медыя, асабліва нішавых, гэта стала сур'ёзнай праблемай, бо ў сітуацыі масавай палітызацыі захоўваць свой інфармацыйны парадак дня было практычна немагчыма. Акрамя таго, вельмі хутка стала зразумела, што трэба рабіць выбар: асвятляць палітычныя падзеі і захоўваць аўдыторыю — ці берагчы свае рэсурсы ад блакаванняў, а каманду ад рэпрэсій.

Устойлівая цікавасць да палітычнага парадку дня захоўвалася да канца 2020 года. Пасля таго, як палітычны крызіс яўна перайшоў у зацяжную фазу, інфармацыйны парадак дня стаў менш аднародным. Прадстаўнікі недзяржаўных медыя тлумачаць гэта «стомай ад негатыву» і расчараваннем, бо хуткія змены не адбыліся. Разам з тым, яны адзначаюць, што цікавасць да палітычнага парадку дня захоўваецца, аўдыторыя чуйна рэагуе на новыя падзеі (пасадку самалёта з Раманам Пратасевічам у Мінску, новыя санкцыі, узмацненне жорсткасці рэпрэсій і інш.[22]).

Характар палітычных падзей і сучасныя ўмовы працы журналістаў прыводзяць да таго, што кантэнт, звязаны з палітычным крызісам, у значнай ступені дублюецца рознымі медыя. Рэгіянальныя медыя ў большай ступені спрабуюць акцэнтаваць увагу на падзеях, якія адбываюцца менавіта ў іх рэгіёне, аднак з прычыны абмежаваных рэсурсаў і доступу да інфармацыі гэта не заўсёды проста. Акрамя чыста навіновага кантэнту, адзначаецца пэўны, хоць і не масавы, рост запатрабаванасці аналітычных і публіцыстычных матэрыялаў, звязаных з інтэрпрэтацыяй і рэфлексіяй над грамадска-палітычнай сітуацыяй і перспектывамі яе развіцця. Паказчыкам гэтага можна лічыць папулярнасць відэаблогаў падобнай скіраванасці — напрыклад, «Чалы LIVE», «MINSKI», «BalaganOFF».

На сённяшні дзень складана ацаніць ахоп аўдыторыі і колькасныя характарыстыкі цікавасці да розных тэм і праблем, па-першае, з прычыны шматлікасці каналаў распаўсюду інфармацыі, па-другое, праз развіццё шматплатформеннасці недзяржаўных медыя. Ва ўмовах сталага прэсінгу за мінулы год істотна змяніліся каналы распаўсюду кантэнту[23]. Блакаванне інтэрнэт-сайтаў і новыя трэнды медыяспажывання прывялі да таго, што традыцыйная схема, якая выкарыстоўваецца шмат якімі інтэрнэт-медыя, практычна «перакулілася». Калі раней сацыяльныя сеткі найчасцей выступалі дадатковым інструментам прыцягнення аўдыторыі на сайт, то цяпер яны (асабліва Telegram і Instagram)

[22] Гл. падрабязней пра сітуацыю з пасадкай самалёта *Ryanair* і Р. Пратасевічам на https://www.bbc.com/news/world-europe-57239521.
[23] *Digital Skills Coalition Belarus* (2021). Презентация и обсуждение исследования «Медиапотребление и медиаграмотность в Беларуси в августе 2021»: http://digitalskills.by/2021/10/08/prezentatsiya-i-obsuzhdenie-issledovaniya-mediapotreblenie-i-mediagramotnost-v-belarusi-v-avguste-2021/.

— гэта асобны, амаль аўтаномны кірунак працы шмат якіх медыя, які мае самастойную каштоўнасць і аўдыторыю. Акрамя таго, у гэты перыяд адбываецца чарговы ўсплёск цікавасці да YouTube, які таксама актыўна выкарыстоўваецца як медыя, так і асобнымі суполкамі (напрыклад, «купалаўцамі») і блогерамі.

## 3.2. Узаемадзеянне з іншымі актарамі

Узаемадзеянне недзяржаўных медыя з іншымі актарамі значна змянілася. Практычна спынілася ўзаемадзеянне ў любой форме з дзяржаўнымі структурамі любога ўзроўню. Доступ на мерапрыемствы з удзелам высокапастаўленых службовых асоб для незалежных медыя заўсёды быў цяжкі, але пасля жніўня 2020 года ён цалкам заблакаваны. З розных прычын блакуецца доступ недзяржаўных медыя ў суды, не выдаюцца акрэдытацыі на асвятленне значных мерапрыемстваў, за выняткам асобных сітуацый, арганізаваных з прапагандысцкай мэтай (такіх як прэс-канферэнцыя з удзелам Рамана Пратасевіча 14 чэрвеня 2021 года).

Аднак працэс «адгароджвання» ад недзяржаўных медыя значна глыбейшы. Ён ідзе на ўсіх узроўнях: прадстаўнікі рэгіянальных медыя расказваюць, што іх журналістаў не пускаюць нават на адкрытыя мерапрыемствы ў школах або забаўляльныя мерапрыемствы дзяржаўных устаноў культуры. Чыноўнікі ўсіх узроўняў практычна цалкам спынілі кантакты з прадстаўнікамі недзяржаўных медыя; доступ да інфармацыі дзяржаўных органаў, каментары ці адказы на запыты атрымаць стала немагчыма *(«яны кажуць: ніякіх каментароў, чытайце ў газеце, шукайце на БелТА»)*. Забарона на падачу інфармацыі дзейнічае на ўсіх узроўнях *(«на афіцыйным узроўні забаронена ажно да аддзела культуры даваць любыя каментары незалежным парталам»)*.

Змянілася ўзаемадзеянне медыя з бізнесам, але тут ёсць розныя аспекты. У камерцыйным вымярэнні аб'ёмы рэкламнага рынку сталі меншаць яшчэ з пачаткам пандэміі COVID-19. Акрамя таго, некаторыя бізнесы сталі баяцца размяшчаць рэкламу ў недзяржаўных медыя (а дзяржаўныя прадпрыемствы і арганізацыі, а таксама і тыя прадпрыемствы, што маюць долю дзяржавы ва ўласнасці, атрымалі на гэта прамую забарону). Аднак некаторыя бізнесмены і кампаніі падтрымліваюць асобныя медыя ці медыя-праекты праз прамыя датацыі, спонсарства, але не публічна. Акрамя таго, некаторыя прадстаўнікі медыя адзначаюць, што ў зносінах з бізнесам з'явілася *«больш павагі, больш добразычлівасці»*, бо пад уплывам палітычных падзей бізнес ацаніў ролю медыя не толькі як канала для прасоўвання інфармацыі і рэкламы, але і як грамадскага інстытута.

Змена ўзаемадзеяння з арганізацыямі і ініцыятывамі грамадзянскай супольнасці мае дваякі характар. З аднаго боку, інтэнсіўнасць узаемадзеяння з традыцыйнымі АГС (грамадскімі арганізацыямі, асацыяцыямі, фондамі і г.д.) знізілася. На гэта паўплывалі некалькі фактараў: палітызацыя інфармацыйнага парадку дня, якая выцясняе іншыя

тэматычныя пытанні; зніжэнне актыўнасці саміх АГС і самацэнзура ўвосень—узімку 2020 года; рэпрэсіі супраць АГС, ліквідацыя арганізацый і ўстаноў, ад'езд шэрагу актывістаў за мяжу і выпадзенне іх з актыўнай дзейнасці. З іншага боку, значна ўзрасла цікавасць медыя да інфармацыі праваабарончых арганізацый. Інфармацыя праваабарончага цэнтру «Вясна» і іншых праваабаронцаў займае сталае месца ў парадку дня недзяржаўных медыя. Не ў такой ступені, аднак таксама сталымі крыніцамі інфармацыі і фармавання навінавага парадку дня служаць грамадзянскія ініцыятывы, якія ўзніклі ўжо падчас палітычнага крызісу: *BY_Help*, *BYSOL*, «Сумленныя людзі», «Голас», «Белые халаты» ды інш.

Амаль усе рэспандэнты даследавання адзначалі змену ў зносінах недзяржаўных медыя, рэдакцый і журналістаў міжсобку. Сітуацыю да 2020 года шмат хто апісвае як сітуацыю канкурэнцыі, аднак цяпер пытанні канкурэнцыі, першынства сыходзяць на другі план, а на першы выходзяць узаемнае падтрымка і «*адчуванне локця*». Адным з фактараў гэтых змен выступае разбурэнне эканамічнай базы функцыянавання недзяржаўных медыя. Змагацца за ахопы і рынак рэкламы цяпер немагчыма, усе бізнес-стратэгіі, якія старанна фармаваліся раней, робяцца неактуальнымі — адпаведна, гэтае вымярэнне канкурэнцыі страчвае значэнне. Аднак, вядома, асноўная прычына — гэта супольнасць сітуацыі і салідарнасць у процівагу рэпрэсіям, што абрынуліся на медыя. У якасці ўзаемнай дапамогі беларускія медыя не толькі праводзяць кампаніі салідарнасці, але і «працаўладкоўваюць» да сябе журналістаў медыя, пазбаўленых статусу, дапамагаюць адно аднаму з акрэдытацыямі, абменьваюцца матэрыяламі і інфармацыяй і г.д. Безумоўна, час ад часу здараюцца традыцыйныя для гэтага асяроддзя канфлікты (першынства ў апублікаванні навіны, аўтарскія правы ў выпадку рэпублікацыі, правільныя спасылкі і да т. п.), аднак яны практычна ніколі не выносяцца ў публічную прастору.

Значным трэндам стала змена зносін медыя са сваёй аўдыторыяй. Пераход да актыўнейшага выкарыстання сацыяльных сетак як аўтаномнага канала дастаўкі кантэнту выклікае неабходнасць арганізоўваць дадатковую працу па камунікацыі з карыстальнікамі, ствараць і падтрымліваць суполку, а гэта шмат для якіх медыя зусім новы кірунак працы. Акрамя таго, значна павялічылася доля кантэнту, згенераванага карыстальнікамі, і з пагаршэннем умоў працы журналістаў, рэлакацыі рэдакцый яна ўсё больш расце.

### 3.3. Асноўныя выклікі і праблемы, з якімі сутыкаюцца сёння недзяржаўныя медыя

Галоўная крыніца выклікаў для недзяржаўных медыя сёння — гэта, безумоўна, устаноўка беларускага рэжыму на поўнае знішчэнне незалежных ад яго сродкаў масавай інфармацыі і каналаў уплыву на грамадскую думку. У сітуацыі прававога дэфолту ўжываюць любыя меры: ўзмацненне заканадаўства, перасслед супрацоўнікаў медыя, блогераў, адміністратараў каналаў у сацыяльных сетках, сфабрыкаваныя адміністрацыйныя і крымінальныя справы, блакаванне сайтаў інтэрнэт-медыя і пазбаўленне друкаваных медыя магчымасці распаўсюду праз падпіску і праз пункты гандлю, абвяшчэнне асобных матэрыялаў ці медыя і каналаў «экстрэмісцкімі» і да т. п. Гэта вызначае поле праблем, з

якімі сёння сутыкаюцца недзяржаўныя медыя (прычым практычна незалежна ад парадку дня, які яны асвятляюць).

**Змена крыніц фінансавання і недахоп фінансавых рэсурсаў.** Для большасці недзяржаўных медыя, якія мелі выпрацаваныя за апошнія гады бізнес-мадэлі, зарабляючы на рэкламе, падпісцы і г.д., ранейшыя крыніцы фінансавання або рэзка звузіліся, або сталі недаступнымі. Гэта ставіць рэдакцыі на мяжу выжывання, не дазваляючы забяспечваць працу ў нармальным рэжыме. Акрамя таго, палітычныя рэпрэсіі прыводзяць да з'яўлення новых «артыкулаў расходаў», звязаных з аплачваннем штрафаў, набыццём новай тэхнікі ўзамен канфіскаванай падчасператрусаў і арыштаў, набыццём праграмнага забеспячэння і аплатай працы спецыялістаў, якія забяспечваюць лічбавую бяспеку і даступнасць кантэнту, выдаткамі на рэлакацыю супрацоўнікаў і забеспячэннем іх дзейнасці па-за Беларуссю.

**Кадравыя праблемы** звязаны перадусім з палітычнымі рэпрэсіямі, падчас якіх беларуская журналістыка нясе як прамыя (супрацоўнікі медыя, якія знаходзяцца ў зняволенні), так і ўскосныя кадравыя страты, звязаныя з вымушаным ад'ездам журналістаў і рэдакцый з Беларусі і з высокімі рызыкамі працы ў недзяржаўных медыя ўнутры краіны. Другая прычына — фінансавыя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца сёння недзяржаўныя медыя. Нарэшце, для супрацоўнікаў незалежных медыя, гэтаксама як і для грамадзянскіх актывістаў, вельмі актуальная праблема псіхалагічнага выгарання. Людзі сыходзяць з прафесіі, не даючы рады неабходнасці працаваць ва ўмовах пастаяннага ціску і стрэсу.

У апошнія два-тры месяцы гэтая праблема пагаршаецца праз рэлакацыю рэдакцый і супрацоўнікаў недзяржаўных медыя. Сітуацыя робіцца парадаксальнай: з аднаго боку, спецыялістаў, якія застаюцца ў Беларусі, усё менш, з іншага — яны трапляюць у сітуацыю своеасаблівай дыскрымінацыі на рынку працы. Паколькі праца ў Беларусі звязаная з высокімі рызыкамі, рэдакцыям зручней і бяспечней супрацоўнічаць са спецыялістамі, якія знаходзяцца за межамі краіны, па-за зонай дзейнасці рэпрэсіўных органаў.

**Доступ да інфармацыі.** Як мы ўжо пісалі вышэй, недзяржаўныя медыя сёння практычна не маюць доступу да інфармацыі дзяржаўных органаў, магчымасці атрымліваць каментары ці адказы на запыты ад беларускіх чыноўнікаў любога ўзроўню; іх прадстаўнікам не даюць акрэдытацыі для асвятлення мерапрыемстваў, знаходзячы розныя зачэпкі, каб не пускаць нават туды, дзе акрэдытацыя не патрэбная. Аднак гэтае не адзінае вымярэнне абмежавання доступу да інфармацыі. Практыка прыраўноўвання журналістаў і рэпарцёраў да ўдзельнікаў падзей практычна пазбаўляе іх магчымасці бяспечна асвятляць любыя падзеі ў краіне. Рэпрэсіі супраць нязгодных з беларускім рэжымам маюць вынікам тое, што ўдзельнікі падзей, эксперты, спецыялісты часта адмаўляюцца кантактаваць з медыя і даваць інфармацыю нават на ўмовах захавання ананімнасці.

**Развіццё кампетэнцый і забеспячэнне новых кірункаў,** звязаных са зменай каналаў, крыніц інфармацыі і спосабу ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Рост значнасці сацыяльных сетак у рабоце недзяржаўных медыя, выкарыстанне новых фарматаў часам

вымагае хуткага абнаўлення кампетэнцый, новых навыкаў, звязаных з выбудовай камунікацыі з аўдыторыяй, выкарыстаннем новых сродкаў стварэння і прасоўвання кантэнту. Павелічэнне долі карыстальніцкага кантэнту таксама вымагае выбудовы дадатковага функцыяналу — з аднаго боку, маральна-псіхалагічнага заахвочвання карыстальнікаў, якія пастаўляюць інфармацыю, вядзення каналаў і суполак, якія стымулююць гэты працэс, а з іншага, фактчэкінгу і апрацоўкі інфармацыі, якая пастаўляецца карыстальнікамі.

**Рэдакцыйная палітыка і журналісцкія стандарты.** Новыя ўмовы вымагаюць шмат ад якіх недзяржаўных медыя перагляду рэдакцыйнай палітыкі. Павышэнне значнасці ролі незалежных медыя ў сітуацыі пралангаванага палітычнага крызісу, з аднаго боку, і фактычны пераход у становішча інфармацыйнай вайны, з іншага, вымагаюць ад медыя новых падыходаў і падстаў для вызначэння іх парадку дня, выбару прыярытэтаў, інфармацыйных нагод, спікераў і экспертаў, разумення, на якую аўдыторыю арыентавацца, *tone of voice* (танальнасці, якой прытрымліваецца медыя ў камунікацыі з аўдыторыяй), працэдур фактчэкінгу, захавання журналісцкіх стандартаў.

## 3.4. Актуальныя патрэбы і формы падтрымкі

**Інстытуцыйная падтрымка.** У сітуацыі выжывання, у якой апынуліся сёння шмат якія беларускія недзяржаўныя медыя, патрэбная падтрымка на пакрыццё інстытуцыйных выдаткаў, якія забяспечваюць нармальнае функцыянаванне: арэнду, выдаткі на тэхнічнае і праграмнае забеспячэнне, зарплаты супрацоўнікам і інш. Журналістам і рэдакцыям, якія застаюцца ў Беларусі, важна забяспечыць магчымасць замены канфіскаванай тэхнікі, а таксама дапамогу рэпрэсаваным прадстаўнікам медыя і іхнім сем’ям. Рэдакцыям і прадстаўнікам недзяржаўных медыя, якія вымушана з’ехалі з краіны, неабходная дапамога ва ўладкаванні і адаптацыі.

**Юрыдычная дапамога** тым медыя і журналістам, якія застаюцца ў краіне (аплата працы адвакатаў, кансультацыі для рэдакцый і юрыдычных асоб, якія трапляюць пад праверкі ці зазнаюць іншыя формы ціску), і тым, хто быў вымушаны рэлакавацца (кансультацыі датычна рэгістрацыі юрыдычных асоб, фінансавых механізмаў, асаблівасцей заканадаўства, падаткаабкладання і да т. п.).

**Псіхалагічная дапамога** ў стрэсавых сітуацыях, забеспячэнне рэкрэацыі і аднаўлення чалавечага рэсурсу (стажыроўкі і проста «перадых» за межамі краіны для прадстаўнікоў медыя, якія працуюць у Беларусі), псіхалагічная адаптацыя для рэлакантаў.

**Стварэнне і падтрымка інфраструктуры** для арганізацыі каманд, раскіданых па розных краінах: часовыя «студыі», адмысловыя каворкінгі, «хабы» для журналістаў.

**Навучанне і новыя кампетэнцыі.** Адзначаецца недахоп менеджарскіх кампетэнцый і ўвогуле нястача менеджараў (выкліканая, з аднаго боку, апошняй хваляй рэпрэсій, скіраваных якраз супраць кіраўніцтва і менеджменту недзяржаўных медыя, а з іншага — зменлівымі ўмовамі, якія вымагаюць менеджарскіх навыкаў іншага ўзроўню). Падчас інтэрв'ю з прадстаўнікамі медыя згадваліся таксама неабходнасць развіваць кам'юніці-менеджмент, навыкі працы з аўдыторыяй і суполкамі, тэхнічныя навыкі, звязаныя з засваеннем новых фарматаў (напрыклад, павышэнне ролі відэакантэнту вымагае хуткага навучання здымкам і мантажу), а таксама засвойваць новыя бізнес-мадэлі і фінансавыя інструменты (як зарабляць у сацыяльных сетках, правільна арганізаваць сістэму данатаў і г.д.).

Некаторыя рэспандэнты выказвалі скепсіс адносна актуальнасці традыцыйных адукацыйных праграм у галіне журналістыкі («*Шмат чаго з адукацыйных рэчаў, што існуюць — курсы, лекцыі — вельмі добрыя ў сітуацыі рэальнай журналістыкі, а не ў сітуацыі журналістыкі выжывання ці "журналістыкі пад прыцэлам"*»). Таксама, на думку рэспандэнтаў, пераацэньваецца значнасць навучання навыкам лічбавай бяспекі, якой, безумоўна, трэба надаваць увагу, усведамляючы, што ў сітуацыі поўнага грэбавання прававымі нормамі (калі «*рэжым ламае не паролі, а пальцы*», паводле выразу аднаго з рэспандэнтаў), ніякія меры не могуць быць на 100% эфектыўнымі.

## ВЫСНОВЫ

Падзеі 2020 года кардынальна змянілі сферу недзяржаўных медыя ў Беларусі. Змяніліся не толькі іх роля і парадак дня, але і зносіны з іншымі актарамі, спосабы функцыянавання і бізнес-мадэлі. Медыйнае поле сёння адно з найважнейшых у разгортванні палітычнага супрацьстаяння, таму недзяржаўныя медыйныя рэсурсы зазнаюць жорсткія рэпрэсіі — ад пераследу асобных журналістаў, блогераў, адміністратараў каналаў і пабlікаў у сацыяльных сетках і месенджарах да інстытуцыянальных рэпрэсій, якія пагражаюць знішчэннем незалежнай журналістыкі ў Беларусі ўвогуле.

На паверхні ляжаць рэсурсныя праблемы, з якімі сёння сутыкаюцца недзяржаўныя медыя, — найперш, недахоп фінансавых і кадравых рэсурсаў, а таксама складанасці, звязаныя з вымушанай рэлакацыяй журналістаў і рэдакцый. Аднак не менш значная праблема абмежавання доступу да інфармацыі, а таксама неабходнасць істотна пераладжваць сваю дзейнасць. Апошняе вымагае ў тым ліку развіцця кампетэнцый і забеспячэння новых кірункаў, звязаных са зменай каналаў, крыніц інфармацыі і спосабу ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Асобны выклік для недзяржаўных медыя сёння — гэта пераасэнсаванне сваёй ролі ў грамадска-палітычнай сітуацыі і звязаная з гэтым неабходнасць карэктавання рэдакцыйнай палітыкі, новых падыходаў і падстаў для вызначэння парадку дня, зносін з іншымі суб'ектамі і актарамі.

Самыя актуальныя кірункі падтрымкі недзяржаўных медыя сёння — гэта інстытуцыйная, юрыдычная і псіхалагічная дапамога, развіццё інфраструктуры для забеспячэння рэдакцыйных каманд, раскіданых па розных краінах. У галіне навучання і развіцця традыцыйныя журналісцкія адукацыйныя праграмы хутчэй не рэлевантныя. Запатрабаванае навучанне медыяменеджменту, а таксама наборы тэхнічных навыкаў і кампетэнцый, канкрэтны змест якіх хутка змяняецца разам са зменай сітуацыі. Гэта значыць, што адукацыйныя або трэнінгавыя праграмы ў гэтай галіне сёння павінны быць наладжаны максімальна гнутка, каб адказваць на актуальныя выклікі і патрэбы недзяржаўных медыя.

## 4. РОЛЯ І МЕСЦА БІЗНЕСУ Ў ГРАМАДСКІХ ТРАНСФАРМАЦЫЯХ 2020—2021 ГГ.

*У дадзеным раздзеле аналізуецца погляд бізнесу на існую сітуацыю і яго ролю ў ёй. Па выніках праведзеных інтэрв'ю робяцца высновы аб стане бізнес-арганізацый, іх рэакцыі на палітычны крызіс, на змены зносін з іншымі сектарамі. Таксама выдзяляюцца праблемы, з якімі сутыкаецца беларускі бізнес, і яго асноўныя патрэбы.*

Наша невялікае даследаванне ролі і месца бізнесу ў трансфармацыях 2020—2021 гадоў мела на мэце высветліць уяўленні бізнес-супольнасці аб актуальнай сітуацыі, сваім месцы ў сацыяльна-палітычных трансфармацыях і ўзаемадзеянні з іншымі суб'ектамі. Цяжкасць падобнага вывучэння палягае ў тым, што бізнес — гэта вялікая і вельмі разнастайная група людзей і не існуе інстытуцый, якія маглі б абгрунтавана і рэпрэзентатыўна гаварыць ад імя бізнесу. Часткова такія суб'екты — гэта бізнес-звязы і бізнес-асацыяцыі, аднак яны яднаюць досыць невялікі адсотак бізнес-структур. Высвятленне меркавання бізнесу было ўскладненае як гэтай акалічнасцю, так і складанасцю пошуку рэспандэнтаў, гатовых гаварыць на тэмы, якія нас цікавяць.

Эмпірычнай базай для даследавання служаць 7 інтэрв'ю, праведзеных у чэрвені—ліпені 2021 года. Рэспандэнтамі сталі прадстаўнікі бізнес-звязаў на нацыянальным і рэгіянальным узроўні, бізнес-асацыяцый, стартап-хаба і даследчага цэнтра.

### 4.1. Агульная характарыстыка сітуацыі

Даследчы цэнтр ІПМ, які праводзіць і публікуе штомесячны маніторынг бізнес-настрояў (IPM-*індэкс*), у апошняй справаздачы[24] за чэрвень 2021 года адзначае, што значэнне гэтага індэкса знаходзіцца ў зоне спаду (бізнес прагназуе пагаршэнне сітуацыі). Называюцца наступныя топ-5 перашкод для пашырэння дзелавой актыўнасці:

- высокая няпэўнасць эканамічнага асяроддзя;
- недавер да прававой сістэмы;
- макраэканамічная нестабільнасць;
- нізкі попыт;
- нястача кваліфікаванага персаналу і менеджменту.

Таксама рэспандэнты апытанняў Цэнтра вельмі высока ацэньваюць існыя рызыкі для вядзення бізнесу — на 4,53 па пяцібальнай сістэме. Гэта максімальны ўзровень з пачатку назіранняў у кастрычніку 2020 года. (Для параўнання: у кастрычніку 2020 года гэты паказальнік складаў 4,4 бала, а ў снежні — 4,36.)

[24] http://www.research.by/analytics/index/2106/.

Паводле даследавання[25] кампаніі *SATIO* (лістапад—снежань 2020 года), палітычны крызіс у краіне, паводле ацэнкі рэспандэнтаў, прынёс і прыносіць бізнесу больш праблем, чым пандэмія. Паводле звестак даследавання *BelBiz* («Імагуру»)[26], да вясны 2021 года 58% беларускіх стартапаў з’ехалі з краіны. Чвэрць беларускіх заснавальнікаў стартапаў, якія з’ехалі, не плануюць вяртацца ў Беларусь. Для астатніх асноўная ўмова вяртання ў Беларусь — гэта дэмакратычныя перамены. Паводле апытання ўласнікаў і дырэктараў беларускіх IT-кампаній, праведзенага ў кастрычніку 2021 года *Belarus IT Companies Club*[27], штат супрацоўнікаў за мяжой у параўнанні з 2020 годам павялічыўся ў 51% рэспандэнтаў; кампаніі адчуваюць сур’ёзны адток кадраў; шмат якія кампаніі займаюцца частковай рэлакацыяй (30% ужо вывезлі частку каманды або ў працэсе рэлакейту, 22% плануюць гэта зрабіць). Працягвае павышацца ўзровень песімізму ў ацэнцы бізнес-клімату ў Беларусі: 80% рэспандэнтаў лічаць, што ўмовы для IT-бізнесу пагоршацца.

На думку рэспандэнтаў з бізнес-арганізацый, бізнес падышоў да шэрагу крызісаў 2020—2021 гадоў як ужо сфармаваны сацыяльны інстытут. Ён рэалізаваўся як з’ява і пасталеў. Дакрызісная сітуацыя (да 2020 года) ацэньваецца, вядома, як больш спрыяльная для вядзення бізнесу, хаця дзелавым людзям усё адно даводзілася выжываць у не самым спрыяльным асяроддзі. Бізнес заўсёды знаходзіўся ў стане адначасова і канфлікту, і дзелавога ўзаемадзеяння з дзяржавай.

Стан сталасці бізнесу выявіўся і ў яго гуманітарным і сацыяльным уплыве — праз дабрачыннасць, супрацу з грамадзянскай супольнасцю і дзяржавай у значных для грамадства праектах. Адначасова гэта і індыкатар стану грамадства: калі бізнес і грамадства ў стане зразумець важнасць, напрыклад, культурных праектаў або адаптацыі людзей з асаблівасцямі і выдзяляюць на гэта час і рэсурсы, то гэта паказчык разумення бізнесам сваёй ролі ў грамадстве, якая не зводзіцца выключна да атрымання прыбытку і платы падаткаў.

Падзеі 2020 і асабліва 2021 года як ніколі раней актуалізавалі дылему «бізнес або палітыка». На гэты выклік у бізнесу няма адзінага адказу. Шмат хто лічыць, што ў большасці сваёй бізнес як быў, так і застаўся (прынамсі, імкнецца быць) нейтральным і непрыкметным, імкнучыся выжываць і зарабляць у той сістэме і ў тых умовах, якія ёсць. Аднак знайшліся асобы і арганізацыі, якія далі іншы адказ на гэтае пытанне — тыя, хто так ці інакш паўдзельнічаў у выбарчай кампаніі ці ў пратэстах. Дзякуючы такім прыкладам існуе меркаванне, што бізнес зрабіўся важнейшым, прыкметнейшым, актыўнейшым, што ён агучыў сваю пазіцыю і зрабіўся актарам у палітычным працэсе. Бізнес-супольнасць удзельнічала як у працэсах, звязаных з пандэміяй, дапамогай медыкам (фінансамі, рознымі валанцёрскімі ініцыятывамі — на фоне першапачатковага адмаўлення факта пандэміі з боку дзяржавы) і арганізацыяй дыстанцыйнай працы, так і — у нейкай ступені — у палітычных

[25] https://drive.google.com/file/d/1LEO-dnzie7lalnuqHy_rUy0w_AIwRK8u/view.
[26] https://thinktanks.by/publication/2021/09/29/imaguru-startapy-belarusi-za-god-okazalis-v-novoy-realnosti.html.
[27] https://www.bicc.co/news/kak-idut-dela-u-it-kompanij-v-2021-godu-opros-belarus-it-companies-club-v-oktjabre.

працэсах 2021 года. Гэты ўдзел звычайна быў не скаардынаваны, а проста выражаў пазіцыі асобных людзей — кіраўнікоў, уласнікаў бізнесу або супрацоўнікаў кампаній. Часта гэты ўдзел ажыццяўляўся непублічна, у розных формах (талерантнасць да «няправільных» супрацоўнікаў і нават спроб страйкаў, дапамога розным ініцыятывам або палітычным суб'ектам і інш.). За гэта палітычна і грамадзянска актыўны бізнес «заплаціў» праверкамі і закрыццямі. Аднак шмат кампаній, якія трапілі пад рэпрэсіі, здолелі адрадзіцца, адкрыўшы іншую юрыдычную асобу або змяніўшы назву, уласнікаў і г.д.

Буйны бізнес, на думку некаторых рэспандэнтаў, «маўклівейшы», бо ён знаходзіцца пад большай увагай дзяржавы. З іншага боку, малы бізнес лягчэй закрыць праз шырокі набор сродкаў, якія ёсць у розных дзяржаўных інстытуцый, уключаючы праверкі і буйныя штрафы.

Такім чынам, уплыў крызісаў на бізнес, несумненна, ёсць і ўмовы для вядзення бізнесу сур'ёзна пагоршыліся ў параўнанні з 2019 годам. Аднак бізнесу ўласцівыя гнуткасць і «выжывальнасць» (*«у гэтым яго прырода»)*, дзякуючы якім ён функцыянуе і цяпер.

## 4.2. Змены ў зносінах з рознымі стэйкхолдэрамі

***Бізнес-асацыяцыі***

Яны яднаюць досыць невялікую (да 10%) колькасць бізнесаў. Цяпер іх адвакатыўная праца практычна замарожаная (тое нешматлікае, што засталося, належыць да мясцовага ўзроўню); супраца асацыяцый з дзяржавай лімітаваная і фармальная. Кантактаў з найвышэйшымі чыноўнікамі практычна няма, але некаторыя кантакты на сярэднім і ніжнім узроўнях засталіся. Па словах аднаго з рэспандэнтаў, часам гэтыя чыноўнікі ў прыватных гутарках выказваюць падтрымку пацярпеламу ад рэпрэсій бізнесу. Ёсць меркаванне, што бізнес-асацыяцыі сталі больш прафесійнымі. Разам з тым, «палітычна нейтральная» пазіцыя некаторых бізнес-асацыяцый успрымаецца як праўладная.

Сур'ёзней паўстала пытанне даверу бізнесу да іншага бізнесу. Як выразіўся адзін з рэспандэнтаў, *«мы сталі больш берагчы адно аднаго, хоць і пільна дбаем пра фінансавую дысцыпліну»*. Шмат камунікацыі сышло ў непублічную сферу.

***Зносіны з дзяржавай***

З боку дзяржавы назіраюцца рэпрэсіі ў дачыненні да кампаній і прадстаўнікоў бізнесу, якія падтрымалі пратэст. Формы ўзаемадзеяння, якія працавалі раней, сталі менш эфектыўнымі: былі зменены склады кансультатыўных рад (стала больш чыноўнікаў і менш прадстаўнікоў бізнесу), дзяржорганы ўсё яшчэ дасылаюць некаторыя дакументы ў бізнес-асацыяцыі і чальцам рад, але вельмі позна і інш. Узаемадзеянне характарызуецца як досыць фармальнае або ў мадальнасці супрацьстаяння (*«нібы чакаюць падвоху»)*.

Прадстаўнікі бізнес-супольнасці лічаць, што стаўленне да іх з боку дзяржавы можна выразіць фразай *«рана ці позна прыйдуць па грошы»* — прычым незалежна ад таго, дэманстраваў гэты бізнес або яго ключавыя асобы свае палітычныя перакананні ці не. Часта кантактаў з прадстаўнікамі ўлады няма з маральна-этычных прычын. Разам з тым, шмат хто лічыць, што ўсё роўна трэба кантактаваць, гэта непазбежна — хаця б на ўзроўні свайго падатковага інспектара. Увогуле бізнес лічыць дзяржаву таксічнай (і гэта датычыць усіх дзяржорганаў, а не толькі сілавых структур). Як адзначыў адзін з рэспандэнтаў: «*Калі нехта ажыццявіў нейкае дзеянне, якое хаця б аддалена можа трактавацца як праўладнае, то ён будзе шукаць магчымасць патлумачыць сваю пазіцыю — «гэта вось вы так чытаеце, а насамрэч гэта не так» — сваім калегам і партнёрам, тым, чыё меркаванне для яго значнае*».

### *Зносіны з медыя*

Бізнес і да крызісу быў не вельмі зацікаўлены ў публічнасці (што рэзка розніць беларускі бізнес ад калег з суседніх краін) з той прычыны, што прыцягваць залішнюю ўвагу да сябе было небяспечна не толькі ў гэтыя крызісныя паўтара года, але і раней. Цяпер бізнес, відавочна, яшчэ менш зацікаўлены ў асвятленні сваіх сацыяльных дзеянняў у медыя (*«бізнес баіцца адкрыць рот»*). Аднак прадстаўнікі бізнесу ўдзячны медыя за асвятленне фактаў рэпрэсій, закрыцця кампаній праз палітычныя прычыны і да т.п. Бізнес быў пакараны не толькі за дапамогу палітычным суб'ектам або АГС, але і за спробы прама падтрымліваць апальныя медыя, напрыклад, размяшчаючы ў іх рэкламу. У пэўнай ступені гэтая падтрымка захавалася, але ўжо «абходнымі шляхамі». Да таго ж, быў нанесены сур'ёзны ўдар па медыя як бізнесу.

### *Стаўленне да бізнесу ў грамадстве*

Рэспандэнты лічаць, што стаўленне беларускага грамадства да бізнесу і да 2020 года было ўвогуле досыць пазітыўнае (за выняткам псеўдабізнесаў), і засталося такім. Грамадства дэманстравала салідарнасць з пацярпелымі бізнесамі; кліенты цярпліва ставіліся да арганізацый, якія мелі праблемы з палітычных прычын. Аднак адначасова існуе і стаўленне «*навошта лезлі ў палітыку?*», калі грамадзяне лічаць пакаранне ўладай бізнесу за актыўную пазіцыю немінучым.

### *Узаемадзеянне з АГС, ініцыятывамі, актывістамі*

Уздым такой супрацы і карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці (КСА) адбываўся апошняе дзесяцігоддзе. Як лічыць адзін з рэспандэнтаў, уздым культуры, дабрачыннасці і сацыяльных ініцыятыў быў асіметрычным і дзіўным адказам на задушаны пратэст 2010 года. Падчас гэтага працэсу бізнес (прынамсі, нейкая яго частка) зразумеў, навошта патрэбная грамадзянская супольнасць. Былі рэалізаваны шмат супольных праектаў літаральна ва ўсіх сферах — адукацыя, культура, экалогія, дабрачыннасць, ахова здароўя, урбаністыка, спорт і інш. Гэты трэнд ішоў па нарастальнай, хаця часта гэтая супраца была непублічная або не афішавалася. Крызіс 2021 года рэзка спыніў хвалю падобных праектаў: зараз іх, паводле

ацэнак рэспандэнтаў, засталося вельмі мала. Дапамога, што засталася, ажыццяўляецца непублічна.

У ідэале бізнес і грамадзянская супольнасць маюць вялікі патэнцыял супрацы. Яны больш даведаліся адно пра аднаго, хаця тут усё яшчэ шмат працы: актывісты грамадскіх арганізацый па-ранейшаму часам успрымаюцца бізнесам як «фрыкі-энтузіясты», а бізнес грамадскімі актывістамі — як «мяшкі з грашыма». Бізнес лічыць, што АГС могуць выступаць экспертамі па тэме іх кампетэнцый, дзяліцца досведам па КСА, працы з медыя. У сваю чаргу, бізнес можа не толькі фінансава падтрымліваць, але і вучыць АГС менеджменту і бізнес-працэсам.

***Узаемадзеянне з палітычнымі суб'ектамі***

Адсутнасць адзінага адказу на пытанне аб зносінах бізнесу і палітыкі дэманструецца бізнесам і ў тэарэтычных развагах на гэтую тэму. Меркаванні адрозніваюцца. Некаторыя лічаць, што нармальна, напрыклад, падтрымліваць партыю, якая бароніць інтарэсы бізнесу. Іншыя супраць прамой дапамогі — і таму, што гэта сумнеўна з гледзішча аўдыту, і таму, што змешванне бізнесу і палітыкі, на іх думку, наогул не павінна быць.

## 4.3. Асноўныя выклікі і неабходная падтрымка

Найважнейшы выклік для бізнесу — гэта сітуацыя прававога дэфолту ў краіне. Шмат хто ўжывае тэрмін «вяртанне ў прававое поле», хоць адначасова і прызнаюць, што і да 2020 года да яго было шмат прэтэнзій. Так ці інакш, незалежна ад таго, ці ідзе гаворка пра «вяртанне» ці пра «фармаванне» прававога асяроддзя, яго адсутнасць называецца праблемай і выклікам нумар адзін. У спробах абараніцца ад рэпрэсій нярэдка даводзіцца рабіць маральны выбар, на якую згоду з сумленнем можна пайсці, а на якую не. Прыкладам можа служыць піцэрыя «Тэмпа», якая ў чэрвені 2021 года прыбрала з меню піцу пад назвай *Tut.by*[28], матывуючы гэта тым, што ў адваротным выпадку іх закрыюць.

Шчыльна звязаная з праблемай прававога дэфолту і праблема агульных умоў працы (бізнес-клімат): гэта цэлы комплекс фактараў, сярод якіх асабліва вылучаюць няроўнасць у параўнанні з дзяржсектарам, шматлікія выпадкі ўмяшання дзяржавы ў дзейнасць прыватнага сектара.

Апрача згаданых вышэй праблем, прадстаўнікі бізнесу назвалі:

- Рост коштаў на матэрыялы і камплектуючыя, змяншэнне іх выбару;
- Доступ да фінансаў;

[28] https://marketing.by/novosti-rynka/set-tempo-pereimenovala-pitstsu-tut-by-i-slovila-negativ-v-sotssetyakh.

- «Усыханне» ўнутранага попыту;
- Другасны ўплыў санкцый (*«а калі падсанкцыйнае прадпрыемства — важны кліент, то куды падзецца?»*);
- Неплацяжы, асабліва з дзяржсектара;
- Кадры і іхняя кваліфікацыя;
- Замкнёныя межы, немагчымасць ездзіць на выставы, мець зносіны з партнёрамі;
- Сыход некаторых бізнесаў з краіны.

Увогуле, некаторыя рэспандэнты асцерагаюцца, што працяг рэпрэсій і паглыбленне гэтых праблем выклічуць адкат на шмат гадоў таму, спрашчэнне ўсёй сістэмы зносін бізнесу з дзяржавай і грамадствам (замест складаных працэсаў узгаднення і наладжвання дыялогу — толькі прамыя ўказанні «зверху ўніз», у якіх не бяруць да ўвагі інтарэсы бізнесу і магчымыя праблемы ці выдаткі з яго боку).

Што да дапамогі, то ад дзяржавы прадстаўнікі бізнесу чакаюць, як мы ўжо казалі, забеспячэння функцыянальнага прававога асяроддзя, дзейснага інстытута прыватнай уласнасці, дэкрыміналізацыі эканамічных правапарушэнняў, макраэканамічнай стабільнасці, а галоўнае — каб дзяржава «не замінала» іхняй дзейнасці. Дробнаму бізнесу таксама патрэбная фінансавая падтрымка з боку дзяржавы.

Магчымымі варыянтамі дапамогі бізнесу з боку іншых актараў маглі б быць:

- стажыроўкі (прыклад: Юры Зісэр казаў, што без праграмы *Community Connections* не з'явіўся б *Tut.by*);
- дапамога ў фіксацыі рэпрэсій у дачыненні да бізнесу;
- публічнае асвятленне гісторый рэпрэсій у дачыненні да бізнесу;
- юрыдычная дапамога.

### 4.4. Магчымая роля ў будучых трансфармацыях

Рэспандэнты падзяляюць меркаванне аб тым, што ў існых умовах бізнес заняты проста выжываннем. Ні аб якіх новых інвестыцыях, пашырэнні, новых кірунках не ідзе і гаворкі. Бізнес проста чакае, нібы ўпаў у спячку, асабліва малы і рэгіянальны. Што да ролі бізнесу ў сацыяльна-палітычных трансфармацыях у будучыні, меркаванні разыходзяцца. Хтосьці лічыць, што сітуацыя не зменіцца (то-бок не бізнес, а нехта іншы будзе драйверам магчымых змен). Іншае меркаванне палягае ў тым, што бізнес павінен сказаць сваё слова і яшчэ скажа, бо менавіта ён стварае попыт на рэформы, і што ён гатовы актыўна ўдзельнічаць у працэсе рэформаў, пераўтварэнняў. Аднак, відаць, бізнес гатовы стаць драйверам рэформ толькі **пасля** нейкай змены сітуацыі, а не актыўным ініцыятарам ці ўдзельнікам самога працэсу палітычных змен. У выпадку станоўчых змен ёсць перспектыва «пасіянарнага выбуху» (не толькі ў бізнесе, але і ў ім таксама), рэзкага росту, буму вонкавых і ўнутраных інвестыцый, хуткай і сучаснай лічбавай трансфармацыі.

## ВЫСНОВЫ

У актуальнай сітуацыі бізнес жыве і працуе ў рэжыме «замерлага чакання» і негатыўных чаканняў ад будучыні. Адпаведна, новыя інвестыцыі не адбываюцца (або сканчаюцца «старыя» праекты высокай ступені гатоўнасці).

Бізнес лічыць прававы дэфолт сур’ёзнай праблемай і хацеў бы як мага хутчэйшага аднаўлення (ці нават устанаўлення новага) дзейснага прававога асяроддзя. Сур’ёзную праблему ўяўляюць сабой і агульныя ўмовы працы (бізнес-клімат): фактычная няроўнасць дзяржаўнай і прыватнай уласнасці, адсутнасць дзяржаўнай падтрымкі, неплацяжы, санкцыі, высокія рызыкі і інш.

Бізнес лічыць узаемадзеянне з дзяржавай хутчэй таксічным, аднак з прычыны неабходнасці падтрымлівае мінімальны ўзровень камунікацыі. Што да зносін з медыя, то беларускі бізнес і да палітычнага крызісу быў у значнай ступені непублічны, а ў сённяшніх умовах і пагатоў імкнецца пазбягаць публічнай увагі, чакаючы ад гэтага больш праблем, чым карысці. Усплёск зносін з АГС і рознымі ініцыятывамі на дадзены момант скончаны — і праз тое, што такіх арганізацый засталося вельмі мала, і праз тое, што такая дапамога ўспрымаецца як патэнцыйна небяспечная праследам.

Бізнес гатовы браць удзел у фармаванні новай эканомікі (і, па меры сіл, новага грамадства: асобныя бізнесмены гатовы ўдзельнічаць і ў палітычным жыцці), але не гатовы быць рухаючай сілай, якая змяняе грамадска-палітычны лад у краіне.

## 5. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА: ЯЕ РОЛЯ І ПАТРЭБЫ Ў ПАДТРЫМЦЫ БЕЛАРУСІ

*У дадзеным раздзеле разглядаецца сітуацыя, якая ўзнікла ў беларускай дыяспары пасля выбараў 2020 года. Гэтаксама як і ўнутры Беларусі, тут адбылася палітызацыя беларусаў і з'явіліся новыя ініцыятывы. Па выніках праведзеных інтэрв'ю і на падставе ўключанага назірання аўтараў робяцца высновы аб асноўных кірунках дзейнасці дыяспаральных арганізацый, разглядаецца стаўленне беларусаў замежжа да сітуацыі ў краіне, а таксама іхняя актыўнасць, скіраваная на дапамогу як суайчыннікам у Беларусі, так і тым, хто быў змушаны пакінуць Беларусь з палітычных прычын. Асобна аналізуюцца практыкі ўзаемадзеяння дыяспар з уладамі, бізнесам і трэцім сектарам краін іх знаходжання, а таксама выдзяляюцца праблемы, з якімі беларусы замежжа сутыкаюцца ў сваёй дзейнасці.*

У рамках дадзенага даследавання не ставілася задача колькаснай ацэнкі дыяспары. Аўтары спрабавалі ацаніць яе якаснае развіццё, кірункі працы ў звязку з палітычным крызісам у Беларусі, а таксама актуальныя патрэбы арганізацый, якія дзейнічаюць за мяжой, але дзейнасць якіх скіраваная на дапамогу беларусам. У перыяд з пачатку чэрвеня да канца ліпеня 2021 года былі праведзеныя 10 паўструктураваных інтэрв'ю з прадстаўнікамі беларускіх арганізацый, якія знаходзяцца ў трох краінах: Літве, Польшчы і Украіне, бо менавіта гэтыя краіны сталі асноўным кірункам вымушанай міграцыі беларусаў у звязку з падзеямі 2020 года і палітычным крызісам. Разам з тым, па стане на пачатак восені 2021 года да гэтых краін можна дадаць Грузію, якая стала свайго роду «хабам» — месцам, куды прыехала шмат актывістаў арганізаванай беларускай грамадзянскай супольнасці, якія распачалі працэс афіцыйнай рэгістрацыі сваіх арганізацый у гэтай краіне.

### 5.1. Беларуская дыяспара і яе актывізацыя пасля 2020 года

Колькасць беларусаў, якія жывуць за мяжой, ацэньваецца ў розных крыніцах па-рознаму. Паводле Белстату, з 1995 па 2019 гады з краіны выехалі 177 000 беларусаў[29], аднак усярэдненая ацэнка статыстычных агенцтваў іншых краін і міжнародных арганізацый (напрыклад, Сусветнага Банка і Дэпартамента ААН па сацыяльна-эканамічнаму развіццю) вызначае колькасць беларусаў, якія выехалі і жывуць за мяжой, прыкладна ў 1,5 мільёна[30]. Разам з тым, адна з найбуйнейшых беларускіх дыяспаральных супольнасцей «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»» паказвае на сваім сайце лічбу 3,5 мільёнаў беларусаў за мяжой[31]. Што да якаснага аспекту, да 2020 года дыяспаральныя арганізацыі markdown рознай скіраванасці існавалі і дзейнічалі ў розных краінах свету ў некаторых выпадках

[29] Дадзеныя Белстату аб міграцыі даступны на https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/naselenie-i-migratsiya/migratsiya/ (прагледжана 18.10.2021).
[30] Дадзеныя Сусветнага Банка аб міграцыі даступны на https://data.worldbank.org/indicator/SM.POP.NETM?locations=BY (прагледжана 18.10.2021).
[31] Афіцыйны сайт «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»»: https://zbsb.org/news/abroad/226/ (прагледжана 18.10.2021).

прасоўваючы дэмакратычны парадак дня, а ў некаторых, наадварот, супрацоўнічаючы з пасольствамі Рэспублікі Беларусь і атрымліваючы іх дапамогу.

Аналагічна працэсам палітызацыі беларускага грамадства ўнутры краіны, якія адбываліся з вясны 2020 года, у шэрагу замежных краін пачалася актывізацыя беларусаў, якія там жывуць. Праявы салідарнасці ў выглядзе пераводу сродкаў на канкрэтныя запыты і кампаніі пачаліся, верагодна, з перыяду распаўсюду COVID-19 і адсутнасці адэкватнай палітыкі адносна эпідэміі ўнутры Беларусі. Тады беларусы замежжа далучыліся да збору сродкаў на дапамогу суайчыннікам. Аднак асноўным мабілізацыйным штуршком стала сама выбарчая кампанія 2020 года, калі не ангажаваныя раней у палітычны парадак дня беларусы, якія жывуць за мяжой, пачалі актыўна ўцягвацца ў палітычныя працэсы. Вылучэнне ў сябры выбарчых камісій і назіральнікі за мяжой, правядзенне экзітполу на замежных выбарчых участках у 23 краінах і затым пратэсты супраць гвалту беларускіх улад у дачыненні да мірных пратэстоўцаў пасля выбараў былі ў ліку фактараў, якія спрыялі аб'яднанню і мабілізацыі беларусаў за мяжой. У прыватнасці, у перыяд непасрэдна пасля выбараў зборы ля амбасад Рэспублікі Беларусь сталі адной з формаў аб'яднання беларусаў замежжа. Пазней з яе паўсталі новыя арганізацыі і ініцыятывы, скіраваныя на дапамогу беларусам, якія з розных прычын былі змушаны або праз суб’ектыўныя акалічнасці вырашылі пакінуць Беларусь. З цягам часу хваля масавай мабілізацыі беларусаў, якія жылі за мяжой да 2020 года, спала і набыла арганізаваныя формы. Аднак паралельна, разам з перамяшчэннем за мяжу вялікай колькасці беларусаў, адбылася іх мабілізацыя. Такім чынам цяпер у акцыях падтрымкі Беларусі, якія адбываюцца ў Літве, Польшчы і Украіне, часта бяруць удзел тыя, хто прыехаў у гэтыя краіны ўжо пасля пачатку палітычнага крызісу, а вось чальцы дыяспары ўдзельнічаюць не заўсёды.

Акрамя таго, пачалі дзейнічаць і беларускія арганізацыі і ініцыятывы, якія вымушана пакінулі краіну, але працягнулі сваю дзейнасць з-за мяжы. Адзін з першых і відавочных прыкладаў такіх арганізацый — гэта фонд *BYSOL* і іншыя фонды прафесійнай салідарнасці (напрыклад, культурнай, спартыўнай, медычнай і інш.), якія ўзніклі ў той жа перыяд.

Такім чынам, можна казаць аб тым, што палітычныя падзеі 2020 года ў Беларусі ў значнай ступені мабілізавалі беларускую дыяспару. У ёй адбылася хваля масавай мабілізацыі і паўсталі новыя арганізацыі, скіраваныя на дапамогу беларусам; актывізавалася дзейнасць некаторых беларускіх арганізацый, якія існавалі і дзейнічалі за мяжой і раней (пераважна тых, якія мелі ў сваім парадку дня правы чалавека і іншыя грамадзянска-палітычныя пытанні); таксама адбылася міграцыя некаторых арганізацый, якія пачыналі сваю дзейнасць у Беларусі. Што да кірункаў дзейнасці, дыяспаральныя арганізацыі займаюцца гуманітарнай дапамогай, у тым ліку вырашэннем пытанняў фізічнага пражывання; юрыдычным і інтэграцыйным суправаджэннем беларусаў; дапамогай беларускім палітычным вязням і іхнім сем’ям; арганізацыяй і ажыццяўленнем спецыялізаваных праграм для асобных мэтавых груп (напрыклад, журналістаў); адвакатыўнай дзейнасцю для прасоўвання беларускага парадку дня; арганізацыяй і правядзеннем як палітычна, так і культурна арыентаваных падзей і інш. То-бок гэтыя арганізацыі працуюць з розным парадкам дня і ў розных кірунках, звязаных з Беларуссю.

## 5.2. Праца з уцекачамі з Беларусі і іхнія патрэбы

Як і ў выпадку з беларускай дыяспарай, колькасныя ацэнкі тых, хто выехаў за межы Беларусі праз палітычны крызіс, істотна адрозніваюцца. Некаторыя эксперты кажуць пра дзясяткі, некаторыя — пра сотні тысяч такіх эмігрантаў. Розняцца і прычыны ад’езду — ад эканамічнай міграцыі да вымушанага ад’езду праз пераслед з боку сілавых структур у Беларусі. Падзяліць прычыны ад’езду часта складана — як праз аб’ектыўную складанасць самой сітуацыі выезду з краіны, так і праз злоўжыванні дапамогай некаторымі мігрантамі.

Прадстаўнікі арганізацый, якія працуюць з тымі, хто выехаў з Беларусі, адзначаюць два пікавыя перыяды прыезду: 1. перыяд з сярэдзіны жніўня да канца снежня 2020 года (адразу пасля выбараў і наступных гвалтоўных дзеянняў і да ўвядзення беларускімі ўладамі абмежаванняў на наземны выезд); 2. перыяд, які пачаўся ўвесну 2021 года і працягваецца на момант напісання тэксту, звязаны з адраснымі рэпрэсіямі супраць грамадзянскай супольнасці, грамадзянскіх актывістаў, журналістаў і інш. На думку рэспандэнтаў, гэтым перыядам адпавядаюць групы, якія якасна розняцца як сацыяльна-эканамічным складам, так і матывацыяй ад’езду з Беларусі. У першым выпадку прычынай ад’езду выступалі псіхалагічныя фактары, траўмы ад сутыкнення з гвалтам, боязь праследу і інш.; у другім можна казаць аб адрасным праследзе, распачатых крымінальных справах і інш.

Сітуацыя з уцекачамі з Беларусі ўскладняецца тым, што часта людзі выязджалі сем’ямі, без сродкаў для існавання і з мінімальным наборам асабістых рэчаў. Такім чынам, у перыяд пасля выбараў грамадскім ініцыятывам за мяжой давялося ў паскораным парадку наладжваць лагістычныя схемы падтрымкі тых, хто прыехаў у краіну (дапамога ў пошуку месцаў для пражывання, фінансавая дапамога, збор адзення і інш.), і асвойваць навыкі падтрымальнай і інтэграцыйнай працы для мінімальнага ўключэння беларусаў у прымаючыя супольнасці (афармленне неабходных дакументаў, тлумачэнне заканадаўства, уладкаванне дзяцей у навучальныя ўстановы і інш.). Трэба адзначыць, што ўсё гэта адбывалася ў перыяд, калі ў Польшчы, Літве і Украіне дзейнічалі звязаныя з COVID-19 абмежаванні, што абцяжарвала і абцяжарвае дапамогу ўцекачам.

Праца з тымі, хто з’ехаў з Беларусі, стала адным з асноўных кірункаў дзейнасці як для беларускіх арганізацый, якія існавалі за мяжой раней, так і для тых, якія ўзніклі на працягу і пасля 2020 года. Разам з тым, у кожнай з гэтых краін існуюць свае адметнасці, звязаныя з працай з людзьмі, якія прыехалі з Беларусі:

- Адметнасць Украіны — гэта не самае спрыяльнае для міграцыі заканадаўства, пад дзеянне якога трапляюць і беларускія іміграцнты. Рэспандэнты з гэтай краіны адзначалі абмежаванні тэрмінаў знаходжання, складанасці з афармленнем дакументаў і ўвогуле з легалізацыяй, а таксама наяўнасць палітычна дваістага стаўлення да беларусаў (некаторыя палітыкі ўспрымаюць іх як патэнцыйных «агентаў уплыву рускага свету»).
- Урад Літвы дапамагае з афармленнем гуманітарных віз, што палягчае працэс легалізацыі. Аднак у гэтай краіне практычна няма праграм інтэграцыі замежнікаў (у

прыватнасці, вывучэння мовы), а таксама існуюць сур’ёзныя абмежаванні ў прыняцці на кваліфікаваную працу грамадзян з трэціх краін (то-бок уладкаванне на працу можа быць параўнальна лёгкім або на пасады, звязаныя з фізічнай працай, або на высокакваліфікаваныя пасады, якія з'яўляюцца выняткамі).
- У выпадку Польшчы гуманітарныя візы і працэсы легалізацыі, верагодна, найспрыяльнейшыя, але таксама існуюць пытанні першай дапамогі: пошуку жытла, уладкавання на працу, першаснай інтэграцыі і сацыялізацыі.

Падагульняючы, можна сказаць, што для тых, хто прыехаў у Літву, Польшчу і Украіну, на думку арганізацый, якія працуюць з гэтай мэтавай групай, актуальныя такія запыты аб дапамозе, як:

1) Матэрыяльная і фінансавая дапамога, дапамога з жытлом (як аплатай, так і пошукам);
2) Юрыдычная дапамога (асабліва афармленне віз, відаў на жыхарства) па пытаннях легалізацыі і працаўладкавання тых, хто прыехаў у краіну;
3) Інтэграцыя ў прымаючую супольнасць (дапамога ва ўладкаванні на працу, у навучальныя ўстановы);
4) Псіхалагічная падтрымка і дапамога;
5) Пытанні вольнага часу і сацыяльных сувязей (запыты на арганізацыю падзей для беларусаў).

## 5.3. Эмігранты і іх стаўленне да сітуацыі ў Беларусі

На думку рэспандэнтаў, ад’езд з краіны, як правіла, не азначае для беларусаў выхаду з актуальнага палітычнага інфармацыйнага парадку дня. Беларусы, якія прыехалі пасля лета 2020 года, працягваюць сачыць за падзеямі на радзіме, актыўна ўдзельнічаюць у акцыях падтрымкі, а ў некаторых выпадках іх нават арганізоўваюць. Акрамя таго, часта яны самі робяцца часткай арганізацый і ініцыятыў, якія дапамагаюць тым, хто прыязджае з Беларусі, дзелячыся сваім досведам і практыкамі (своеасаблівае «роўнае кансультаванне»).

Тым не менш, ёсць група тых, хто з’ехаў (асабліва гэта датычыць людзей, якія з’язджалі адразу пасля жніўня 2020 года), якія або праз унутранае выгаранне і псіхалагічныя траўмы, або праз занятасць вырашэннем сваіх побытавых пытанняў перастаюць сачыць за падзеямі ў Беларусі і не ўдзельнічаюць ні ў якіх беларускіх ініцыятывах у краіне свайго знаходжання.

### 5.4. Узаемадзеянне дыяспары з уладамі, бізнесам і грамадзянскім сектарам у краіне знаходжання

Відавочна, што існуюць розныя практыкі ўзаемадзеяння дыяспаральных арганізацый з прадстаўнікамі ўлады, бізнесу і грамадзянскай супольнасці. Можна дапусціць, што ступень гэтага ўзаемадзеяння залежыць ад таго, наколькі добра самі прадстаўнікі такіх арганізацый інтэграваны ў супольнасць краіны свайго знаходжання. Напрыклад, у выпадку дыяспаральных арганізацый, якія існавалі да 2020 года і ў складзе якіх ёсць беларусы, якія прафесійна працавалі раней у трэцім сектары, можна казаць аб досыць актыўным узаемадзеянні з мясцовымі ўладамі, аб атрыманні дапамогі ад бізнесу і бізнесменаў краіны, дзе знаходзіцца арганізацыя, а таксама аб працы з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці (у прыватнасці, з тымі, якія займаюцца пытаннямі ўцекачоў). Гэтыя ж арганізацыі могуць праводзіць адвакатыўныя кампаніі прасоўвання беларускіх пытанняў на вышэйшым палітычным узроўні. Аналагічна свае сувязі з уладамі, бізнесам і АГС апісвалі і арганізацыі, створаныя пасля падзей 2020 года, але прадстаўнікі/прадстаўніцы якіх добра інтэграваны ў грамадства краіны свайго знаходжання. Што датычыць новых ініцыятыў, прадстаўнікі якіх самі нядаўна прыехалі ў Літву, Польшчу і Украіну, то іх узаемадзеянне з усімі названымі вышэй суб’ектамі хутчэй несістэматычнае, скіраванае на вырашэнне нейкіх вузкіх пытанняў і праблем (напрыклад, афармленне віз); тым не менш, менавіта гэтыя арганізацыі казалі пра тое, што атрымліваюць дапамогу ад беларускага бізнесу.

Аднак, хаця ўсе арганізацыі і сцвярджалі, што ўзаемадзейнічаюць з бізнесам (краіны знаходжання або беларускім), а ў некаторых выпадках і атрымліваюць ад яго дапамогу, агульны аб’ём такой дапамогі ацэньваецца як невялікі.

Калі казаць пра палітычную плоскасць дзейнасці дыяспары, то ў разгледжаных краінах узровень палітычнай цікавасці да Беларусі высокі. Акрамя таго, у Літве і Польшчы знаходзяцца інстытуцыялізаваныя структуры беларускай апазіцыі, таму прасоўванне беларускага палітычнага парадку дня на нацыянальным узроўні звычайна адбываецца без актыўнага ўдзелу беларускіх дыяспаральных арганізацый. Разам з тым, самі рэспандэнты казалі пра тое, што беларускім арганізацыям ва Украіне трэба актыўней уключацца ў прасоўванне беларускага дэмакратычнага палітычнага парадку дня.

### 5.5. Узаемадзеянне ўнутры беларускай дыяспары

Пасля актывізацыі ў перыяд выбарчай кампаніі 2020 года беларускія арганізацыі, якія ўзніклі і існавалі раней, на думку рэспандэнтаў, узмацнілі сваё ўзаемадзеянне. Складана меркаваць аб наяўнасці нейкага арганізаванага каардынацыйнага цэнтра ці арганізацыі-лідара, аднак падчас інтэрв’ю ўсе рэспандэнты адзначылі, што тым ці іншым чынам узаемадзейнічаюць з беларускімі дыяспарамі ў іншых краінах. Напрыклад, згадваліся выпадкі гуманітарнай дапамогі беларусаў Германіі арганізацыям, якія працуюць

з беларускімі ўцекачамі ў Літве і Украіне. Таксама рэспандэнты казалі аб супольных акцыях салідарнасці і культурных праектах.

Калі казаць аб узаемадзеянні дыяспаральных арганізацый, якія знаходзяцца ў адной краіне, то тут звычайна яно таксама існуе. Адзначым, што не было выяўлена асаблівых адрозненняў у дзейнасці і ступені ўзаемадзеяння ў залежнасці ад часу стварэння арганізацыі. Разам з тым, паміж арганізацыямі здараюцца канфлікты і рознагалоссі як праз суб'ектыўныя фактары (асабістыя канфлікты, адсутнасць узаемаразумення і інш.), так і, верагодна, праз дзейнасць спецслужбаў, скіраваную на стварэнне расколу ў арганізацыях беларусаў за мяжой.

## 5.6. Праблемы і патрэбы дыяспаральных арганізацый

Прадстаўнікі і прадстаўніцы беларускіх дыяспаральных арганізацый казалі пра розныя праблемы, з якімі яны сутыкаюцца, і пра адпаведныя актуальныя патрэбы. Сярод найчасцей згаданых можна назваць:

1. Недахоп фінансавых рэсурсаў для арганізацыі і аказання дапамогі і падтрымкі беларусам, якія прыязджаюць;
2. Выгаранне і сыход супрацоўнікаў арганізацый, неабходнасць псіхалагічнай дапамогі і падтрымкі саміх супрацоўнікаў і валанцёраў;
3. Неабходнасць у навучанні ўласных кадраў, арганізацыі праграм павышэння кваліфікацыі і інш. для забеспячэння ўстойлівасці ўласнай дзейнасці;
4. Патрэба ў дапамозе і дадатковай падтрымцы для рэалізацыі новых праграм (напрыклад, навучання), адрасаваных як беларусам, якія прыехалі ў краіну, так і беларусам у Беларусі (напрыклад, дапамога сем'ям палітычных вязняў).

## 5.7. Роля дыяспары ў вырашэнні палітычнага крызісу ў Беларусі

Адносна таго, чым можа і павінна займацца дыяспара для вырашэння палітычнага крызісу ў Беларусі, рэспандэнты практычна аднагалосна называлі некалькі важных кірункаў. Найперш, дыяспаральныя арганізацыі павінны займацца прасоўваннем беларускага палітычнага парадку дня на ўзроўні ўрадаў краін свайго знаходжання, а таксама адвакатаваннем беларускага парадку дня ў прынцыпе, у тым ліку праз працу з мясцовымі медыя. Па-другое, як паказала практыка, дыяспара была і застаецца актыўным суб'ектам розных фандрэйзінгавых кампаній для Беларусі і беларусаў, збіраючы значныя фінансавыя рэсурсы на розныя мэты і кампаніі як унутры, так і за межамі краіны (падтрымка акцый і ініцыятыў кампаніі *BYSOL* і інш.). Па-трэцяе, мае значэнне праца з бізнесам краін знаходжання дыяспар для тлумачэння сітуацыі ў Беларусі з пазіцый вядзення бізнесу ва ўмовах парушэння правоў чалавека (напрыклад, адмова ад бізнес-

кантрактаў з беларускімі прадпрыемствамі, на якіх парушаюцца правы працаўнікоў). У шырэйшым сэнсе дыяспара можа прасоўваць эканамічны парадак дня дэмакратычных сіл, працаваць з міжнароднымі бізнес-кампаніямі і фінансавымі інстытуцыямі адносна вядзення праектаў з беларускімі кампаніямі, звязанымі з дзяржавай, выдзялення ім фінансавых сродкаў, крэдытаў, інвестыцый і інш. Акрамя таго, дыяспара магла б стаць кадравым рэсурсам для Беларусі ў пазнейшы перыяд, калі ў ёй адбудуцца дэмакратычныя змены.

## ВЫСНОВЫ

У беларускай дыяспары ў перыяд даследавання адбываліся працэсы, шмат у чым падобныя да тых, што мелі месца ў грамадстве ўнутры краіны. У прыватнасці, на пачатковых этапах палітычнага крызісу ўзмацнілася палітызацыя дыяспар, павялічыўся іх удзел у звязанай з сітуацыяй у Беларусі грамадска-палітычнай дзейнасці. Працягнулі сваю працу арганізацыі, якія існавалі да 2020 года, а таксама ўзніклі новыя ініцыятывы.

Разам з тым, з паглыбленнем палітычнага крызісу ўцягнутасць беларусаў замежжа ў падзеі змянялася: частка новых ініцыятыў працягнула дзейнасць, але частка людзей, якія мабілізаваліся на час выбараў і ў актыўны пратэсны перыяд, вярнулася да звычайнага жыцця па-за актывізмам.

Адным з асноўных кірункаў дзейнасці беларускіх арганізацый за мяжой стала дапамога тым, хто быў вымушаны пакінуць краіну. Актывісты дыяспары таксама досыць ангажаваныя ў адвакатаванне беларускага парадку дня на ўзроўні нацыянальных і мясцовых улад, прасоўванне і падтрыманне кампаній ды іншыя звязаныя з Беларуссю актыўнасці.

Тым не менш, у сваёй дзейнасці беларускія дыяспары і актывісты сутыкаюцца, з аднаго боку, з такімі ж праблемамі, як і людзі/арганізацыі ўнутры Беларусі (псіхалагічным выгараннем, неабходнасцю паляпшаць навыкі лічбавай бяспекі і інш.). З іншага боку, яны вымушаны вырашаць і спецыфічныя для краіны іх знаходжання праблемы (напрыклад, з міграцыйным заканадаўствам ва Украіне).

## АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ

Падзеі 2020 года карэнным чынам змянілі структуру зносін у беларускім грамадстве, закрануўшы практычна ўсе сацыяльныя групы, сектары і інстытуты. Грамадзянская супольнасць у Беларусі ў гэты перыяд выйшла на новы якасны ўзровень: на хвалі рэакцыі на каранакрызіс і палітычнай мабілізацыі актуалізаваўся назапашаны за папярэднія гады патэнцыял салідарнасці, грамадзянскай адказнасці і самаарганізацыі. Выбух не толькі палітычнай, але і сацыяльнай і культурнай актыўнасці як у краіне, так і за яе межамі моцна змяніў вобраз беларускай нацыі — і найперш для саміх беларусаў.

Аднак працэс «абуджэння» грамадзянскай супольнасці ў значна шырэйшых рамках, чым яна існавала дагэтуль, адразу ж наткнуўся на масавыя рэпрэсіі з боку беларускага рэжыму. Характар гэтых рэпрэсій змяняецца: калі ўлетку—ўвосень 2020 года пад ціск і пераслед траплялі актыўныя ўдзельнікі палітычных працэсаў і акцый, то ў 2021 годзе рэжым перайшоў да інстытуцыянальных рэпрэсій і задушэння любой незалежнай ад яго ці не поўнасцю кантраляванай ім актыўнасці. Адпаведна гэтай логіцы абмяжоўваюцца і пераследуюцца зусім розныя групы і сектары: і актывісты «новай хвалі», і традыцыйныя сталыя АГС, і незалежныя медыя, і бізнес як прастора свабоднай эканамічнай актыўнасці.

Умовы дзейнасці грамадзянскай супольнасці няўхільна пагаршаюцца практычна ва ўсіх кірунках. Найважнейшы з такіх кірункаў — гэта фактычны прававы дэфолт у краіне, аднак і пагаршэнне эканамічных умоў дзейнасці, а таксама змены інфармацыйнага асяроддзя таксама маюць важнае значэнне. Беларускі рэжым метадычна нішчыць інстытуцыйны падмурак узаемадзеяння розных сектараў паміж сабой і інфраструктуру праявы любой свабоднай актыўнасці, не думаючы ні пра эканамічныя і іміджавыя страты, ні пра сацыяльныя і гуманітарныя наступствы для краіны. У гэтых умовах істотна змяняюцца схемы ўзаемадзеяння арганізаванай грамадзянскай супольнасці як з дзяржавай, так і з іншымі сацыяльнымі актарамі. Узаемадзеянне з дзяржаўнымі структурамі любога ўзроўню шмат у якіх выпадках зводзіцца да мінімальна неабходных формаў[32], прычым гэта ўзаемны працэс: дзяржаўныя структуры і ўстановы ўсё больш адгароджваюцца ад грамадства, а грамадскія структуры і бізнес усё менш імкнуцца з імі ўзаемадзейнічаць. У полі незалежнай актыўнасці адбыліся істотныя зрухі ў фармаванні сімвалічнага адзінства, аднак рэальнае ўзаемадзеянне (напрыклад, АГС і медыя, бізнесу, «новых суполак») сёння моцна ўскладняецца як вонкавымі фактарамі (палітычнымі рэпрэсіямі), так і аслабленнем саміх

[32] Хаця некаторыя грамадскія арганізацыі працягваюць такое ўзаемадзеянне. У выняткових выпадках яно можа адбывацца нават з удзелам ці дапамогай заходніх урадаў. Напрыклад, нягледзячы на тое, што Інстытут Гётэ і нямецкая праграма акадэмічных абменаў (*DAAD*) былі закрыты, у Мінску працягвае функцыянаваць Мінскі міжнародны цэнтр імя Ё. Рау, які імплементуе чарговы этап (2019-2022 гг.) праграмы Федэральнага ўрада Германіі. Гэта этап прадугледжвае «садзейнічанне рэалізацыі Парадку дня-2030 у Беларусі праз умацаванне патэнцыялу і кампетэнцый арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС), а таксама праз узмацненне супрацы паміж органамі дзяржаўнага кіравання, бізнесам і грамадзянскай супольнасцю» (гл. падрабязней на http://ibb-d.by/programma-podderzhki-belarusi/).

гэтых суб’ектаў, вымушаных выдаткоўваць шмат высілкаў на выжыванне і адаптацыю да ўмоў, што пастаянна пагаршаюцца.

Дадатковая новая акалічнасць — гэта вымушаны ад’езд з краіны як людзей, так і цэлых структур (АГС, рэдакцый медыя, кампаній). З аднаго боку, гэта пашырае дыяспаральную актыўнасць, а з іншага, ставіць задачу супольнай арганізацыі дзейнасці ўнутры краіны і за яе межамі. У прыватнасці, перад арганізаванай грамадзянскай супольнасцю паўстаюць пытанні як самазахавання, так і наладжвання сваёй дзейнасці ў прынцыпова новых умовах (часта з-за мяжы).

На сённяшні дзень развіццё беларускай грамадзянскай супольнасці вызначаецца яе магчымасцю адказаць на тры выклікі, якія усведамляюцца ёй у рознай ступені.

Па-першае, гэта захаванне і ўзнаўленне наяўнага рэсурсу: чалавечага, кампетэнтнаснага, арганізацыйнага. Вырашэнне гэтай задачы вымагае як дзеянняў і мер забеспячэння бяспекі, узаемадапамогі, рэкрэацыі і псіхалагічнай дапамогі для захавання чалавечых рэсурсаў і магчымасцей, так і інстытуцыйнай падтрымкі і выпрацоўкі новых, больш гнуткіх і адаптыўных формаў арганізацыі дзейнасці, планавання, тэхнічнага і фінансавага забеспячэння арганізацый і ініцыятыў грамадзянскай супольнасці.

Па-другое, гэта выбудова ўстойлівых зносін паміж АГС, «новымі суполкамі», грамадзянскімі ініцыятывамі, якія з’явіліся ў 2020—2021 гадах і выконваюць сёння значныя арганізацыйныя і інфраструктурныя функцыі, незалежнымі медыя — усімі актарамі, якія сёння выступаюць праваднікамі палітычных і сацыяльных трансфармацый у Беларусі. Пераход ад сімвалічнага адзінства да фармавання разнастайных сеткавых узаемадзеянняў забяспечыць не толькі захаванне і ўзнаўленне наяўных рэсурсаў, але і лепшую падрыхтаванасць да новых выклікаў і магчымасцей.

Па-трэцяе, гэта актарызацыя грамадзянскай супольнасці, усведамленне сябе як дзейнага суб’екта ў грамадска-палітычнай сітуацыі, узгадненне ўяўленняў аб існай сітуацыі і накірункаў трансфармацыі, а таксама сваёй ролі ў гэтай сітуацыі.